

*Людміла Лазута*

# ІМГНЕННІ...

*Маім бацькам*
*прысвячаецца*
*гэтая кніга...*

**Людміла Лазута**

# ІМГНЕННІ...

**Проза**

Мінск
«Галіяфы»
2014

УДК [821.161.3+821.161.1(476)]-821
ББК 84(4 Беи)
Л17

Уступны артыкул В. Корбута.

**Лазута, Л. П.**
Л17 Імгненні... : проза / Людміла Лазута. – Мінск : Галіяфы, 2014. – 160 с.

ISBN 978-985-7021-49-9.

Першая кніга Людмілы Лазуты «Імгненні..» складаецца з шэрагу невялікіх апавяданняў, нізкі вершаў і некалькіх публіцыстычных артыкулаў на ўрачэбную тэматыку.

Як у літаратурных творах, так і ў публіцыстычных аўтар імкнецца да гуманістычных ідэалаў, традыцый нацыянальнага усведамлення існасці жыцця, яго хуткаплыннасці і глыбіні, дзе героі ў розных абставінах імкнуцца быць шчаслівымі і дараваць гэтае пачуццё сваім блізкім людзям.

У творах Л. Лазуты шмат сюжэтаў будуецца на вясковым побыце беларусаў, і героі маюць уласцівыя ім рысы дабрыні, працалюбства, шчырых адносінаў адзін да аднаго, а таксама падкавырыстага беларускага гумару.

**УДК [821.161.3+821.161.1(476)]-821**
**ББК 84(4 Беи)**

**ISBN 978-985-7021-49-9**

© Лазута Л.П., 2014
© Корбут В.Я., уступны артыкул, 2014
© Афармленне. ПВУП «Галіяфы», 2014

## Жыцёвыя імгненні на берегах памяці

У Вашых руках, шаноўны чытач, першая кніга Людмілы Лазуты «Імгенні...», кніга чалавека, улюбёнага ў літаратуру, лекара па прызванню, сапраўднага грамадзяніна сваёй зямлі па светаадчуванню. І гэтая кансістэнцыя характэрных дадзеных яе, як асобы, здолела нарадзіцца ў невялічкі, але досыць насычаны героямі і падзеямі зборнічак, у якім змешчаны і апавяданні, і нізка вершаў, і руплівы снапок публіцыстычных артыкулаў на медыка-псіхалагічную тэматыку. Такім чынам, аматары паэзіі, прозы ці даследчай літаратуры ў кнізе «Імгненні...» змогуць знайсці для сябе штосьці блізкае, дарагое і роднае, бо кніга пераважна напісана на роднай мове.

Сёння мы ўсё болей схіляемся да таго, што нацыянальная літатарура чароўная, перш за ўсё, роднай мовай, той магічнай сувяззю з дзесяткамі пакаленняў нашых выдатных продкаў, што змагаліся і ўсквечвалі наш родны кут сваёй працай, духоўнымі і ратнымі подзвігамі, прыгажосцю беларускай душы. Людміла Лазута, як чалавек удзячны і вельмі пачцівы да сваіх каранёў, кнігу прысвяціла сваім бацькам, клапатіва размясціўшы на старонках апавяданняў герояў, блізкіх да ўласна пражытых жыццёвых абставін. Многія аўтары і беларускай, і сусветнай літаратуры будавалі сваю творчую спадчыну на аўтабіяграфічных абставінах. Практычна ва ўсіх апавяданнях Людмілы Лазуты з кнігі «Імгненні...» – героі ў большасці рэальныя, так мовіць, з натуры спісаныя, не абдзеленыя гумарам і душэўнай чысцінёй. Амаль усе паздзеі аповедаў адбываюцца ў вясковым асяроддзі, сярод невялікіх беларускіх вёсачак, дзе жыццё мае сваё, у многім таемнае і дзіўнае, аблічча.

І вось на старонках кнігі чытач акунаецца ў вясковы вадазварот, дзе можна адчуць, як ладзіцца жыццё то адной, то другой сям'і, як нараджаюцца дзеці і праходзяць вакацыі студэнтаў і школьнікаў, як святкуюцца вяселлі і закручваюцца новыя любоўныя раманы і многае іншае.

Героі Людмілы Лазуты амаль усе – людзі пазітыўная, сярод іх амаль няма гультаёў, злыдняў, ліхвяроў. Добра гэта ці не, меркаваць не бяруся – гэта, відаць, своеасаблівая адметнасць кнігі, дзе аўтарка імкнецца паказаць свет больш светлым, пакінуць нам, сённяшнім жыхарам планеты, надзею на грамадства, якое павінна жыць без болю, жахаў, расчараванняў.

Ёсць у кнізе жывая, бадзёрая лексіка, роздумы на сур'ёзныя тэмы, спрэчкі паміж героямі, але гэта зроблена вельмі пекна, дасціпна, з павагай да ствараемых вобразаў. Людміла Лазута быццам смакуе тое мінулае, калі чалавек не жыў у такім складаным часе, як сёння, дзе кампутары не замянялі адносіны паміж людзьмі і машыны гэтак хутка не ездзілі. А па-праўднаму, гэтая кніга аб тым, як чалавек можа быць іншым, калі не цураецца сваіх каранёў, калі ён не губляе сувязь з родам, сваёй спадчынай, сваёй памяццю. І ў новай рэальнасці ён застаецца блізкім па духу да сваіх продкаў, застаецца характарам і паводзінамі годным іх памяці, а значыць, мае болей шанцаў шчасліва і цвёрда стаяць на нагах і існаваць на нашай зямлі.

*Вячаслаў Корбут,*
*паэт, празаік, журналіст.*

## Раздзел I

# *Вясковыя замалёўкі*

*Апавяданні*

## Дзень Перамогі і кабыла

Амаль па-летняму цёплая майская ноч павольна згасала, нібы раствaралася, губілася на ўсходнім краі неба, які паціху, але няспынна святлеў. Яго шэры колер паступова рабіўся ружова-чырванаватым, і, мянаючыся пахвілінна, шырокай хваляй расплываўся ўсё вышэй і вышэй над гарызонтам. А птушкі – стаіўшыся, нібыта гэтага моманту так і чакалі – за хвіліну ў ранішняй казачнай цішыні загучаў рознагалосы магутны хор, усе ўдзельнікі якога хацелі пераспяваць адзін аднаго. Нават салавейка не здолеў бы здырыжыраваць гэтулькі зычных спеваў.

«Як дзіўна, – падумала Марыля, выходзячы на ганак. – Колькі гадоў прыходзіць вясна, бясконцае мноства разоў узыходзіць сонца – а прызвычаіцца да хараства веснавога світанку, аздобленага незгуртаваным, і ад таго вельмі кранальным, птушыным хорам, немагчыма. Кожны раз нанова здзіўляешся і зусім па-новаму адчуваеш гэтае хараство. Слава Богу за ўсё. Вось і Рыгор сёння ўжо з бальніцы вернецца, святкаваць будзем разам». Ідучы да хлява, каб падаіць карову перад ранішнім выпасам, яна азірнула чысты двор, які ўчора дзеці аж да прыцемкаў старанна прыбіралі. Ад пабеленых садовай фарбай ствалоў яблынь і ігрушаў увесь надворак свяціўся святочным настроем. Гаспадарчыя справы пайшлі адна за адной, і Марыля не заўважыла, як пад'ехаў да прыпынку рэйсавы аўтобус і каля веснічкаў ужо стаяў яе Рыгор. Яна хуценька падбегла да мужа.

– А як гэта ты так рана прыехаў? Я думала, што толькі дзённым рэйсам з'явішся.

– Мне пашанцавала, сёння ноччу дзяжурыў мой доктар, ён агледзеў мяне раненька, усе паперкі падрыхтаваў, дазволіў свята страчаць дома – вось я і тут.

– Заходзь у хату, а я пайду снеданне гатаваць. Ты пабудзі дзетак, ім у школу ўжо час збірацца, вось жа радасна будзе ім сёння прачынацца.

Завіхаючыся каля печы, Марыля да аўтаматызму наладжанымі рухамі спрытна налівала на дзве патэльні ўжо гатовае цеста для блінцоў, па чарзе ставіла іх на краі чыгуноў, у якіх ужо варылася бульба для жывёлы. Пачакаўшы, пакуль прыпячэцца адзін бок блінца, яна ўзнімала патэльню, адным рухам пераварочвала яго і зноў адпраўляла на дапяканне па ранейшаму напрамку – у печ. Хутка зладзіўшы яечню, яна паклікала ўсю сям'ю снедаць. Абляпіўшы бацьку з усіх бакоў, дзеці з Рыгорам увайшлі ў кухню. Уладкоўваючыся за сталом, яны працягвалі дакладаць бацьку пра свае справы. Старэйшы сын удакладніў, што заўтра пасля ганаровага сходу ў школе для ветэранаў будзе наладжаны канцэрт, які падрыхтавалі вучні разам з настаўнікамі. «Так добра, тата, што ты падлячыўся і прыехаў акурат да свята,» – сказаў ён. Хутка ўсе трое, разабраўшы свае партфелі, задаволена падскокваючы, пабеглі са двара.

– Мо адпачнеш з дарогі? – запыталася ў мужа Марыля.

– Не, я ў бальніцы так «наадпачываўся». Пайду пагляджу, як мой матацыкл перазімаваў, з восені яго не заводзіў.

– Добра, а я пайду вокны ў пакоі памыю, учора дачушкі не паспелі: у двары прыбіраліся.

Да заўтрашняга дня – Дня Перамогі і да Вялікадня, які ўжо адбудзецца ў наступную нядзельку, рыхтаваліся ўсе. Каляды і Вялікдзень у гэтай вёсцы, як і Дзень Перамогі, таксама святкавалі ўсе. Ніякімі мерамі нельга было забараніць той узнёслы настрой, які апаноўваў людзьмі і выклікаў неабходнасць навесці паўсюдную чысціню, абнавіць вопратку святочнымі ўборамі, прыгатаваць смачную ежу, каб было чым пачаставаць і

родных, і суседзяў. Гэтыя акалічнасці асабліва радавалі дзяцей, бо для іх купляліся новыя сукенкі, штаны, зімовы абутак мяняўся на новыя туфлі ці сандалікі – дзеці ж за зіму падрасталі. Ды і смачныя пачастункі, якія іх чакалі ў кожнай хаце, былі вельмі да спадобы. Ад гэтых прыемных клопатаў нешта мянялася ў душы кожнага чалавека, хацелася думаць аб вечнай прыгажосці жыцця, штосьці рабіць незвычайнае дзеля шчасця свайго і тых, аб кім ты клапоцішся. Перад усім здавалася, што наступае час аднаўлення ў прыродзе і ў сэрцах людзей, і так на пэўны час сярод іх пачынала панаваць усеагульнае замілаванне. Гэтыя святы былі асаблівымі і самымі галоўнымі ў календары вяскоўцаў, ды і цяпер гэтае ўсведамленне таемнаці светлага ў душы нікуды не падзелася.

Марыля, як і яе суседкі, актыўна рыхтавалася да святаў. Ёй падабалася займацца святочнымі ўбраннямі ў хаце. Нанова бяліліся сцены, засцілаліся рознакаляровыя вясёлкавыя дываны на ложках, клаўся вышыты абрус на стале. Асабліва гаспадыні падабалася мыць вокны. Змыць шыбіны вадой, потым выцерці насуха кавалкам размытага да мяккаты старога рушніка, а напрыканцы пацерці старой газетай. А вынік выдатны: здавалася, што шыбіна дзесьці знікла, нішто больш не перашкаджае назіраць жыццё за акном.

Сёння Марылі было радасна, найбольш ад таго, што Рыгор паправіўся, заўтра разам з усімі можна будзе пайсці на школьны канцэрт. Апошнім часам хваляванняў у яе хапала. Рыгор часта хварэў, трапляў у бальніцу. Ён з дзяцінства меў слабое сэрца пасля рэўматызму, па ўзросту быў прызваны ў войска толькі ў апошні год вайны. Ваяваць яму не давялося: разам з другімі маладымі хлопцамі, якія таксама мелі адхіленні па стану здароўя, працавалі на вайсковую гаспадарку. Яны займаліся нарыхтоўкай харчавання для вай-



скоўцаў: квасілі капусту, сушылі яблыкі, дапамагалі на млыне. Іншым часам іх адвозілі бліжэй да фронту капаць акопы, і там яны працавалі многа і цяжка, а спалі і елі мала. Усе гэтыя клопаты здароўя хвораму сэрцу не дадавалі. Вось і зараз яму часам бывае дрэнна, цяжка дыхаць пры хадзьбе, а ногі робяцца набрынялымі. Рыгор тады адразу едзе ў раённую бальніцу, там яго падлечваюць. Ад хваробы ён у паніку не кідаецца, а вяртаецца дамоў вясёлы і бадзёры.

Марыля мужа шанавала, імкнулася амаль усю гаспадарку весці сама. Здаецца, што не было справы, якую яна не ўмела рабіць: шыла сукенкі, кашулі, касіла траву, спрытна запрагала каня, гатавала на святы вельмі смачны квас і нават магла чытаць, пісаць і бегла размаўляць па-польску (скончыла чатыры класы польскай школы). Калі-нікалі прыязджаў з суседняй вёскі на падмогу ў гаспадарчых справах яе брат, а цяпер ужо і сын падрос – ладны такі хлопец – паспяваў ва ўсім і ў школе, і ў полі. Дачушкі таксама не адставалі: абедзьве дзялілі з мамай хатнія клопаты. У сям'і панавалі павага і любоў паміж бацькамі і дзецьмі.

Марыля, хоць і была родам з суседняй вёскі, але на новым месцы хутка прыжылася, ды сваім і чужым прыйшлася даспадобы, бо характар мела памяркоўны. А якой прыгожай парай Марыля з Рыгорам у маладосці былі! Яна – танклявая, чарнявая, з доўгай тоўстай касой, цёмнымі вачыма, а бровы ажно дугой на высокім ілбе. Пасля вайны працавала справаводам у сельсавеце, дапамагала старшыні, вельмі сталаму і хвораму чалавеку. Там яе Рыгор і ўбачыў упершыню, калі на вайсковы ўлік станавіўся, адразу закахаўся. Ды і сам ён быў варты такой дзяўчыны: высокі, на цэлую галаву вышэйшы за Марылю, меў русыя валасы, блакітныя вочы. Уражвалі яго рукі з вузкімі далонямі і доўгімі тонкімі пальцамі, якімі ён вельмі здатна плёў вялікія і

маленькія прыгожыя кошыкі з лазы. Рыгор так хораша і задушэўна спяваў, што ў асяродку яго людзі «салаўём» клікалі. Марыля ўсім казала, што і пакахала Рыгора за гэтыя яго песні, замуж за яго пайшла, адмовіўшы суседу, хоць той і марыў аб ёй ужо некалькі гадоў – усе пра тое ведалі. Сямейнае жыццё складвалася добра, трое дзетак раслі разумнымі і паслухмянымі.

«Можа, у Мінск пасля святаў з Рыгорам з'ездзіць, трэба будзе ў цёткі Алены адрас яе пляменніка запытацца, ён жа, яна казала, у ваенным шпіталі працуе, можа там больш магчымасцей, каб дапамагчы адолець застарэлую хваробу Рыгора,» – за гэтымі думкамі Марыля не пачула, як рыпнулі дзверы.

– Хто ёсць у хаце? Гаспадынька, ты дзе? – суседка Вера, як заўсёды, гучна і бадзёра адчыніла дзверы.

«Трэба страчаць. Пайду даведаюся, што Веры патрэбна, а потым гэтую шыбіну хуценька дамыю. Паспяшаюся, святы ўжо ля парога,» – падумала гаспадыня.

– Ну, што ты тут робіш? – не чакаючы запрашэння, Вера ўжо заходзіла ў пакой. – Ей-ей, якія ж вы з дачкамі працавітыя: у двары прыбралі, у кухні ўсё зіхаціць, што, апошні пакой зваёўваеш? – як з кулямёта, страчыла яна словамі, паспеўшы ўмомант усе парадкі заўважыць.

Невысокая, але вельмі зграбная, як заўсёды акуратна апранутая (як быццам, і ў хлеў не ходзіць, і ў агародзе не працуе), Вера стаяла ў дзвярах, і нельга было не заглядзецца на яе – так хораша яна выглядала ў завязанай пад туга закручанай на патыліцы касой, блакітнай хусцінцы. Бліскучыя цёмныя валасы, гладка прычэсаныя над ілбом, вельмі дбайна адцянялі глыбокую сіняву яе яшчэ маладых вачэй, хоць было ёй ужо амаль што пяцьдзесят гадоў і жыццё яна мела цяжкае, не пазайздросціш. Яе муж, Мікалай, пасля вайны вярнуўся з адной нагой, і таму хадзіць яму было склада-

на, хоць і на кастылях. Потым яму пратэз прыладзілі, канешне, ён не быў такім тэхнічна прыстасаваным, каб лёгка хадзіць, але ўсё ж – не кастыль. Каб не быць без справы, Мікалай вывучыўся на майстра па рамонту абутку, працы хапала, бо быў ён адзіны майстар у наваколлі. Вера яго ведала з дзяцінства, ён да бабулі, іхняй суседкі, прыязджаў. Калі пасля вайны паклікаў замуж – згадзілася, не спалохалася, што інвалід. Жылі дружна, хоць часамі было вельмі не проста. Чацвёра дзяцей нарадзілі. Радні ў іх на той час ужо аніякай не было – усіх вайна пабрала. Дык жа з суседзямі пашчасціла, вельмі добрыя былі адносіны з Рыгорам і Марыляй, дапамагалі адныя адным. Рыгор для ўсіх суседскіх дзяцей быў хросным бацькам. Як і ў бацькоў, між дзяцей панавала сяброўства. Хаты стаялі побач, жыццё гэтых сямей праходзіла пад няспынным суседскім наглядам, так павялося на сяле. Вось і сёння раніцай хатнія справы не пашкодзілі Веры заўважыць прыезд Рыгора, і яна завітала да сваіх суседзяў.

– А гаспадар дзе? – пакруціўшы па баках галавою, запыталася яна. – Няўжо сышоў кудысьці, што я не заўважыла?

– Не, куды там, ён на двары матацыклам займаецца – ну, і як жа гэтага ты не прыкмеціла? А што ты хацела, што-небудзь трэба дапамагчы?

Вера крыху задумалася і прамовіла:

– Пакуль што не, я на ўсялякі выпадак пытаюся. Мой жа герой у лазню да Васіля падаўся.

Пачуўшы пра лазню, Марыля сур'ёзна, з трывогай у вачах глянула на Веру і хутка пайшла з хаты, тая за ёй хвастом. Праз некаторы час яны зноў ужо адчынялі дзверы ў кухню і ўзбуджана размаўлялі, маўляў, дзе ён мог падзецца? Глянуўшы адна на адну, зразумелі, што думаюць пра сітуацыю аднолькава: Рыгор, відаць, таксама з сябрамі знаходзіўся ў лазні.

– Ну, чаму ж ён так робіць? – расхвалявана мовіла Марыля, – я ж не зламысна яго ў тую лазню не пускаю, яму ж нельга ў парыльні доўга знаходзіцца, сэрца ж хворае.

– Ды супакойся ты і паглядзі лепш, ці рушнік і споднявае забраў.

– І то праўда, – Марыля ўмомант глянула ў шафу, якая знаходзілася за дашчатай сцяной, і хутка вярнулася.

– Дзякуй, Божа, ад сэрца адлягло, нічога не браў, мо і не ў лазні ён зусім, а я ўжо расхвалявалася.

– Ну, вось і добра, пайду пакуль што дамоў, – сказала Вера і накіравалася да дзвярэй.

Па дарозе глянула на чыста памытае шкло ў шыбе акенца, праз якое, быццам на далоні, была відна амаль што ўся галоўная вуліца вёскі.

– Ідзі, падзівіся, ды страчаць рыхтуйся – твой Рыгорка ўжо мост мінае, – сказала яна Марылі.

Падышоўшы бліжэй да акна, Марыля з паўхвіліны ўглядвалася ў постаць мужа, а потым упэўнена так сказала:

– Не, у лазні ён не быў, а медавухай-та паласаваўся.

– І як жа ты аб гэтым даведалася? – з усмешкай і недаверам запытала Вера. – Ідзе шпарка, роўна, не віхляецца, а каб па паху пачуць, дык таго... ён яшчэ далёка (да мосту было метраў трыста).

– Навошта мне той пах? Ты ж зірні на яго рукі – размахвае імі шпарка і ўпэўнена, але мезенцы на абедзвюх – адтапырыліся, і гэта – самая першая прыкмета, што дзве чарачкі медавухі ўжо пасмакаваў, калі не тры.

– Не дзіві ты мяне цудамі – яна мезенцы адгэтуль бачыць, ды яшчэ й адтапыраныя. А калі і так, то якая тут сувязь з медавухай?

– А вось гэтага я і не ведаю, якая. Але яна ёсць, і ўсё тут! – з усмешкай прамовіла Марыля.

Пасля гэтай размовы абедзве накіраваліся да дзвярэй. Вышаўшы з хаты, паважна прыселі на лаўку ля ганку, чакалі. Неўзабаве і Рыгор падышоў. На такую «ганаровую» сустрэчу ён, канешне, не разлічваў. Убачыўшы абедзвюх кабет, асабліва ўзважыўшы рашучы, многаабяцальны погляд жонкі, прыпыніўся, патаптаўся трошкі каля веснічкаў, нібы ў роздуме, ці варта заходзіць, а потым рашуча накіраваўся да іх – напярэдадні Дня Перамогі ён палохацца наступстваў не стаў і адступаць не збіраўся.

– Здаровы былі, сяброўкі! – весела павітаўся ён з жанчынамі.

– І табе здароўя! – у тон яму адказала Вера, уважліва прыглядаючыся да твару Рыгора, каб убачыць хоць які-небудзь след чарачак, пра якія казала яго жонка, але, акрамя хітрых іскрынак у вачах, так нічога і не заўважыла. А вось мезенцы – дык тыя сапраўды якімсьці зусім незвычайным чынам узвышаліся над астатнімі пальцамі рук і з гэтай нагоды, відаць, вельмі ганарыліся, бо надта важна, паўкругам адтапырыліся.

Глянуўшы адна на адну, жанчыны гучна засмяяліся. Гэты вясёлы момант і наступаючае пацяпленне становішча тут жа скарыстаў Рыгор, падсеў на лаўку да жонкі і сказаў:

– Ну, не сярдуй, прабач, я ж толькі да дзядзькі Васіля па ключ да матацыкла хуценька збегаць задумаў, але трошкі затрымаўся – заўтра ж Дзень Перамогі. Ты ж і сама дзядзьку добра ведаеш і паважаеш.

І сапраўды, Васіля ў вёсцы ведалі і любілі ўсе: старыя, малыя, моладзь. Ён быў сярэдняга росту, каржакаваты, хадзіў мякка, ніколі не спяшаўся. Ад іншых мужчынаў у вёсцы ён адрозніваўся тым, што меў прыгожыя, з закручанымі канцамі вусы і быў добрым і вясёлым штукаром, мастаком распавядаць пра розныя

незвычайныя здарэнні. Рабіў гэта з ахвотай пры любых адпаведных абставінах. Пры гэтым у яго невялікіх, але глыбока пасаджаных вачах часта мільгалі агеньчыкі з хітрынкаю. Вось тады і здавалася, што ўсё самае цікавае ў аповедзе яшчэ наперадзе, чакайце.

Жылі яны ўдваіх з жонкай, Бог дзетак не даў. На лёс не скардзіліся, паважалі адзін аднаго, а гаспадарку мелі добрую, ды і пчаліная пасека ў вёсцы толькі ў іх і была. А медавуха! Ды гэта рэч спраўная, вясёлая, якую таксама толькі яны варылі. У справе прыгатавання медавухі, квасу і іншых напояў з мёду роўных цётцы Насці, яго жонцы, на вёсцы не было. Рэцэптуры прыгатавання пітва яна не хавала, з задавальненнем дзялілася ўсімі тонкасцямі працэсу з  жанчынамі, але ў гэтым майстэрстве пераўзысці яе нікому не давялося – вышэйшы пілатаж, і ўсё тут сказана. Рыгор сцвярджаў, што гэта залежыць ад характару гаспадыні.

Калісьці пасека належала бацьку Васіля, а квас і медавуху гатавала яго маці. І хоць у яе былі тры нявесткі,  здатнай да гэтай справы змагла стаць толькі самая малодшая з іх – Насця. Яна была невялікага росту, нават у сталым узросце выглядала, як падлетак, але характар мела залаты. Здавалася, што яна не ведала, як казаць «не». Ці што пазычыць, ці ў якой справе дапамагчы – найперш звярталіся да яе. І ўсюды яна паспявала, і любая работа ў яе атрымлівалася. Нават іхнія куры несліся самымі вялікімі яйкамі, якіх яна заўжды шмат фарбавала на Вялікдзень і частавала імі ўсіх дзяцей.

Калі-нікалі дзяцька Васіль запрашаў сваіх сяброў у лазню, каб добра пагрэцца, паганяць венікам хваробы і потым за чарачкай медавухі прагутарыць некалькі гадзін, абмеркаваць грамадскія тэмы, новыя гісторыі-прыгоды паслухаць. Але ж сёння гэтае паседжанне распачалося нейк зарана.

Мікалай, муж Веры, першы сябра Васіля (на адным фронце ваявалі), нават і папалуднаваць як трэба не паспеў, так спяшаўся ў лазню. Дамоў, відаць па ўсім, не рупіўся. Веру, канешне, гэтая акалічнасць пачынала хваляваць.

– Але што я вам мушу сказаць, мае вы сакатушкі, – гарэзліва паглядаючы на жанчын, працягваў размову Рыгор. – Трэба нам з вамі важнае заданне выканаць: Мікалаю дапамагчы. – Ды не хвалюйся ты гэдак, Вера, – супакоіў ён суседку, бо тая пасля яго слоў ужо прыўзнялася з лаўкі. – Усё добра, проста сёння лазня занадта нагрэлася. Мабыць, пазней трэба было дзядзьку Васілю завіхацца, але што ўжо зробіш, калі так атрымалася, – стараючыся размаўляць упэўнена, працягваў Рыгор. – Вось як я за ключом зайшоў, то яны ўжо і папарыліся, і венікамі намахаліся, якраз адпачывалі. Але ж як цяпер Мікалаю з яго драўлянай нагой такому распаранаму дамоў ісці? Я і кажу – давайце зараз возьмем калясы і паедзем дапамагаць Мікалаю дамоў прычаліць.

У Веры ад гэтых слоў вочы спачатку акругліліся, а дакладней кажучы, вылупіліся, потым паціху звузіліся і зноў сталі на месца.

– Дык што ж гэта вы там надумалі – парыцца зранку. Ужо ж не маладыя дзівакі, а паджылыя мужыкі, а розуму няма шака. Я вось зараз усё хутка высветлю, што там – пар ці медавуха чалавеку ісці дамоў не дазваляе.

Выказаўшы ўсё, што мела на сэрцы, Вера супакоілася і, як ні ў чым не бывала, дадала:

– Ну, дзе там твае калясы, вязі. Марыля, пайшлі з табой, бо з гэтага твайго ваякі дапаможца таксама слабы.

Калі яны з'явіліся ў двары Васіля, «адпачынак» яшчэ працягвагваўся. Мікалай з Васілём былі ўжо «шумныя», іх галасы чуліся ад мосту. Яны паважна сядзелі пад навесам ля лазні ў чыстых белых кашулях з чырвонымі ад

пару і медавухі тварамі. Каля стала завіхалася Насця, якраз падносіла ім пульхныя, толькі што з печы, румяныя пышкі. Пачаставаліся ўсе.

З тым, што дамоў трэба ехаць, а не ісці, Мікалай згадзіўся, хоць і не адразу. Уладкаваўшыся з дапамогай Васіля ў калясы, ён нават прысмірнеў. Стаў цішэй размаўляць, потым трошачкі прыдрамаў. Пры з'ездзе з мосту кола калясаў наехала на камень. Страсянуўшыся, Мікалай прачнуўся, убачыўшы, што Рыгор ідзе побач, ён занепакоіўся за сябрука:

– Слухай, Рыгор, а чаму ты пешу ідзеш? Сядай да мяне, я пацяснюся, мая кабыла дамоў заўжды трапіць.

Ад гэтых словаў Рыгор ажно спыніўся, а Вера з Марыляй адачасова кінулі ручку калясаў.

– Якая такая кабыла? – глуха, але надта цвёрда, павярнуўшыся да мужа, вымавіла Вера. – Я зараз жа табе...

Дагаварыць ёй Мікалай не даў:

– Ціха, ціха, супакойся, гаспадынька ты мая. І чаго ж ты абразілася? Хіба ж «кабыла» – гэта дрэннае слова? Сама раскінь аглоблі ў сваёй бабскай галаве – ад кабыл толькі адна карысць – і ў полі, і ў брычцы, і ў возе. Каб не яна, на фронце загінуў бы, ты ж ведаеш. Я ж табе распавядаў, як параненага, беспрытомнага мяне кабыла да людзей давезла. А не было б мяне – хто б табе мужам быў? Даруй мне, давай падзякуем Богу, што ён некалі стварыў гэтую жывёліну, каб яна ў патрэбны час ратавала такіх, як я, дапамагала набліжаць Перамогу. Супакойся, мая каханая жоначка, дай мне сваю працавітую ручку. Я ўжо адпачыў і сам дамоў дайду. Трэба дайсці, заўтра ж Вялікае Свята, з дзеткамі ў школу на «Урок мужнасці» пойдзем, усе разам радавацца будзем.

Не думаючы доўга, Вера прысела на здаровае калена Мікалая, абняла яго і пацалавала ў гарачую (ад пару ці медавухі?) чырвоную лысіну.

## Дочкі-матулі

*Не бойся нарадзіць дзяцей –*
*Любімых, родных і жаданых.*
*У мностве слоў сярод людзей*
*Ратуюць два: Любоў ды Мама.*

Стрэлка гадзінніку няспынна набліжалася да лічбы «8». Мы размаўлялі ўжо з паўгадзіны, а яна ўсё гаварыла і гаварыла. Я вельмі ўважліва слухала, старалася яе зразумець, каб знайсці словы, якія дапамаглі б прыйсці да правільнага рашэння.

Ужо з першых хвілін было зразумела, што перада мною дзяўчынка з параненай душой. У яе поглядзе – трывожным і хуткім, у напружанай постаці, з якой яна сядзела на акрайку крэсла, адчуваўся недавер і страх чарговага расчаравання. Без доўгіх роздумаў было відаць, якой цяжкай была для яе гэтая размова: бледны твар, патухшыя вочы, нярвовае перакладванне пальцаў рук гаварылі аб зусім не дзіцячых унутраных пакутах.

Ад болю сціскалася сэрца, я ледзьве стрымлівалася, каб не выказаць свае пачуцці – гэта ўжо было б зусім не прафесійна. А падумаць было над чым: дзяўчына прыйшла даведацца, дзе і калі можна ёй, 16-ці гадовай, пазбавіцца ад цяжарнасці.

Не чакаючы маіх пытанняў, яна адразу ж аб'явіла аб надзеі на тое, што размова застанецца паміж намі, бо маме зусім нічога сказаць нельга. На маё пытанне: «А бацьку?» – яна ўзбуджана загаварыла: «Не, не, не, ні ў якім разе – ён наогул з намі не жыве». Пры гэтым яе вялікія прыгожыя сінія вочы сталі зусім сумнымі і вільготнымі ад наплываючых слёз. Не ведаю, чаму раптам захацелася расказаць гэтай дзяўчынцы кароткую

гісторыю, якую мне, ужо дарослай дзяўчыне, калісьці расказала мая мама:

«Мы жылі ў невялічкай вёсачцы – усяго 60 хатаў. Навокал лес, вялікі і прыгожаы настолькі, что часам, набраўшы поўныя вёдры чарніцаў, мы, маладыя дзяўчаткі ўладкоўваліся на адпачынак на якой-небудзь палянцы і пачыналі, нібы тыя нябесныя птушкі, спяваць ад паўнаты захаплення наваколлем і радасцю жыцця.

А калі адысці ад вёскі кіламетра на паўтара, то якраз апынішся каля ракі. І ніякія марскія купанні не могуць прынесці такой асалоды, якую мы атрымлівалі, бухаючыся летняй спёкай у павольныя сіне-зялёныя хвалі нашай лясной прыгажуні. Зімой гэтае прыроднае хараство было таксама не менш уражлівым. Можа, таму і дзяўчаты ў нашай вёсцы раслі, гледзячы на наваколле, – усе, як на падбор, прыгажуні. Так што вяселлі ў нас былі з'явай частай. Жаніхі з'язджаліся з усёй акругі.

На адным такім вяселлі спадабалася Ліда, сяброўка нявесты, прыезджаму хлопцу – Мікалаю, шаферу жаніха. Вось і стаў ездзіць ён пасля вяселля да нас у вёску, кожную субботу чуўся лопат яго матацыкла. Усе ведалі: да Ліды прыязджае, разам ходзяць і ў кіно, і на танцы. А ўжо-ж і ладненькай красуняй яна была! Працавала ў нашай вясковай бібліятэцы. Заўсёды з дабрынёй кожнага чалавека сустракала, хто да яе звяртаўся. Параду магла даць і школьніку, і дарасламу, хоць і сама была зусім маладая. А бабулі, іхняй суседцы, усю работу зробіць дапаможа: падлогу памые, двор падмяце, у магазіне што трэба купіць. Адным словам, было тут, у каго закахацца...

Перад восенню моладзі стала менш – хто на работу, хто на вучобу, а Мікалай і зусім перастаў з'яўляцца. Ліда сумавала, гэта было відаць па ўсім: кудысьці падзеліся

смяшынкі з яе прыгожых зеленаватых вачэй, на шчочках больш ужо не з'яўяліся ямачкі, і ўся яе постаць стала, як быццам, трохі ніжэйшай. Акрамя бібліятэкі, Ліду нідзе больш не было бачна. І чамусьці пераглядваліся жанчыны, убачыўшы Ліду на вуліцы, а потым паціху шапталіся. Пазней ужо ва ўсіх на вуснах была навіна: Ліда цяжарная. Сяброўка яе, мабыць, камусьці сказала – у вёсцы ж нічога не схаваеш. А самых няўрымслівых вельмі хвалявала пытанне: «Што ж гэта Антаніна, маці Ліды, маўклівая і спакойная, як заўсёды, хіба ёй не сорамна?»

І вось аднойчы, у нядзельку, стоячы каля калодзежа, адна з суседак не ўтрымалася і запыталася ў падышоўшай з вядром Антаніны: «Суседка, чаго маўчыш, няўжо не бачыш, што з дачкой робіцца? Жывот жа расце, захварэла, ці што?» І… засмяялася. Антаніна, высокая і статная, калісьці першая прыгажуня ў наваколлі, паставіла вядро, выпрасталася, як быццам хацела стаць яшчэ вышэйшай, і ціха, але цвёрда адказала: «Можна сказаць і так: захварэла. Толькі хвароба гэта ні з лесу ўзялася, яна сярод людзей ходзіць. Ачуняе і мая дачушка, я ж каля яе буду. А куранятак, суседачка, восенню лічаць». Узяла вядро і пайшла ўпэўненай паходкай. І неяк адразу ва ўсіх жанчын вёскі знікла жаданне да шэптаў – наадварот, пры сустрэчы з Лідай кожная хацела прыветна ўсміхнуцца.

Вось так і з'явіўся вясной у нашай вёсцы Вася-Васілёк з сінімі вачыма і ямачкамі на шчочках, добры і разумны хлопчык. Цяпер у горадзе працуе, маме і бабулі апора – яны на яго нарадвацца не могуць. А Ліда пазней замуж выйшла, дачушку яшчэ нарадзіла – шчаслівая і па-ранейшаму прыгожая.

І гэта ўсё, што я табе хацела пераказаць».

У пакоі было ціха. Мы глядзелі ў вочы адна адной: дзяўчынка-жанчына і доктар-жанчына і мама, і абе-



дзве, чамусьці, ужо не сароміліся слёз. Здавалася, што цішыню парушаюць толькі гукі нашых сэрцаў.

«Я пайду дамоў,» – сказала яна і ціха пайшла, не развітаўшыся. Потым вярнулася ад дзвярэй і паклала на стол картку з нумарам тэлефона: «Патэлефануйце маёй маме, калі ласка, ёй вельмі падабаюцца вясковыя гісторыі, але няхай гэта будзе заўтра. А сёння я пайду сустрэну яе на прыпынку, з другой змены яна вяртаецца позна. Да пабачэння».

Зімой у нашай дзіцячай паліклініцы з'явілася яшчэ адна дзяўчынка – усмешлівая і трошкі кучаравая – прыгожая, як яе мама.

Не так даўно я іх сустрэла ўдзвюх – прагульваліся ў скверы. Вельмі радасна і з даверам маладая мама сказала, што ў яе дачушкі з'явіўся дзядуля: тата прыехаў на свята, пабачыў унучку і застаўся, з мамай памірыліся.

Калі мне ўспамінаецца гэты выпадак, то часам здаецца, што абставінаў для гонару за гераінь гэтай гісторыі не надта многа, тым больш, што іх лёсам не пазайздросціш. Але ж так ужо ў жыцці здараецца, што памыліцца можа кожны. І таксама ў кожнага здараецца магчымасць дапамагчы, толькі яе пазнаць трэба. А што кожнае дзіцятка мае права на жыццё, яно – як падарунак Бога для тых, хто ўмее быць за ўсё ўдзячным – аб гэтым і так людзям даўно вядома.

## Імгненне

Будзільнік, душ, кава, метро, работа. Усё паспець, усё сказаць, не спазніцца, не запамятаваць, не спыніцца, не адстаць... Чаму, дзеля чаго, навошта?

А вакол усё той жа вечны, адзіны і непаўторны свет, тыя ж зоркі і нябёсы, тыя ж ціхія світанні, і гучныя навальніцы, і сонца – ласкавае і аднолькавае для ўсіх. Кожнае імгненне гэты свет дасылае нам свае пасланні, а наша трапяткая і неспакойная душа хоча і патрабуе іх абавязкова пазнаваць, каб не развучыцца: слухаючы, – чуць; углядваючыся, – бачыць так, як калісьці гэта было ў той адзінай для ўсіх краіне з прыгожай назвай «Дзяцінства»...

Вось мы, пятнаццацігадовыя дзяўчынкі-падлеткі басанож, з рогатам падштурхоўваючы і абмінаючы адна адну, імчымся па вузкай сцяжынцы да ракі. Нам нават і не да галавы, каб бегчы па вясковай вуліцы (было б карацей), нас вабіць зусім іншая сцежка – бяжым па прымятай траве, з асалодай наступаючы на яе босымі пяткамі. Ад радасці і прадчування шчасця хтосьці дэкламуе радкі любімых вершаў, хтосьці спрабуе напяваць. Хораша!

Абмінуўшы, нарэшце, апошнюю вясковую агароджу, раптам спыняемся, ураджаныя з'явіўшайся перад вачыма прыгажосцю летняга луга. Змаўкаем і, як па камандзе, дружна прысядаем на вабны, да галавакружэння духмяны, мяккі лугавы дыван. Ён так ладна ўпрыгожаны роспісам растучых на ім кветак, што пачынаеш на імгненне страчваць адчуванне рэальнасці. Здаецца, што сам Бог з нябёсаў, пасля размалёўвання сусвету, строс каплі фарбаў са свайго пэндзля на гэтае месца, і яны расквецілі траву непаўторным прыродным роспісам.

Як зачараваныя, мы трапляем цяпер у свой хвалюючы і цудоўны свет мар і надзей, казачны і адначасова рэальны, сапраўдны, адчуваемы...

Божая кароўка павольна рухаецца па травінцы, спыніцца, паслухае і паўзе далей. Ціха, яе нельга спалохаць, у яе «на небе дзеткі». Заплюшчваю вочы, баюся глядзець на жоўтыя кветкі – кажуць, што яны забіраюць зрок. Поглядам шукаю над імі рамонак, каб паспытаць шчасця, паўтараючы «любіць – не любіць», з уздыхамі адрываючы пялёсткі. Мабыць, тады мы і не зусім разумелі, хто гэты «любіць – не любіць», але, гледзячы адна на адну, думалі, што ў кожнай з нас ёсць свая маленькая таямніца...

Пакрысе рухаючыся на каленках, набліжаюся да маёй любімай кветкі. «Якая ж яна шчаслівая, так незвычайна гучыць яе імя «Не-за-буд-ка»,» – думаю я, кранаючы маленькія блакітныя пялёсткі, і чую чароўную мелодыю, падобную на павольны вальс, так выразна, што нават пачынаю ў рытм паводзіць плячыма. Ціха і асцярожна ў гэты момант прыходзіць адчуванне ўнутранай радасці ад магчымасці ўсё гэта бачыць, пазнаваць і адначасова нараджаючагася незнаёмага і хвалюючага суму ад усведамлення жадання падзяліць гэтую радасць з кімсьці, яшчэ далёкім і незнаёмым, але адзіным у свеце, абавязкова неабходным у жыцці. Хто ён, які, ці ёсць ён наогул?..

А сонейка, усміхаючыся, прыпякае. Горача! Ускокваем і подбегам імчымся далей. Хутка дабягаем да велізарных хвояў на беразе нашай прыгажуні-рэчкі. Яны ўвесь час любуюцца сваім адлюстраваннем у павольных водах ракі і здаюцца нам вельмі мудрымі і важнымі, зусім не такімі, як простыя хвоі ў лесе.

Пакідаўшы на хаду сукенкі, бухаемся ў абдымкі асвяжальнай вады. Плаваем, любуючыся пераветамі капель на нашых тварах і валасах. Здаецца,



што нават сонейка весела ўсміхаецца і ярчэй свеціць, любуючыся намі і прыгажосцю ракі.

Потым сядзім моўчкі на беразе, адпачываем. І чамусьці ў сэрца прыходзіць упэўненасць, што ўсё ў нашым жыцці атрымаецца, бо вось яно, шчасце, – побач, яно ж ва ўсім: у лузе з незабудкамі, у мудрых соснах, у ласкавай рэчцы, у клапатлівай божай кароўцы. Шчасце ва ўсіх нас, і ў кожнай асобна, у нашых бацьках і ў тых, аб кім мы марым і з кім абавязкова сустрэнемся. Ад гэтага ўсведамлення ўзнікае чароўнае адчуванне свабоды, радасці і жадання пранесці іх праз усё жыццё, дзелячыся з тымі, каго ведаем і аб кім марым. І так хочацца надаўжэй заставацца ў гэтай еднасці душы з прыгажосцю наваколля, слухаць і нічым не парушаць гармонію вялікага, мудрага і спагаднага сусвету…

Спыніся, калі ласка, хоць на хвіліну супакойся і прыслухайся. Чуеш?..

## Мужчынская салідарнасць

Большасць людзей лічыць, што ўсе дзеці нараджаюцца аднолькава, таму што ў рэшце рэшт створаная тысячагоддзі таму назад сістэма ўсё яшчэ дзейнічае. І маюць рацыю, як, дарэчы, і тыя, хто лічыць, што ў кожнага немаўляткі свой шлях і свае вароты для ўваходу ў наш цудоўны свет. Але, мабыць, прыхільнікаў абодвух поглядаў аб'ядноўвае тое ўразуменне, што гэтая з'ява дагэтуль застаецца самым хвалюючым момантам – выпрабаваннем для жанчыны, часам славы і сапраўднай мужнасці для мужчыны і, наогул, самай важнай справай у чалавечым жыцці. Можа, гэта таму, што нараджаюцца адразу двое – Дзіця і Маці. Вялікая з'ява сусвету, а ад вялікага да смешнага, як вядома, адзін крок, не я гэта прыдумала...

У перадродавай палаце радзільнага аддзялення невялікага райцэнтра знаходзіліся чатыры жанчыны-парадзіхі. Яны былі рознага ўзросту, з розным сямейным стажам, мелі розныя характары, але па нейкаму, нікому не вядомаму, загаду лёсу апынуліся суседкамі па палаце, дзе «бавілі» свой час перад тым, як настане доўгачаканы момант – перавод у радзільную залу, дзе з'явіцца на свет новы чалавек. Звычайна, у стане пачатага працэсу родаў адразу чатыры жанчыны не паступалі, а тут – як з «рога ўсяго многа», адна за адной на працягу дзвюх гадзін – толькі паспявай паперы афармляць. Як быццам, чакалі ўсе панядзелка, каб у выхадныя дні не ствараць лішніх клопатаў медыкам. А можа, дзень быў такі спрыяльны – цёплы, без ветру, пачатак наступіўшай восені.

Самай першай, зранку, а дзявятай гадзіне ў палату засялілася Гэля. Напалову літоўка, яна мела спакойны і разважлівы характар. Агледзелася, выбрала ло-

жак ля акна, перад гэтым паспытаўшы ўсе астатнія на трываласць матрацаў, нібыта думала тут заставацца надоўга. Хударлявая з твару, высокая, з гладка прычэсанымі валасамі, яна выглядала прыгожа, нават бальнічны халат ёй не шкодзіў. Дома засталіся два сыны, а яна спадзявалася, што трэцяй будзе дачка. Лежачы на ложку, чытала апавяданні Буніна, калі наступаў боль – спачатку садзілася, потым уставала, бралася рукамі за спінку ложка і стагнала, прыгаворваючы з прыдыхам: «Гху, гху, гху,» – нібы той глухір на таку. Калі ў палату заходзіла акушэрка, Гэля махала рукамі, паказваючы гэтым, маўляў, што ўсё добра, можаце ісці, грамадзяначка, не перашкаджайце.

Потым, прыкладна праз гадзіну, амаль адначасова «Хуткая дапамога» прывезла Іру і Наталлю. Іра працавала ў магазіне, была з усімі знаёмай. Вельмі хвалявалася, бо дома засталася пяцігадовая дачка, у якой якраз сёння разбалелася вушка. З гэтай нагоды ёй дазвалялі карыстацца службовым тэлефонам аддзялення, і ў час кароценькіх перадыхаў, калі боль адступаў, яна размаўляла са сваёй дачушкай. Здавалася, Іру зусім не хвалюе момант родаў, яна акуратна перасцілала ложак пасля чарговых схватак, у час якіх лажылася на правы бок і пачынала глыбока дыхаць, сапці, як быццам цягнула воз. Часам яшчэ і размахвала пры гэтым рукамі, як спартсменка невядомага віду спорту, перыядычна прыкусваючы губы. Потым хадзіла па палаце, услых разважаючы аб тым, калі ў яе грудзях з'явіцца малако і ці дастаткова яго будзе для дзіцяці. Гэлі, відаць, ужо было не да малака: набліжаўся час родаў, і таму пры чарговых словах Іры яна неяк зусім не ветліва сказала: «Што ты завялася са сваім малаком, нельга наперад «пад руку» нічога казаць, лепш адпачні спакойна». Іра паслухалася, села на ложак і пачала штосьці шукаць у сумцы. Агледзеўшы нярвова ўсе кішэні сумкі, слязліва

вымавіла, што не ўзяла патрэбных ей шкарпэтак. На правах старэйшай па ўзросту і па часу знаходжання ў гэтай палаце, Гэля паспрабавала яе супакоіць, але нічога не атрымалася. Па словах узбуджанай Ірыны выходзіла, што цяпер, без шкарпэтак, усё пойдзе не так. Чарговыя схваткі ў яе ўжо былі не толькі з глыбокім удыхам, але і з горкім плачам. Гэля з ўсіх гэтых «нэрваў» ужо моцна сціскала спінку ложка і спрабавала яго падняць, што было небяспечным не толькі для жанчыны, але і для ложка.

Становішча ўратавала акушэрка, якая якраз прывяла Зою, зусім маладзенькую, невысокую і круглую ад вялікага жывата, здзіўленую пачаўшыміся падзеямі і нібы спалоханую жанчынку. Падыходзячы да кожнай ражаніцы, акушэрка загадвала ёй легчы, мацала знізу жывот, сама сабе, відаць, казала: «Добра,» – бо на самой справе, добра нікому больш не было – і пераходзіла да іншай. У выніку агляду, Іра накіроўвалася ўжо ў радзільную залу, астатнія заставаліся чакаць свайго часу. Амаль каля самых дзвярэй, павярнуўшыся да Наталлі, акушэрка сказала: «Вам, доктар, мабыць, да вечара чакаць». Так цяжарныя суседкі даведаліся, што ў палаце ёсць свой дзіцячы ўрач, што вельмі падбадзёрыла ім настрой.

Адвярнуўшыся да сцяны, Наталля гучна ўздыхнула. «Калі яшчэ той вечар, я ж з ночы гэтыя мукі цярплю!» – падумала яна. Хацела быць мужнай, моцна не стагнаць, бо ведала, што апасля ёй прыйдзецца працаваць у гэтай больніцы і што яе паводзіны нават у гэты адказны час павінны быць скіраваныя на здабыццё аўтарытэту. Яна ведала, што ва ўсіх падручніках напісана, што роды – працэс фізіялагічны, значыцца, трэба трымацца належным чынам, так што «выгукваццa» урачу не да твару. Зусім па-іншаму думала Гэля. Ёй прыйшло да галавы, што, відаць, урачы ўрачам дапа-

магаюць лягчэй пераносіць схваткі, ведаюць нейкія лекі «не для ўсіх», бо хіба ж можна проста так быць такой цярплівай, ды яшчэ ў першых родах? Але пазней засаромелася сваіх думак, убачыўшы, як з заплюшчанымі вачыма, нібы ўціскаючыся ў жорсткі матрац, Наталля шэптам клікала мамачку ў час чарговай схваткі. Выгінаючыся ад падплываючага новага болю, Гэля гучна сказала: «Во трасца на яго, усім баліць, а мне, мабыць, найгорш». Нясмела падыходзячы да яе, нібы баючыся, кругленькая Зоя запыталася: «Пра каго Вы кажаце? Я не зразумела». Трошкі памаўчаўшы (боль якраз адступіў), Гэля адказала: «Ну, што тут разумець, дарослая ж ужо. Пра мужа кажу, пра свайго, пра Наталлінага, пра твайго таксама. Лёгка ім усім дзеці даводзяцца». Далей разважаць яна ўжо не мела магчымасці – прыйшла лабарантка забраць аналізы крыві.

Так-сяк дачакаліся дванаццаці гадзін. Папалуднаді, як тыя пташкі, елі амаль пад прымусам, толькі каб набрацца сілы. У дзве гадзіны прыйшла добрая навіна: Іра нарадзіла дачку. Гэля, назіраючы як санітарка забірала сумку Іры, каб аднесці ў пасляродавую палату, задумёна заўважыла: «Во, на табе, навіна. Яны ж сына чакалі. Цяпер ва ўсім будуць вінаватыя шкарпэткі». Усе гучна засмяяліся, упершыню за дзень. У гэты момант санітарка якраз падняла падушку, трэба было змяніць пасцельную бялізну на былым Ірыным ложку, – пад ёй ляжалі новенькія, з рознакаляровымі палоскамі, шкарпэткі...

Сонца павярнулася, набліжаўся вечар. «Хутка ўжо людзі з работы дамоў будуць ісці. Як добра, што я Колю ноччу катлет нагатавала, усё роўна спаць не магла, павячэрае без мяне, – думала Наталля. – Трэба акно адчыніць, на вуліцы ўжо не горача». Так і зрабіла. Схваткі былі ўсё часцей, як, дарэчы, і ў Гэлі. Пры чарговым аглядзе акушэрка сказала, што чакаць ужо нядоўга.

«Будзем ражаць, я вас на начную змену пакідаць не збіраюся,» – бадзёра запэўніла яна жанчын, як быццам яны з ёй спрачацца збіраліся.

У гэты час Зоя, прытрымваючы рукамі жывот, хадзіла туды-сюды па палаце, падыходзячы да акна, кожны раз выглядвала праз яго – відаць, вельмі хацелася ёй палюбавацца на прыгожыя восеньскія мілавіды, якія добра было разглядваць з вышыні другога паверху. Адпачывала яна паміж схваткамі, лежачы ці седзячы на ложку. Чым мацнейшым станавіўся боль, тым хутчэй яна перабірала нагамі, прасторы для прабежкаў стала не хапаць. Нават адным разам выскачыла на калідор, але, натыкнуўшыся на строгі погляд акушэркі, хуценька вярнулася ў палату. З далейшым развіццём працэсу родаў, на пачатку чарговай схваткі яна падхаплівалася з ложку і з гучным: «Ой-й-й-й-й-ій!» – дабягала да акна, паварочвалася і – назад да дзвярэй. Гэля з Наталляй спрабавалі раіць ёй не бегаць, у выніку яе: «Ой-й-й-й-й-ій!» – змяняўся на перыядычнае: «Не ма-гу-у-у-у-у!» – і бег працягваўся.

На якой «прабежцы» Зоі ў ходзе палатных спраў з'явіўся яшчэ адзін удзельнік, ніхто не заўважыў, але усе раптам пачулі: «Што ж ты так, даражэнькая, крычыш? Вельмі баліць? Веру. Але ж гэта не гора, бо ў цябе «балюча, але мінуча». Вось у мяне сапраўднае гора – ровар згубіў. Ведаеш, выпіў трошкі піва – і не памятаю, дзе ровар пакінуў». Гэля выглянула за акно. Унізе, якраз пад расчыненым акном палаты, стаяў мужчына, на погляд – гадоў пад шэсцьдзесят. Праз бальнічны двор многія хадзілі, змяншаючы шлях да свайго дому. Чырвоны твар, вылезшая з аднаго боку кашуля сведчылі аб тым, што пра колькасць піва ён казаў не ўсю праўду. Падкупляў спачувальны выраз яго вачэй – відаць, ён сапраўды вельмі спачуваў Зоі. Разважаючы сам з сабою наконт ровара, ён прысеў

на траву, але пры чарговым прыбліжэнні галоснай Зоі схамянуўся, задраўшы галаву, намагаўся ўбачыць Зоін твар.

– Э-э, ды ты зусім маладзенькая. Крычы, крычы, калі табе так лягчэй. З першым дзіцём заўсёды цяжка, з другім зусім болю не заўважыш – мая жонка так казала, яна тут санітаркай працуе. Ты ж ёй пра ровар не кажы, чуеш?

Зоя, не маючы сілаў стрымлівацца, адначасова смяялася і плакала, не лепшым быў выгляд і Гэлі з Наталляй. Чалавек паспрабаваў яшчэ штосьці сказаць, але магутнае Зоіна: «Ой-й-й-й-ій! Адчапіся-я-я-я!» – на хвіліну спыніла яго гамонку. Каб хутчэй справадзіць ад акна зваліўшагася на іх галовы «псіхолага-самавучку», падышлі да акна і Гэля з Наталляй. «Дзядзечка, ну, ідзіце ж Вы дамоў. Нам тут не да смеху». Ён, прыгладзіўшы валасы, паспрабаваў справіцца з кашуляй – не атрымалася. Потым дадаў: «Дамоў нельга, пайду ровар шукаць. Не сумуйце, дзяўчаткі. Я вам на развітанне смешную прыпеўку спяю, матчыну». Жанчыны закруцілі галовамі, замахалі рукамі, але ўсё было марна, для яго гэта нічога не азначала. Прытоптваючы нагамі на дарожцы пад акном, ён усё ж такі праспяваў куплет.

На гэтым канцэрт быў скончаны. Хтосьці хутка ішоў па дарожцы ад варот. Заўважыўшы гэта, наш «выканаўца» затрусіў у супрацьлеглым напрамку, пакінуўшы жанчынам падбадзёрліваючы настрой…

Як і абяцала акушэрка, усе трое справіліся нарадзіць дзяцей у час яе змены. Гэля, як яны ў сям'і марылі, нарадзіла дзяўчынку, Наталля – на вялікую радасць мужа – хлопчыка, а Зоя – двойню. Часам смяяліся, згадаўшы дзядзьку без ровара, але з прыпеўкай.

Якімі шчаслівымі былі гэтыя дні – дзеці на свет нарадзіліся!



## Колік

Ён і да сённяшняга дня для ўсёй радні застаецца Колікам, хоць ніхто не памятае, калі і хто першы пачаў яго так зваць. Мабыць, усе адразу і адначасова, бо яму гэта вельмі пасавала. Па пашпарту ўсё, як належыць, – Мікалай, сын мамінай малодшай сястры Ірыны, мой стрыечны брат. Яны жылі ў Расіі, паехалі калісьці з мужам на будаўніцтва і затрымаліся надоўга. Там Колік і нарадзіўся. Потым яго бацька знайшоў сабе маладзейшую жонку, Колік са сваёй мамай жылі ўдваіх. Летам цётка Іра прывозіла яго да бабулі, а потым, як бабуля пастарэла і здароўе пачало слабець, Колік кожныя летнія канікулы праводзіў у нас, так што гэты перыяд дзяцінства ва ўсіх нас назаўсёды звязаны з прысутнасцю Коліка і з мноствам прыгод з яго ўдзелам.

А на прыгоды ён быў здатны амаль што з нараджэння. Бабуля казала, што ён на дзіва вельмі гучна плакаў, калі быў яшчэ немаўляткам, хоць нарадзіўся вельмі худзенькім, дзе толькі сілы браліся. На сямейным савеце вырашылі, што трэба па чарзе ездзіць дапамагаць цётцы Іры гадаваць гэтага «крыклівага генерала». З шасці месяцаў Колік стаў надта хутка расці, а ў дзесяць месяцаў ужо пачаў хадзіць, з гэтым і пачаліся яго прыгоды. Аднойчы ён непрыкметна перакуліўся цераз парог і застаўся ў кладоўцы пасля таго, як бабуля выйшла адтуль і зачыніла дзверы. Яго шукалі, звалі, а ён не адклікаўся. Неяк аднаго разу ўсе збіраліся ехаць на свята ў суседнюю вёску, але не маглі зачыніць дзверы, бо зніклі ключы. Толькі праз гадзіну Колік паказаў, што ключы ляжаць у чыгуне са свіным кормам. А аднойчы самая малодшая маміна сястра перад Вялікаднём ездзіла ў горад набыць штосьці для сябе і гаспадаркі. З гэтай наявы паўвуліцы суседзяў далі ёй

грошы на дрожджы для святочных булак. Яна, канешне ж, купіла. Пакуль усе, седзячы вакол стала, слухалі яе распавяданні пра гарадскія навіны, Коліка чуваць не было. А калі адчулі незвычайнасць гэтай цішыні, то было ўжо позна, бо Колік сцягнуў з лаўкі кошык, схаваўся з ім пад сталом у пакоі і, пакрышыўшы на драбязу ўсе брыкецікі дрожджаў, перасыпаў іх між пальцаў, пры гэтым штосьці мурлыкаў сабе пад нос. Бабуля ў той вечар не ведала, як суседзям у вочы глядзець, шкалікам размяркоўваючы паміж імі дрожджы.

За мяне Колік быў старэйшы ўсяго на адзін год, але лічыў малой (я і на самой справе была самай меншай у сям'і), паводзіў сябе важна, не ленаваўся падкрэсліваць гэта ў падыходзячы момант. А такіх і іншых момантаў хапала кожны дзень, яны былі розныя, прадбачыць іх наперад было зусім немагчыма, хіба толькі можна было гэта зрабіць, калі ўвесь дзень трымаць Коліка за руку. Часта, вяртаючыся пасля работы, тата ўжо па дарозе ад суседзяў даведваўся пра навіны і падзеі дня, таму павінен быў іх рэгуляваць. Звычайна, ён сядзеў на кухні (мама найперш старалася даць яму штосьці перакусіць перад вячэрай, і ў нашым выпадку гэта было вельмі мудра). Усе дзеці стаялі насупраць яго. Патрабавалася прысутнасць усяго асабістага дзіцячага складу, асабліва старэйшых, якія (так лічылася ў нашай сям'і) былі ў адказе за паводзіны малодшых. Тата пачынаў пытаць у Коліка: «Скажы, калі ласка, сынку (тата быў хросным бацькам Коліка), чаму ты адчыніў веснічкі і выпусціў у агарод гусей цёткі Ганны? Яны там усю яе капусную рассаду з'елі!» Усе паварочвалі свае галовы ў бок Коліка, хвалюючыся і за яго, і за сябе. Ён спачатку нахіляў сваю віхурыстую (як і характар) галаву ўніз, пры гэтым нам здавалася, што яго вялікія вушы пачыналі хутка лавіць напрамкі для выйсця і знаходзілі яго. Тады ён смела выпроставаў худзенькую

шыю і, гледзячы на тату, казаў: «Я ж і заўважыў зранку, што цётка Ганна спяшалася і не паспела для гусей травы нарваць, яны так жалобна гагаталі, я іх і выпусціў, каб трошкі пад'елі. Зусім не чакаў, што яны надумаюцца ў агарод за рассадай ісці». Мама падыходзіла да таты і казала, што ў яе шмат гэтай рассады, таму яе хопіць і нам, і цётцы Ганне.

«Чаму ў тваёй сястры на назе такі вялікі сіняк? Навошта ты ў яе ровар адбіраў?» – пытаў тата ў наступны дзень. Колік гучна ўздыхаў, уважліва глядзеў сваімі вялікімі сінімі вачыма на мяне, разумеючы, адкуль тата валодае гэтымі звесткамі, потым гучна адказваў: «А я не адбіраў, я проста хацеў, каб яна навучылася на ходу саскокваць з педаляў, у жыцці гэта можа спатрэбіцца». Тата ўважліва паглядзеў на ўсіх нас, потым запытаў: «Ну, саскочыла яна, абадраўшы скуру на назе, але чаму ж ты адразу на гэтым ровары, як маланка, пагнаўся па вуліцы, здолеў пераехаць упоперак хваста курыцы цёткі Ліды, ды так, што з яе ажно яйка выпала? І дзе гэта ўвесь час старэйшыя былі?» І зноў працавалі Колікавы лакатары, трэба ж было старэйшых з гульні вывесці, яны якраз тады пры сваіх справах знаходзіліся. «Хросны, я ж не спецыяльна тое яйка выціскаў, проста цікава было, хто хутчэйшы – я на ровары ці курыца, а яйка неспадзявана выпала. Сам вырашыў праехацца, нікому не казаў». І так выходзіла, што пацярпелых не было, бо курыца, як таго не было, шчаслівая пабегла дамоў. Хіба што мая абдзёртая нага, але пра яе ўсе хутка забылі, у тым ліку і я. Згадзіліся, што былі парушаны правілы руху: за перавышэнне хуткасці язды ўвесь наступны дзень Коліку забаранялася нават падыходзіць да ровара. У мяне ён павінен быў прасіць прабачэння – штосьці прабурчэў.

Так працягвалася б яшчэ доўга, калі б аднойчы Коліка не падвёз на кані Сцяпан, які разам з бацькамі

і яшчэ з двума братамі жыў праз тры хаты ад нас. Ён быў на гадоў сем маладзейшы за нашага тату. Сярод дзетвары Сцяпан быў знакамітым тым, што ў іхнім садзе расла вельмі адмысловая груша, такой больш ні ў кога не было. Калі грушы паспявалі, то былі жоўтыя, нібы свяціліся на дрэве, сакавітыя, салодкія, як мёд. Сцяпан нас частаваў імі, але ж даваў усяго па адной, і то не кожны дзень – пачастунак зарабіць трэба было. Як і яго браты, Сцяпан жонкі не меў. Мама казала, што ў маладосці ён быў закаханы ў татаву малодшую сястру, але яна памерла ад дыфтэрыі ў шаснаццацігадовым узросце. Больш яму ніхто не падабаўся. Аднойчы, праўда, ён даў згоду на знаёмства з дзяўчынай з суседняй вёскі, нават паехалі з братам суботнім летнім вечарам у сваты. Усім было цікава, ці зладзілася справа. Мама раніцай, сустрэўшы Сцяпана ля калодзежа, запытала: «Ну, як справы, ці добрая ж дзяўчына?» Сцяпан, невядома чаму, падняў пустое вядро, потым зноў паставіў яго і адказаў: «Сярэдняя». Было ўсім зразумела, што вяселля ў хуткім часе не будзе...

Аб чым там дамовіліся маўклівы і спакойны Сцяпан і наш непаседлівы Колік, мы не ведалі, але вечарам ён у нашага таты папрасіў дазволу ранкам ісці на калгасную работу: трэба дапамагаць Сцяпану сена вазіць. Тата, параіўшыся з мамай, згадзіўся, бо Сцяпан быў чалавек сур'ёзны, кепскаму хлопца не навучыць. Колік радасна папрасіў даць яму замест майкі кашулю з доўгімі рукавамі, каб сенам рукі не пакалоць, і, павячэраўшы, хутка лёг спаць – заўтра ж рана ўставаць.

Раніцай Сцяпан заехаў за нашым чатырнаццацігадовым працаўніком. Колік з сур'ёзным выглядам важна ўзлез на пусты яшчэ воз, трымаючы мяшэчак з перакусам. Было вельмі хвалююча і адначасова радасна бачыць, як яны селі побач: дарослы, шыракаплечы мужчына і худзенькі, з доўгімі рукамі і нагамі падле-

так, абодва з загарэлымі тварамі і ў аднолькавых (толькі рознага памеру) «брызянтоўках» на звісаючых між драбінаў возу нагах. Так і пачалася паміж імі дружба. Коліка раніцай нават будзіць не патрэбна было, падхопліваўся, хутка снедаў і ішоў на калгасны двор, дзе яго страчаў Сцяпан.

За колькі дзён Колік ужо сам запрагаў каня ў воз, ведаў, як патрэбна ўкладваць сена, каб воз быў вялікі, але не разваліўся па дарозе. Аднойчы яны далі мне дазвол разам праехаць на высокім возе з сенам. Як жа прыгожа было бачыць перад сабой павозкі з сенам, якія цягнулі паважныя, прыгожыя коні. Іх ніхто не падганяў, каб не растрэсці гэтыя дзівосныя будавіны. Здавалася, што яны, як караблі, плывуць па зялёным моры луга. Паветра было насычана водарам траў, ужо скошаных і яшчэ расквечаных у розныя колеры, чакаючых сваёй пары, каб потым стаць смачным сенам, якое ператворыцца ў салодкае, адмысловае малако. Мне ўсё гэта здавалася надта дзіўным, хацелася спяваць, але я нават не варушылася, баялася, што сена зараз раз'едзецца і мы ўсе разам павалімся. Трымалася за вяроўку, якой па цэнтру быў сціснуты воз. Па выгляду Сцяпана і Коліка хвалявання зусім не было відаць. Яны амаль што ўвесь час маўчалі, толькі ўсміхаліся, калі воз калыхаўся на няроўнай лугавой дарозе і я войкала ад страху. Колік важна трымаў лейцы, калі-нікалі паварушваў імі, каб конь ведаў, што гаспадар на месцы.

За месяц ён падрос, еў за дваіх. Ужо не называў мяне малой, з большай павагай ставіўся да маіх зваротаў за дапамогай пры выкананні хатніх абавязкаў. Скончыліся спрэчкі за ровар, ён патрэбен быў ужо толькі пасля работы. Неяк вечарам у суботу Колік папрасіў тату распавесці пра дзеда, якога добра памятаў Сцяпан, бо дзед яго, малога тады Сцяпанку, часта

заклікаў паласавацца мёдам з пасекі, якая славілася на ўсё наваколле. Тата згадзіўся. Мы ўсе расселіся вакол яго на ганку. «Майго дзеда звалі Васілём. Быў ён не вельмі высокі, але дужа моцны. Меў тоўстыя пальцы на руках, шырокія далоні. Многа працаваў, у маладыя гады разам з братамі спрабаваў пашукаць шчасця ў іншых месцах, быў у Краснадары і ў Данецку, ды вельмі па родным краі сумаваў. Калі вярнуўся, то ўсім казаў, што прыгажэйшых мясцінаў, чым нашыя, ён не бачыў. Навучыўся рабіць вуллі, завёў пчолаў, так з'явілася ў нас пасека, любімая яго справа. Мой малодшы брат Іван вельмі любіў мёд, але дзядуля нам больш, як паўстакана ў дзень есці мёду не даваў, казаў, што пашкодзіць. Іван аднойчы да дзеда ўсё прыставаў: «Дай, да дай». Дзед Васіль раззлаваўся: «Вось калі памру, то хоць увесь тады гэты мёд з'еш». Іван уважліва паглядзеў на дзеда, ды кажа: «Калі тое яшчэ будзе, а мне мёду сёння хочацца». Не разумеў малы, што дзеда гэтым пакрыўдзіць можна.

Неяк дзед па дровы ў лес паехаў. Вясна была мокрая, ўсе дарогі размытыя. Вязе ён дровы, а конь сярод вялікай лужы стаў: воз не можа з месца зрушыць, колы амаль што ўсе ў зямлю закапаліся. То з аднаго боку дзед воз падпіхвае, то з другога – конь ні з месца. Потым выпраг каня, сам пацягнуў воз за аглоблі – выцягнуў. Бабуля дома хвалявалася, што ён так доўга з лесу не вяртаўся, пытаецца: «Што здарылася?» Дзед паправіў вылезшую з ботаў штаніну і адказаў: «Дарогі зусім размытыя, а воз вялікі. Не дзіва, што конь не мог выцягнуць – я і то ледзьве асіліў». Усім было радасна за прадзеда-асілка і разам сумна, што яго ўжо нельга пабачыць. Гэтыя ўспаміны нас, дзяцей, яшчэ болей аб'ядноўвалі, бо ўсе мы лічыліся нашчадкамі дзеда, якога паважаў дзядзька Сцяпан, знакаміты смачнымі грушамі ў садзе.

Сябравалі Сцяпан з Колікам увесь час, пакуль мы жылі ў вёсцы. А гэтае дзіўнае першае лета сяброўства скончылася надта хутка. Цётка Іра прыехала за Колікам у канцы жніўня і была вельмі здзіўлена, бо перад ёю стаяў памужнеўшы, амаль з зусім дарослым поглядам вачэй, прыгожы вясковы хлопец. Ужо калі яны абдымаліся з намі каля аўтобуса, развітваючыся перад ад'ездам, прыйшоў Сцяпан з вялізным кошыкам, напоўненым прыгажунямі-грушамі. Паставіўшы кошык у аўтобус, ён сказаў: «Пачастуеш сяброў, яны такіх грушаў, можа, і не каштавалі. Прыязджай, ты добра ўмееш дапамагаць, без цябе я не спраўлю ўсю работу». Ад гэтых слоў Колік аж засвяціўся ад радасці. Падаўшы Сцяпану на развітанне руку, ён сказаў: «Дзякую Вам, я абавязкова прыеду». Гэта былі словы абсалютна ўпэўненага шчаслівага падлетка, які пры простай сялянскай працы побач са звычайным чалавекам змог убачыць штосьці такое, чаго раней не разумеў і атрымаў магчымаць адчуць прыгажосць развіцця, каб стаць іншым – такім, якім яшчэ ніколі не быў, якім яго ніхто не ведаў раней, і не дзеля таго, што гэтага хацелі іншыя, а таму, што яму самому падабалася быць такім. І ніякіх педагагічных падыходаў не спатрэбілася, ніякай мудрагелістасці ў адносінах – звычайная празрыстасць вясковага жыцця, якой, на жаль, нам часта не хапае ў нашым спешным, з подбегам, дарослым жыцці.

Так і працавалі кожнае лета Сцяпан з Колікам – да самага заканчэння апошнім школы. Потым, як і ўсе юнакі, Колік стаў салдатам тэрміновай службы, там жа вывучыўся на шафёра, уладкаваўся працаваць вадзіцелем «Хуткай дапамогі» у сваім горадзе. Вясковыя летнія канікулы хутка скончыліся для ўсіх – выраслі, раз'ехаліся вучыцца. І што тут казаць – мы сталелі, а нашы бацькі старэлі, час жа ішоў.



Але сувязі між намі назусім не парваліся: дасылалі святочныя паштоўкі, калі-нікалі мелі тэлефонныя перамовы. Колік заўсёды цікавіўся вясковымі навінамі, дасылаў прывітанні Сцяпану. Аднойчы ў размове я сказала Коліку, што Сцяпан ужо мала ходзіць, вельмі расхварэўся, ногі ў каленях набрынялі, не слухаюцца, боль не дае перадыху нават на сон. У бальніцу ехаць адмаўляецца, не хоча пакідаць аднаго старэйшага брата, бацькі ж даўно памерлі…

Тэлефон званіў надта настойліва і трывожна – так здаецца, мабыць, усім, хто, падхапіўшыся на прыканцы ночы, не ўключаючы святло (дзяцей каб не збудзіць), навобмацак са спалоханымі вачамі і сэрцам імчыцца да тэлефона, каб хутчэй спыніць гэты няўчасны звон.

Тэлефанаваў Колік, каб сказаць, што ён у камандзіроўцы, прывёз на спецыяльнай машыне хворага чалавека для далейшых лекаў па месцы жыхарства, гэта не вельмі далёка ад нашых мясцінаў. Атрымаў дазвол у кіраўніцва заехаць да нас, праз гадзіны дзве ўжо сустрэнемся.

– Хачу запытацца, ці зможаш разам са мной наведаць дзядзьку Сцяпана? Я яму лекі прывёз.

– Змагу, у мяне сёння другая змена. Але ж і напалохаў мяне твой начны званок.

– Прабач, я не падумаў пра гэта. Часу мне далі зусім мала.

– Сцяпан будзе вельмі рады. Я хачу ведаць, якія лекі ты прывёз, ты хоць і ездзіш на «Хуткай дапамозе», але ж толькі ў якасці шафёра, а не доктара.

– Не турбуйся, сястрычка, я параіўся і купіў розных лекаў ад хваробы ног. І еду я разам з урачом, які суправаджаў нашага хворага (дай, Божа, ім абодвум здароўя). Вось вы разам і вырашыце, што спатрэбіцца дзядзьку Сцяпану…

Я слухала ўзбуджанага Коліка і думала аб тым, колькі намаганняў спатрэбілася майму брату, каб атрымаць гэтую камандзіроўку і дазвол заехаць да нас. Была шчаслівая нечаканасцю сустрэчы, учынкам Коліка і адначасова сумавала, бо ведала, што не прыдумана яшчэ сродкаў ад старасці...

Два найменні лекаў былі якраз для Сцяпанавай хваробы. Назіраючы, як радаваліся сябрукі адзін аднаму, адчувала, што іх сустрэча дапаможа дзядзьку на які час забыцца на ўсе хваробы. Думалася аб дзяцінстве і аб тым, як у тыя далёкія часы цяжка было нават уявіць, што ў глыбіні хітрых вачэй Коліка можа змяшчацца столькі пяшчоты, якую зараз ён дараваў хвораму чалавеку. Яна, гэтая трывалая мужчынская пяштота, стала самай лепшай з'явай сённяшняга Сцяпанавага жыцця. Зразумела таксама і тое, што аб такой, глыбока схаванай, частцы душы майго брата здагадаўся, відаць, дзядзька Сцяпан ужо тады, калі прыладжваў няўрымслівага хлопчыка да простай летняй сялянскай працы. Усяму свой час...

## Мясцовыя асаблівасці

Сям'я Здановічаў у вёсцы была адметнай, а гэта выснова грунтавалася больш на саміх развагах гаспадыні Надзеі. Яна так лічыла! Працавала жанчына гандляркай у невялічкім вясковым магазіне, дзе прадавалася амаль усё, што было патрэбным для жыцця на сяле. Былі, канешне, і тыя тавары, што, часам, не толькі дапамагалі, але і шкодзілі пакупніку. Болей маю на ўвазе гарэлачку, асабліва ў чвэртках, якія так нявінна, нібыта бліскучыя маленькія рыбкі ў вадзе, паглядалі з вітрыннай палічкі на актыўных рыбакоў, быццам шэпчучы: «Ну, што тут так доўга думаць, так проста злавіць, колькі тут мяне ёсць, толькі ж пакаштаваць, калі на траіх». Няўстойлівыя так і рабілі, ды часта памыляліся, бо не яны лёгка лавілі гэтую бяда-рыбку голымі рукамі, а яна іх. Моц яе была не ў памеры, каб паваліць, а ў тым, каб заахвоціць здатнага пакупніка. Бывала так «наловяцца», што самі ў шчупакоў-ліхвяроў ператворацца.

Ох, і злаваліся жонкі на Надзею, калі тая напачатку дня прадавала іх гаспадарам такую «рыбку», нават без дастатковых сродкаў, часцяком на «павер», робячы адразу запіс у свой асаблівы сшытак. У большасці разоў даўжнікі сродкі да канца месяца знаходзілі, але перападала і так: прыйдзе, напрыклад, Іванава Волька купіць макаронаў, а ёй неспадзявана прадавец і кажа: грошыкі павінна яшчэ і за мужа плаціць. Тая патыліцу чухае, незадаволена крэхча, у кашальку рублікі перабірае, але што рабіць – плоціць, бо не хочацца ж «дурной славы». Калі хтосьці з такіх жанчын спрабаваў уздзейнічаць на Надзіна сумленне, то тая падрыхтавана, як з кулямета, тараторыла: «Мне выручка даведзена – даведзена, факт! А ты сама пільнуй свайго

мужа. Мой жа не купляе». Хто б сумняваўся. Яе Пятро быў сціплым, маўклівым і вельмі працавітым мужчынам. Рабіў ён вартаўніком на калгасным двары. Ноччу беражэ народнае дабро, а днём па гаспадарцы капошыцца, калі ж чалавеча адпачываў? Паважалі яго ўсе: і старыя, і малыя. Вельмі мудрым па прыродзе сваёй ён быў чалавекам. Бывала, заўважваў якую-небудзь асабістую акалічнасць начнога жыцця аднавяскоўцаў пры абыходзе межаў у час нясення сваёй варты, на тым і канец – ніхто больш пра гэта акрамя яго не даведаецца. У вёсцы казалі, што Пятро сам ездзіў да начальства прасіцца на вартаўніка, каб менш са сваёй вельмі прадбачлівай і дужа разумнай жонкай бачыцца. А так што – ноччу ён на працы, днём – яна гандлюе. Во як па-рознаму лёс людзей можа плысці па рацэ быцця, але нішто не гаварыла пра той крызіс, што напаткаў жыццё гэтай пары. Бо жаніўся наш Пятрук на Надзі па вялікаму каханню, нават ад звыштэрміновай службы у арміі адмовіўся (якую прапаноўваюць далёка не кожнаму), так ляцеў да сваёй галубкі – светлавалосай «пышачкі». Пажаніліся хутка, Пятро да парад маці не прыслухаўся, якая раіла не спяшацца, прыгледзецца трошкі. Любая нарадзіла яму двух дачушак, і жылі яны ціха і спакойна.

Здаецца, нічога асаблівага – звычайная сям'я. Але Надзея лічыла інакш. Ёй заўсёды хацелася быць найлепшай, прыкладам для другіх. Ды ўжо так прыліпла да яе гэтае жаданне, што ператварылася ў псіхалагічны комплекс, моцную залежнасць, не раўнуючы – нібы ў хваробу. Сукенкі сваім дзяўчаткам яна ніколі не заказвала ў мясцовых краўчых, купляла гатовыя ў горадзе, часам, на базе «даставала» штосьці замежнае і вельмі ганарылася з гэтай нагоды, бо было адзенне ў яе дзяўчынак не такое, як ва ўсіх, а самае лепшае. Калі да іх у двор забягала дзятва пабавіцца разам з яе

дзяўчынкамі, то яна абавязкова перыядычна клікала сваіх перакусіць пячэннем з малаком, добра ведаючы, што амаль усе астатнія дзеці дома перакусвалі малаком з хлебам, а ў лепшым выпадку – з батонам. Калі ў гэты час быў дома Пятро, то ён, канешне, выносіў пячэнне ў двор і частаваў усіх дзяцей. Наконт пачастунку, праўда, Надзея не пярэчыла, бо, зноў жа, не кожны мог сабе дазволіць дзяцей пячэннем частаваць.

Нястомна Надзея «клапацілася» і аб добрым выхаванні моладзі. З гэтай нагоды вельмі цікавілася ўсімі навінамі, якія адбываліся ў школе, – ад адказаў на ўроках, да паводзін навучэнцаў пасля школы на вуліцы. Ведала, як ёй здавалася, усё пра ўсіх. У выніку, спраўна выконвала працу службы «унутранай бяспекі» ва ўсім, што тычылася малых ці вялікіх маладзёжных справаў. Былі ў яе для гэтага і дапаможнікі – вясковая дзетвара, якая часцяком забягала да яе, каб за курынае яйка купіць жменьку салодкіх цукерак у прыгожых фанціках, у якія апасля падчас гульні загортваліся жалуды. Бывалі, канешне, моманты, калі цукерак невыцерпна хацелася, ды курыца ніяк не злазіла з гнязда, пазнілася з яйкам, а тыя яйкі, што былі ў запасе, мама ўчора памяняла ў магазіне на цукар. Тады Надзея казала: «Нічога, я табе дам цукерак, а яйка прынясеш пазней, толькі зараз збегай пацікаўся, хто там з хлопцаў сёння дапамагае дзяўчатам пасля заняткаў прыбірацца ў класе (графік дзяжурстваў ёй, канешне, быў добра знаёмы)». І так ва ўсім. Інфармацыя ўмомант перадавалася на кантроль бацькам, якія знаходзіліся ў спакойнай несвядомасці. І чым сталейшай станавілася Надзея, тым болей дзейсным быў яе такі амаль нахабны прафілактычны нагляд.

А час ішоў. Вось ужо старэйшая дачушка Кацярына скончыла школу і паступіла вучыцца ў гандлёвы тэхнікум. Радуецца Надзея – не кожны можа атрыма-

ць такую патрэбную прафесію. Вучыцца добра, маці ў гэтым упэўнена, бо сама штомесяц наведвае тэхнікум, цікавіцца ў выкладчыкаў справамі дачкі. А там хваляць яе, маўляў, старанная ў Вас дзяўчына, расце харошы спецыяліст. «А чаму ж не? – з задавальненнем распавядае пасля чарговай паездкі ўсім у вёсцы аб гэтым Надзя. – У каго ж ёй быць не стараннай?»

Вясной вёску ўскалыхнула навіна – Каця замуж выходзіць, вяселле праз два тыдні. Усім цікава было, што ж за хуткасць такая? Студэнты ж абодва, хоць бы вакацый дачакаліся. А Надзея і тут тлумачэнне дужае мае: каханне вялікае ў іх, такое як у нас з Пятром, вось і спяшаюцца маладыя, каб хутчэй разам быць, мо куды-небудзь на канікулах пададуцца адпачыць, мы ў сваёй сям'і можам гэта дзецям дазволіць. Да таго, нашыя новыя сваты не абы-хто, таксама не без грошай жывуць, людзі паважаныя, адукаваныя, геолагамі працуюць, ад дзяцей не адвернуцца. Але зараз у экспедыцыі далёкай знаходзяцца, на вяселле пакуль не змогуць прыехаць.

Вясельныя ўборы (хто б сумняваўся), шылі ў самай лепшай майстэрні раёна. На ўрачыстаць запрасілі амаль палову жыхароў вёскі, прыезджай радні таксама каля дзясяці асоб набралася. Так што пад застолле былі скарыстаны абодва пакоі ў хаце. Для танцавальнай праграмы дамовіліся размясціцца ў хаце старэнькай бабулі Ганны, якой музычна-танцавальныя пацехі зусім не перашкаджалі: выпіўшы чарачку для весялосці, яна крыху падзівілася на сучасныя танцы, а потым, як ні ў чым не бывала, прыснула на канапцы за перагародкай. У яе гадоў з пяць кепска чула правае вуха.

Зусім іншы інтарэс да гэтай праграмы быў у астатніх жыхароў вёскі. Людзей набілася поўная Ганніна хата. Усім вельмі ўжо хацелася дэталёва разгледзець: па-першае, гарадскога мужа Кацярыны, па-другое, яе

сукенку і вэлюм, пра прыгажосць першага і апошніх ужо колькі дзён «трашчала» яе маці. Першы выхад вясельнікаў пасля застолля на танцы адбыўся толькі пасля дзевяці гадзін вечара, але ніхто не здаўся, цярпліва чакалі гэтага моманту. З іншага погляду – яно і лепш, бо гаспадыні паспелі не толькі ўправіцца з гаспадаркай, але і апрануцца па-святочнаму (хто ж яго ведае, можа і самім пайсці ў карагод захочацца, ці на танец хто запросіць, быць нагатове тут зусім не пашкодзіць). Першай перад усімі з'явілася сястра Пятра, несучы перад сабой вялізныя міскі: адна – з кавалкамі пульхнага вясельнага пірага, другая – з нарэзанымі мяснымі прысмакамі. За сястрой з'явіўся сам Пятро з бутэлькай гарэлкі і шкалікамі. Яны з сястрой падыходзілі да кожнага ў хаце, ветліва і з павагай звярталіся – запрашалі пачаставацца за шчасце маладых. Хто жадаў шчасця многа – мог частавацца некалькі разоў. Паступова па хаце расплываўся непараўнальны пах часныку з перчыкам, аздоблены вабным пахам выпечкі і не менш вабным, асабліва для мужчынскай часткі прысутных, здаровым хлебным пахам вясельнага напою.

Неўзабаве пачуліся гукі баяна і на парог ступілі сват са сваццяй, за імі – маладыя і іхняя «дружба» – хлопцы і дзяўчаты, упрыгожаныя кветкамі, замацаванымі з левага боку на грудзях. У Кацярыны і Алега (так зваўся жаніх) букецікі красаваліся ўжо з правага боку. Гэта азначала, што з сённяшняга дня яны перайшлі ў стан сямейных людзей – ні больш, ні менш. Першымі таньчылі вясельны вальс маладыя. Да чаго ж прыемна было бачыць, як добра русавалосай Кацярыне пасавалі да твару бялюткі вэлюм і сукенка, прыгожа расшытая бліскучымі бусінамі, што надавала веліч усім танцавальным рухам маладой. Праўда, некаторым уважлівым жанчынам падалося, што сукенка была вузкаватай на таліі, ды і твар у маладой неяк трошкі па-



круглеў. А яна і сапраўды была нейкай зусім інакшай побач з каханым. Штосьці таямнічае і незвычайнае выдаваў яе загадкавы погляд, скіраваны на Алега. А калі ён, мужны і шчаслівы, углядваўся ў яе вочы, то адчуваў, як струменьчыкі кахання, выплываючы з іх глыбіні, агортвалі яго хвалямі пяшчоты і выклікалі жаданне кружыць сваю маладую жоначку на руках, што ён перыядычна і рабіў пад гучныя апладысменты моладзі. Пятроў пачастунак таксама зрабіў сваю справу, вельмі паўплываў на настрой прысутных – вяселле загудзела і закруцілася ў той асаблівай весялосці, калі незаўважна вальс мяняўся на польку, тая – на танга, музыкі не лянаваліся, гралі ахвотна і сучасныя мелодыі па заяўках, прыпяваючы разам з мясцовымі салістамі. І нават тое, што вясновая ноч кароткая і раніцай трэба будзе ўправіць гаспадарку, бо жыўнасць і ў нядзельку патрабуе клапоту аб сабе, зараз нікога не хвалявала. Вяселле ў вёсцы – свята для ўсіх, і тут няма ніякай размовы…

Развагі пачаліся раніцай паміж жанчынамі каля Ганнінага калодзежу, бо іх хлебам не кармі, а дай толькі магчымасці падзяліцца ўражаннямі. Языкі ж свярбяць так, што маўчаць і сапраўды пакута. Агульна вырашылі, што Каця малайчына, добрага сабе жаніха знайшла. І музыкі і дружбаны – таксама ўсе, як на падбор, вяселле па вышэйшай катэгорыі. А што тычыцца пірагоў, то яны атрымаліся на дзіва мяккія, зусім без прыпёку. Вяндліна якраз, як належыць, сакавітая, а калі ўспомніць пра каўбаску, тоненькую, з умеранай колькасцю солі і часнычку, то і зараз бы елі, не гледзячы, што зусім ранні час. Ад гэтых словаў суседак у Надзеі, якая таксама падышла з вядром, усмешка расквеціла твар, хоць у душы яна і без іх ведала, што ў яе дачкі вяселле будзе лепшым у акрузе. Але ж надта прыемна чуць, калі аб гэтым кажуць іншыя. Ад паўна-

ты пачуццяў яна запрасіла ўсіх сёння зноў прыйсці а палове дня ў хату да Ганны пачаставацца, бо да вяселля падрыхтаваліся добра, нагатавалі столькі, што частавацца можна будзе яшчэ колькі дзён, і не выцерпела, сказала, што і сённяшняя сукенка Каці таксама будзе незвычайнай прыгажосці: блакітная, з залатой вышыўкай на рукавах – першы раз у горадзе такі фасон шылі, самі ўбачыце. У знак згоды жанчыны весела залівалі галовамі. А чаму не згадзіцца, справа добрая, вяселлі ж не кожны месяц здараюцца.

Ужо і за восілкі вёдзер некаторыя ўзяліся, каб разысціся па сваіх дварах, а вось на табе – суседка Здановічаў з правага боку, весялуха Шура не ўтрымалася і запытала аб тым, што са ўчарашняга вечару круцілася на языку ў многіх: «А што гэта вы цеснаватую вясельную сукенку Каці пашылі, ці мо цяжарная? То ўжо ж не маўчы, гэта не схаваеш, усё роўна вылезе, не толькі ў тваёй дачкі так здаралася». Тыя словы, што ў яе дачушкі здарылася тое, што бывала ў другіх, на якісьці момант прымусілі пабялець твар Надзеі, дайшлі ажно да сэрца. Ды раптам яна ўсвядоміла, што ў гэтым выпадку яно, можа, і лепей, што так жыццё гутарку павярнула. Няспешна падцiснула хустку на галаве, усміхнулася і адказала, гледзячы на Шуру: «А мы з Пятром і не збіраліся нічога хаваць, так, на трэцім месяцы наша Каця. Наадварот, я вам зараз распавяду, чаму так здарылася. Ведаеце, нашы сваты толькі дзесяць гадоў жывуць у райцэнтры. А на самой справе, яны сібіракі, там і да сённяшняга дня ўся іх радня жыве. Дык у іхняй мясцовасці дзяўчыну бяруць замуж тады, калі жаніх упэўнены, што нявеста цяжарная, правераная значыць, толькі ў такім выпадку бацькі даюць згоду на вяселле. Алег вельмі закахаўся ў нашу дачушку, яна – у яго. Што ж заставалася Каці рабіць? Бедная, пакутавала. Хочаш замуж – паважай і прымай законы жыцця буду-

чай радні ад самага пачатку. Яна і пагадзілася, выхавалі ж мы яе паслухмянай. Вы зараз і самі разумееце, нельга ж ураз змяніць мясцовыя звычаі...»

Раптоўна гучны і дружны рогат жанчын каля калодзежа парушыў ранішнюю цішыню. Яны такой версіі «залёту» яшчэ не чулі. Гледзячы на іх, зарагатала і Надзея, бо яна адчула свабоду ад таямніцы і радасць ад таго, што аніякай абразы не адчувалася ў рогаце суседак, гэта была проста высокая адзнака яе майстэрства быць таленавітай маці. Ад такога зычнага шуму прачнулася нават цётка Ганна. «Што з жанчынамі робіцца, няўжо так учора пагулялі, што за ноч  не працвярозелі? І чаму ж гэта я так рана заснула, усё самае цікавае праспала. Сёння я нічога не прапушчу,» – падумала яна і павярнулася на другі бок. Але заснуць болей ужо не змагла – пеўні, напалоханыя несвоечасовымі і незразумелымі гукамі смеху, сваім разгалоссем пачалі абуджаць наваколле. Пачынаўся новы прыгожы вясновы дзень у невялікай беларускай вёсачцы, у якой сёння будуць святкаваць другі дзень вяселля, радуючыся шчасцю маладых...

## Пасхальная песня соловья

У нас у всех иногда бывают недолгие минуты, когда вдруг наплывают воспоминания. События из прошлого – далекого и близкого – вновь почему-то выходят на первый план, а сказанные или услышанные слова, интонации и звуки, переживания вновь будоражат сердце и ум. Становится нестерпимо больно или, наоборот, тепло и радостно. И хотя ты отчетливо понимаешь, что всё было давно, поменять и вновь прожить те минуты нельзя, всё еще долго не покидает ощущение непостижимости прихода этих воспоминаний и абсолютной уверенности в том, что это совсем не случайно.

Вот и сейчас, в весенние предпасхальные дни, мне часто вспоминаются родители: слова мамы, шутки-прибаутки папы, их нехитрые советы, с возрастом осмысливаемые по-новому.

Это было 20 лет назад. Всей семьей мы, по обыкновению, приехали к маме, чтобы вместе встретить ее любимый праздник – Пасху. Наши дети, как всегда, очень радовались, ходили вокруг бабушки, мешали и ей, и мне закончить предпраздничные приготовления. Всех будоражило приближение необыкновенного чудесного праздника. Вскоре приехал мой племянник и, к нашей радости, привлек их к уборке двора, наведению последних «штрихов красоты» у калитки.

Мы с мамой использовали это время для завершения подготовки праздничного стола к завтрашнему утру: постелили белую, расшитую васильками и ромашками скатерть, расставили «особые» праздничные тарелки. Это были еще и те НАШИ редкие минуты, когда мы могли побыть вдвоем: поговорить, погрустить и порадоваться. Я до сих пор помню и ощущаю то со-

стояние тихой и трепетной радости от всего, что было вокруг: от стоящего в центре комнаты нарядного стола с красивой, наполненной крашенными яйцами, вазой, от запахов пышных пасхальных пирогов, от яркой герани на окне, от намытых до блеска окон и полов, от того, что мама рядом и совсем, как в детстве, гладит мою уставшую от забот голову...

А потом наступил вечер. Оставив мужчин за беседой, мы, женщины, укладывали детей спать. Они все допытывались: не забудем ли мы их разбудить рано утром, уточняли, на каком стуле сложены праздничные платьица и рубашки, просили сказку то у меня, то у бабушки и, наконец, угомонились. Стало необычайно тихо, и даже доносившиеся из другой комнаты звуки теленовостей, казалось, совсем не нарушали эту тишину.

Ближе к полуночи мы пошли в церковь. Радостно было видеть и обнимать родных и подруг, а на рассвете всех поздравлять с праздником. Домой возвращались пешком. Было довольно прохладно, весна что-то в том году задерживалась: почки на деревьях не распустились, на мелких лужицах даже сверкали льдинки. Как обычно, мама делилась с нами воспоминаниями о былых временах, а потом с уверенностью сказала, что уже станет теплее, ведь сегодня запоет соловей. Мы с мужем даже остановились: «Сегодня? В заморозки? Это невозможно». А мама тихо ответила: «Запоет. Так бывает всегда, он в эту ночь славит мир и новую жизнь». Чтобы маму не обидеть, мы заговорили о чем-то другом и, продолжая путь, оказались у небольшого школьного сквера, который являлся местом отдыха и поводом для гордости уже нескольких поколений учеников. И вдруг мама сжала мне руку: «Тише! Послушайте!» Мы, оторопевшие, остановились... Из глубины сквера, вначале еле слышно, робко, с промежутками, а потом всё гром-



че, радостнее и увереннее к нам плыли очаровательные звуки. «Это соловей!» – не удержавшись, воскликнул муж. Боясь шелохнуться, мы смотрели вдаль на деревья, понимая, что где-то там поет маленькая птичка, поет, не боясь холода, в точно назначенный час, выводя трели о вечной любви, о наступающем дне новой жизни и о бесстрашии сердца, наполненного любовью.

Радостное ощущение обновления наполняло душу, хотелось скорее поделиться этой радостью со всеми. Мы смотрели друг на друга и не понимали, почему по щекам текут слезы...

Зима, похоже, опять решила задержаться: сыро, ветрено. «Потеплеет. В пасхальную ночь будет петь соловей. Так было всегда,» – теперь уже я сама говорю своим детям.

## Першыя канікулы

Ура, апошняя пяцёрка ў залікоўцы. Свабода! Хутка бяжым ад аўтобуснага прыпынку да дзвярэй інтэрната, потым, праз прыступак, – на трэці паверх, у трыста дзесяты пакой, дзе нас чакаюць ужо з вечара прыгатаваныя дарожныя сумкі. Настрой бадзёры. Мы, чатыры сяброўкі-студэнткі мединстытута, скончылі першы год навучання з добрымі вынікамі. Радасць не змяшчаецца ў сэрцы, яна разам з крывёю трапляе ў ногі (таму яны не ходзяць, а бегаюць і прытанцоўваюць), у вусны (таму яны ўвесь час усміхаюцца) і ў вочы (таму радасць льецца з іх іскрыстым, рознакаляровым няспынным ручаём). Гэтая нашая прыўзнятасць выклікала ўсмешкі і ў вадзіцеля тралейбуса, і ў вахцёра, і ў прыбіральшчыцы, якая мыла падлогу на трэцім паверсе.

Хутка п'ем чай з бутэрбродамі, абдымаемся і развітваемся да канца лета...

Як гэта цудоўна гучыць, як жа прыемна гэта адчуваць: еду дамоў. Дамоў – туды, дзе немагчыма надыхацца духмяным паветрам, дзе закладвае ў вушах ад цішыні і дзе кожнай сваёй клетачкай адчуваеш любоў і спагаду сваіх родных.

Вось і апошні паварот, аўтобус з'язджае з асфальту на гравейку. Паміж дрэваў мільгаюць зялёныя кавалачкі поля, што раскінулася за дарогай. Я адчуваю хваляванне: пачынаецца лес і самая прыгожая частка шляху да нашай вёскі – апошняга прыпынку аўтобуса. Высокія, паважліва спакойныя, арыстакратычна прыгожыя сосны, стройныя, трапяткія і гаваркія бярозы, квітнеючыя рознымі адценнямі кусты шыпшыны, лясныя, прывабныя сцежкі паміж імі – усё гэта зараз за вокнамі аўтобуса, з дзяцінства знаёмае і роднае. Мне

і да гэтага часу не давялося ездзіць па дарогах, прыгашэйшых за гэтую, што вядзе дамоў.

Праехаўшы па вясковай вуліцы і мягка скалыхнуўшыся на з'ездзе з маста, аўтобус спыніўся на «цэнтральнай плошчы» вёскі, куды якраз выходзіла адно акно нашай хаты. Я адразу заўважыла, як варухнулася фіранка – гэта тата, як заўсёды, сачыў, ці не прыехаў, выпадкова, хто-небудзь да нас. Праз хвіліну ён падбегам спяшаўся да мяне, а каля веснічкаў ужо чакала мама.

Вячэралі доўга, размаўлялі. Мама ўсё падкладвала мне бульбачку, падлівала ў кубак малако. Часам у яе вачах я заўважвала ледзь прыкметнае хваляванне.

Перад сном мама зайшла да мяне пажадаць добрай ночы і ціха запытала:

– Дачушка, чаму ж ты такая худзенькая стала, табе нічога не баліць?

Я затрэсла галавой і рукамі:

– Не-не, мамачка, не хвалюйся, гэта ж у час сесіі ўсе худзеюць, няма часу і настрою добра есці.

«Вось чаму мама трывожылася за вячэрай,» – здагадалася я.

Божачка, як жа прыемна засынаць у роднай хаце! Здаецца, што цела апусцілася не на мілы дзявочы ложак, а на мяккія хвалі і праз верхнюю шыбіну акна менавіта табе лагодна і ледзь прыкметна ўсміхаюцца нябесныя зоркі. Ласкавыя пагляды бацькоў, смачная вячэра, непаўторны водар цёплай летняй ночы – усё гэта прывяло да канчатковага ўсведамлення: я дома. Наплывае хваля радасці, якая змывае трывогі ўсяго мінулага года. Апаноўвае прыемная стома надыходзячых сноў.

Прачнулася ад настойлівага шэпту мамы:

– Дачушка, вось цёплае малачко, толькі што надаіла, пі, калі ласка.



– Мамачка, ну, якое малако! Я спаць хачу, яшчэ цёмна.

Мама не адыходзіла, гэта азначала, што малако трэба выпіць.

– Дзякую, я яшчэ пасплю.

– Канешне-канешне, дачушка. Я толькі вось што табе хачу сказаць: пакуль я буду на рабоце, ты спі сабе, адпачывай. Суседзі не ведаюць, што ты прыехала, ніхто цябе не патурбуе.

– Добра-добра, – ужо засынаючы, адказала я.

Прачнуўшыся амаль што ў поўдзень, я шпарка пабегла ў кухню, адкуль цягнула неапісальна смачным водарам блінцоў.

– Вось і разумніца, якраз ужо і яешня падаспела, сядай снедаць.

– Мамачка, ты ўжо і напрацавалася, і снеданне прыгатавала, а я ўсё сплю, мне сорамна, – сказала я, уладкоўваючыся ля стала і не могучы адвесці вачэй ад аранжава-жоўтых выпукласцяў яечні.

– Яшчэ чаго, сорамна ёй! Ты там на сваёй вучобе напрацавалася. Цэлы тыдзень адсыпайся, а то перад суседзямі няёмка, так ужо ты схуднела ў тым Мінску. Могуць падумаць, што хворая.

– Матулечка, вы тут ужо ад моды адсталі, быць худзенькай – гэта ж прыгожа, – гарэзліва заўважыла я.

– Але-але, яшчэ што-небудзь прыдумай – мода. Ты б бачыла, як добра выглядаюць Іра з Нінай (гэта мае аднакласніцы-суседкі). Праўда, Ніна – проста прыгожая, а Іра – не наглядзецца: і сакавітасць, і прыгажосць!

– Ах, вось як! А хто мне ўвесь час казаў «прыгажуня мая»? – паспрабавала я жартоўна пакрыўдзіцца.

– Так, казала, і цяпер кажу – толькі трэба крышачку шчокі за канікулы наесці. А што тычыцца дзяўчат, дык яны таксама прыгажунямі сталі, за год так выліняли...

Далей ужо слухаць гэтыя разважанні не было аніякай моцы – ад смеху аж займала дух. Гледзячы на мяне, мама таксама звонка засмяялася і стала зразумела, чаму яна мне раіла адсыпацца цэлы тыдзень і не сказала суседзям, што я ўжо дома – трэба было паспець «наесці шчокі».

Многа гадоў прайшло з той пары. Я ўжо сталы ўрач-педыятр. Заўважаючы, як часам усяго адныя летнія канікулы дзяўчынак-падлеткаў, выглядаючых у час хуткага росту, як худыя кураняткі, пераўтвараюць у прыгажунь, успамінаю тыя мае першыя студэнцкія канікулы. «Выліняла,» – з цеплынёю думаю я, размаўляючы з чарговай маладзенькай наведвальніцай. Ні ў адным медыцынскім выданні я так і не знайшла больш трапнага выразу для адлюстравання гэтых дзівосных зменаў.

## Дымящаяся пустота

Перед глазами замелькали строчки на экране телевизора. «Что же это такое? Неужели опять пропустила очередную серию? Так оно и есть,» – убедилась я, взглянув на часы. Не заметила, как отвлеклась от сериала и опять мысленно анализировала моменты рабочего дня и последнего дежурства. «В следующем месяце не буду столько дежурить, будет легче, коллега вернётся с учебы. А то – никуда не годится, не могу от одного дежурства отдохнуть, как уже на следующее заступать нужно. Вот и сериалы «мимо проплывают»,» – думала я, представляя, с каким удовольствием улягусь в постель, подложив под ухо любимую подушку. Так и сделала.

Тихо. Машин за окном уже почти не слышно, тихонько отсчитывая секунды, не спят наши старые часы. Мне тоже не спится. «Всё же хорошо: домашние, слава Богу, здоровы, на работе всё идет своим чередом, сложностей на дежурстве тоже не было, что же мешает уснуть? Ну, не усталость же, может я что-то не сделала?» – думаю я, пытаясь в очередной раз просчитать до ста. В памяти проплывали лица, слова, обрывки фраз...

Заполнила необходимые документы, замечаю как «клюет носом» наша новая санитарка, молодая совсем, не привыкла еще всю ночь бодрствовать. Я тоже мечтаю присесть, направляясь к ординаторской, чтобы хоть на некоторое время снять с ног туфли. Слышу странные звуки – похоже, кто-то тоже не спит, у молодых мам это бывает. «Поговорите со мной, пожалуйста, доктор, у меня нет сестры, я совсем запуталась». Смотрю на часы в конце коридора – ровно три. Заметив мой взгляд, собеседница, молодая и красивая женщина из пятой палаты, тихо сказала: «Мне очень, очень

нужен Ваш совет, выслушайте меня, я ведь даже маме не могу позвонить, уснуть не могу». Открываю дверь ординаторской, переобуваюсь в удобные тапки, приглашаю женщину присесть в кресло. «Знаете, Вам ведь спать нужно, силы восстанавливать,» – говорю я, тут же ощущая нелепость этой фразы, ведь понятно, что ночью всем нужно спать, если сможешь уснуть. Круги под глазами, усталый и одновременно тревожный ее взгляд, говорили сами за себя. «Я Вас готова выслушать, если только в отделении будет спокойно и меня не позовут». Пытаясь поправить непослушные кудрявые волосы, она тихо сказала: «Я постараюсь быть краткой...»

«Как же мне жить дальше? Так хочется, чтобы рядом была мама. Что сделать, чтобы она меня простила, позвонить? Не могу,» – сказала Инна (так звали мою ночную собеседницу) и опустила голову, закончив свой рассказ.

Я смотрела на нее и ощущала, что эта хрупкая молодая женщина за несколько дней прошла, возможно, самый трудный путь в своей жизни, путь к себе, чтобы понять, с какой ношей следует идти дальше, что важно, а что – нет. «Вы уже знаете, как жить. А маме напишите письмо, расскажите обо всём, как сегодня мне. Она обязательно приедет,» – сказала я.

И Инна написала:

«Здравствуй, мама!

Так давно не писала тебе, что сомневалась, смогу ли отправить это письмо. Ты удивлена? Я целую неделю не звонила, не отвечала на твои звонки. Просила Саню ни о чем тебе не рассказывать. И для меня самой было достаточно времени, чтобы всё вспомнить, подумать. Незнакомые мне тревожные чувства вины и ответственности нахлынули вдруг непреодолимой волной. Я поняла, что мне нужно рассказать тебе всё, о чем я совсем недавно не утруждалась даже задуматься.

Очень страшно писать это тебе, мамочка, но вторая моя беременность закончилась не совсем благополучно: я родила недоношенную девочку. Она очень слабенькая, сердце сжимается от боли, когда я смотрю на нее через стекло кювеза. Врач сказала, что ситуация очень серьезная, у нашей дочки порок сердца (вероятно, мои испорченные куревом сосуды не обеспечили ребенку достаточного питания).

Но мы с Сашей надеемся на ее выздоровление, на то, что я смогу услышать слово «мама», и ты будешь славной бабушкой...

Сложно писать тебе то, о чем я думала в последнее время, но и не написать уже невозможно.

Мамочка, помнишь, в 9 классе, после выпускного, ты спросила у меня: «Дочь, ты не куришь случайно? Что-то дымом попахивает твоя куртка». Я «искренне» тебе соврала, сказала, что курят мальчики из нашей компании. А потом и Наташкина мама как-то подсела к нам вечером и долго рассказывала о печальных последствиях сигаретного пристрастия. Мы слушали, не смущаясь, а потом обсудили всё между собой и решили, что это всё родительские преувеличения, перестраховка, желание сделать из нас «кисейных барышень». Время-то сейчас совсем другое, мы боевые и задорные, и так «клёво» и «круто» под дымок сигареты вести беседы-диалоги, засиживаясь вечерами в укромном местечке.

Время шло, и если в школьные годы такие ситуации бывали 1-2 раза в неделю, то, став самостоятельной, я даже перестала скрывать, что курю, не прятала сигареты (правда, закурить в твоем присутствии так и не осмелилась). Ты грустила, пыталась вразумить меня, а я отшучивалась, говорила, что при совместном перекуре на работе мне проще знакомиться с парнями, что замуж-то надо выходить. Помню, что однажды, чтобы

разрядить обстановку я даже пропела тебе строчки из песни Е. Ваенги «Снова стою одна, снова курю, мама, снова» и просила тебя не переживать, т.к. таких, как я – много, ничего в том страшного нет, при необходимости, от этой привычки можно отказаться. Как же я ошибалась...

Мужа-то я себе нашла, но от привычной сигаретки отказываться не стала, даже когда поняла, что беременна. Правда, курить продолжала тайком, чтобы не огорчать Санечку. Врачу сказала, что вредных привычек у меня нет. Беременность продлилась 13 недель. «Ну, и что ж такого, – подумала я, – с кем не бывает? Я ведь еще молодая, всё впереди, еще повеселюсь, поживу для себя». Жизнь била ключом: друзья, рыбалки, путешествия. Совсем не хотелось задумываться о будущем, пытаться перестать курить, ну, в конце-то концов – я же не пачку в день выкуриваю!

Новая беременность случилась как-то неожиданно, застала меня врасплох, но твердая позиция Саши на появление ребенка заставила меня стать серьезнее. Усилием воли я часто заставляла себя выбросить закуренную сигарету, но сразу перестать курить так и не сумела, периодически привычка побеждала. С беременностью всё было нормально. Мы радовались, но, как видишь, беда поджидала впереди...

Теперь мне очень страшно за мою девочку, мне совсем нечего сказать мужу. Знаешь, мама, хочется спрятать голову под подушку, когда я слышу плач здоровых детей, как нежно приговаривают им что-то мамы. У меня в палате жуткая и страшная тишина, моя девочка не может громко плакать. Почему-то опять приходят в голову слова из той же песни: «А вокруг тишина, взятая за основу». Я не хочу такой страшной тишины, в ней пустота и дым. Я молюсь о том, чтобы услышать голодный крик моей малышки и прижать ее к груди.

Прости меня, мамочка, и помоги стать лучше. Приезжай, я очень жду. Пока.

P.S. Если можешь, прочитай это письмо девочкам из 15 квартиры. Я видела их летом с сигаретами в «укромном уголке» нашей бывшей школьной компании».



## Подых дзяцінства

Шыны мякка краналіся свежапакладзенага дарожнікамі асфальту. Я еду па зусім новай і, адначасова, даўно знаёмай дарозе, еду дамоў – туды, дзе прайшло маё дзяцінства, дзе жылі мой дзед і прадзед, мае бацькі. Апошні паварот – і за акном машыны пачынаюць мільгаць вялічэзныя сосны і бярозы дзівоснай прыгажосці, падросшыя і вабныя, нібы дзяўчаты на выданні. Ад захаплення разгубілася, бо не адразу змагла іх пазнаць, даўно не бачыла. Міжвольна прытармажваю, бо гэтак невыцерпна хочацца адшукаць іх ранейшыя знаёмыя рысы і добра разгледзець новыя – тыя, якія з'явіліся без мяне. А вось і тая сцежачка, па якой мы бегалі да бабулі, у суседнюю вёску. Зусім не шырокая, ледзьве прыкметная, а ўсё ж, і цяпер па ёй можна побач прайсціся ўдвух, пяшчотна пабраўшыся за рукі.

Шырокай хваляй наплываюць успаміны, парушаюць душэўны спакой, і ўсе мае намаганні не здолелі перамагчы жадання спыніцца. Выходжу з машыны, каб хоць колькі хвілін пастаяць і абудзіць свой розум успамінамі на гэтай дарагой сэрцу сцежачцы. «Трэба ехаць, нельга затрымлівацца,» – думаю я, імкнучыся звалодаць з усім гэтым наляцеўшым з глыбінь душы пачуццём і непрадбачна з'явіўшымся подыхам мінулага. Але чаму ж балюча стала на сэрцы, няўжо так моцна сядзяць у душы юнацкія пачуцці? Ногі, незалежна ад майго жадання, пайшлі да бярозы. Погляд спыніўся, і я, баючыся паверыць сваім вачам, ужо кранала плоскую паверхню каменя побач з памужнеўшым яе ствалом. Як быццам і не было гэтых дваццаці гадоў... Канешне ж, гэта той самы камень, на якім я стаяла і, закінуўшы галаву, спрабавала разгледзець кавалачак неба сярод шырокіх кронаў лясных гаспадынь. А ты, такі мужны і

прыгожы, усхвалявана распавядаў мне пра падзеі тых пяці гадоў, што мінулі пасля школы, вельмі старанна абходзячы афганскі перыяд вайсковай службы (цяпер я ўжо разумею, чаму). І зусім неспадзянкай сталі словы аб каханні да мяне, якое дапамагло табе выжыць на вайне, і аб жаданні быць заўсёды разам. Я слухала і не магла зразумець, чаму ты гаворыш аб гэтым зноў, мы ж на выпускным балі дамовіліся ніколі больш не кранацца гэтай тэмы. Саступіўшы з каменя, я слухала і адчувала, як боль, які ўвесь гэты час хаваўся ў глыбіні тваіх шэрых вачэй, усплыў і разам з кожным словам балюча кранаў маё сэрца. «Цяпер ты ведаеш ўсё». Пасля гэтых слоў раптоўна аглушальнай стала цішыня. Перамагаючы сама сябе, я толькі здолела сказаць: «Не, мы па-ранейшаму застанемся сябрамі». Як жа цяжка было вымавіць гэтыя словы ў адказ табе, майму лепшаму і вернаму абаронцу, адчуваючы, што робіцца ў цябе на пакалечаным вайной сэрцы. Але інакш адказаць я не магла: мае мроі былі адданыя другому.

Дамоў вярталіся моўчкі, ужо неяк няёмка стала трымацца за рукі. Развіталіся і не ведалі, што больш ужо ніколі не сустрэнемся. Я хутка стала замужняй жанчынай і маці. Ажаніўся і ты, толькі парадавацца жыццю не паспеў: наступствы вайны хутка забралі здароўе, а потым і жыццё... «Усё, далей успамінаць проста немагчыма». Стаўшы, як некалі, на камень, я ціха прашаптала: «Дзякуй табе, мой добры і сапраўдны рыцар, за каханне, за букеты першых вясновых кветак на школьнай парце, за даверлівыя размовы аб жыцці, за адчуванне бяспекі побач с табой, і за тое, што ты ўмеў разумець сэрцам. Даруй мне, што сказала гэтыя словы толькі цяпер, калі ўжо знаю, які боль часам дасылае каханне». Паціху знікла хваляванне – мабыць, таму, што я здзейсніла тое, што павінна была зрабіць яшчэ тады, дваццаць гадоў назад. Відаць, у жыцці для

ўсяго бывае свой час, мы не можам убачыць у другім чалавеку тое, чаго зусім няма ў нас.

Саджуся ў машыну і, аглядаючыся на бярозу, уладальніцу таямніцаў некалькіх пакаленняў, ціха ад'язджаю, рухавік машыны быццам сам неахвотна набірае абароты. Разумее штосьці! Неўзабаве пад'язджаю да вёскі і пранізлівым позіркам хутка адшукваю страху з самымі высокімі комінамі-дымаходамі. Дзіва, ды і толькі – яны і зараз белыя, нібы маякі для тых, хто вяртаецца дамоў. Гэты іх выгляд заўсёды падабаўся маме, яна ганарылася, што нашу хату па комінах можна пазнаць здалёк.

Яшчэ вельмі рана. Пакінуўшы ўсе і тэрміновыя і планавыя справы, вырашыла хоць адзін дзень падыхаць паветрам маёй «малой радзімы». Выехала ноччу, каб паспець пачуць і ўбачыць вясеннюю непаўторную прыгажосць ранішняга абуджэння маленькай вёсачкі, асалоду якога нельга забыць нікому, каму пашчасціла гэта паспытаць. Чаму з гадамі так невыцерпна цягне чалавека ў мясціны, дзе ён нарадзіўся, дзе прайшло яго дзяцінства? Вучоныя кажуць, што ўсё проста можна тлумачыць аднолькавасцю хімічнага і фізічнага стану вады цела чалавека і той мясцовасці, дзе ён нарадзіўся: гэтая вада яго як бы аднаўляе. Я згодна з гэтым меркаванем, бо сапраўды, няма нічога больш падбадзёрлівага, як кубак вады, выпіты з дарогі ў роднай хаце. Але ж ці толькі ў фізіцы і хіміі справа? А можа, мы ідзем, едзем, плывем, ляцім дамоў таму, што ўзнікае пачуццё патрабавальнай неабходнасці хоць ненадоўга апынуцца на сцежцы ў сваім двары, у тым асяроддзі любові, дзе, як дзецям, нічога не патрэбна рабіць, каб быць любімымі і дасканалымі, дзе ніхто не будзе прыцэньвацца, што ў цябе добра, а што дрэнна, што правільна, што – не, дзе ўсё будзе «як дома». Гэтыя хвіліны, як перадых на складанай дарозе жыцця, ратуючая магчымасць аднавіць сваю дасканаласць, якую

мы страчвалі, асільваючы дарослую навуку жыцця без любві. Яны – вялікая частка здольнасці да разумення таго, што ніколі не позна сябе пераіначыць...

Паціху пад'язджаю, стараючыся не збудзіць шматлікае сямейства маёй сястры Вольгі, цяперашняй гаспадыні бацькоўскай сядзібы. Не атрымалася. Яна ўжо каля веснічкаў – у вёсцы на ранішняй зорцы нават ціхі гук матора чуецца вельмі добра. Абдымаемся, выціраючы адна адной слёзы радасці.

– З вяртаннем дамоў, заходзь, калі ласка, у хату, – шэпча Вольга,

– Пачакай, дай трошкі агледзецца, найперш на цябе самую паглядзець.

– А што са мною зробіцца? – усміхаецца яна. – Мы людзі вясковыя, жыццё не падганяем, гады разменьваем цішэй, чым вы ў горадзе.

І ў гэтых словах Вольгі была рацыя, бо яе выгляд сам за сябе ўсё казаў – сястра заставалася ўсё той жа маладой жанчынай, якой была, калі вярнулася дамоў, каб па размеркаванню працаваць настаўніцай у школе суседняй вёскі: статная і гладкая, з ружовым тварам, уважлівым і спакойным поглядам сініх вачэй – сапраўдная вясковая прыгажуня. Не згаворваючыся, абходзячы духмяныя кусты бэзу, накіроўваемся ў наш вабны сад і ад здзіўляючага захаплення змаўкаем. Там, між здатных постацяў яблынь, прынакрыўшых свае кучаравыя галовы і далікатныя плечы тонкімі бела-ружовымі шалямі з жывых кветак, раскінуўся вялікі, зялёны, з малахітавым адценкам ад кропляў расы, травяны дыван. Пакінуўшы абуўку на дарожцы, як быццам баючыся пашкодзіць гэтую прыгажосць, басанож ступаем на траву, і радаснае захапленне авалодвае абедзьвюма. Здаецца, што падняўшы рукі ўгару, цяпер здолееш дакрануцца да блакітных нябёсаў, ужо ружовых ад узыходзячага сонца, першыя праменьчыкі якога ласкава заглядаюць пад



вейкі нашых вачэй, дорацць пазалоту кроплям расы на траве і на нашых нагах. Чароўнае адчуванне бяспекі і волі цалкам авалодвае мною, у падзяку за якое хочацца дакрануцца да кожнай яблыневай кветачкі, каб падзяліцца прыгажосцю гэтых хвілінаў радасці.

«Пойдзем дамоў!» – кліча мяне сястра, змерзнеш, на світанні яшчэ халадна. Прыцішаныя і ўзрушаныя пачуццём прысутнасці ў цудзе нараджэння новага дня, вяртаемся. Павольна, як быццам упершыню, разглядаю родную хату. Тыя ж памалёваныя ў белы колер вокны, той самы вялікі наш стол – пасярэдзіне ганку. Адразу ўзгадваю ранішнія сняданні ўсёй сям'ёй у святочныя ці выхадныя дні, калі ніхто нікуды не спяшаўся. «А гэта што за цуд?» – ад здзіўлення аж прысядаю на драўляны прыступак ганку: маленькая ёлачка, якую калісьці пасадзіў старэйшы брат, зрабілася вялікай, да паловы страхі ёлкай. Заўважыўшы маё здзіўленне, Вольга з ноткамі суму ў голасе прамовіла :

– Так і мы пасталелі побач з ёй… А памятаеш, як раніцай у дзень твайго семнаццацігоддзя на гэтай, тады маленькай ёлачцы, я знайшла букет з паштоўкай? Чамусьці адразу вырашыла, што гэта для цябе, і не памылілася. Ты і да гэтага часу не ведаеш, хто яе тады даслаў?

– Цяпер ужо ведаю, – ціха адказала я.

Мая мудрая сястра адчула немагчымасць далейшай размовы на гэтую тэму. Хацелася проста моўчкі пасядзець у ранішнім ціхім роздуме.

Але цішыня панавала нядоўга. Прачнуліся дзеці, іх у сям'і чацвёра: дзве дзяўчынкі-харашуні і двое непаседлівых хлапчукоў. Весела віталіся, радаваліся майму прыезду, адзін перад адным хваліліся падарункамі, пра ўсё распытвалі. За паўгадзіны я ўжо ведала ўсе вясковыя навіны, разгледзела адзнакі ў дзённіках, паабяцала падлячыць хворае кацяня цёткі Ганны. Снедалі, як

заўсёды, «цяжка» па меркаванню ўсіх гарадскіх дыетолагаў – блінцамі з яешняй, смятанай, мёдам. Пачуўшы, як я нахвальваю незвычайны смак вясковых яек, малодшы пляменнік дзелавіта параіў прыладзіць кошык пад страхой у нас на дачы, каб туды таксама нesліся куры, паабяцаўшы сваю дапамогу ў гэтай справе, а таксама ў вырошчванні куранят у наступаючым летнім сезоне. Адным словам, гаспадар. Дамовіліся.

Дзень прайшоў у расслабляльнай цеплыні, адчуванай толькі побач з роднымі. Усе клопаты па гаспадарцы на сёння ўзяў на сябе Сяргей, муж маёй сястры, таксама настаўнік, добры і гаспадарлівы чалавек. Разумеючы шчаслівасць імгненняў, ён даваў нам, сёстрам, магчымасць даўжэй пабыць разам. Як на экскурсію, хадзілі ўсім гуртам на пасеку, першыя вуллі для якой набываў яшчэ мой прадзед. У кожнага з пасекай былі звязаны свае прыгоды, часам вельмі смешныя, але заўсёды балючыя, пчолам жа не скажаш «не». Кожны ўзгадваў штосьці сваё, і ад гэтага нам было яшчэ весялей. На хвілінку, каб павітацца, пабачыцца і загутарыць, накшталт, «як маешся», забягалі нашыя суседзі. Ад усіх гэтых падзей, ад магічнага ўздзеяння подыху дзяцінства, які адчуваўся і ў ласкавых поглядах сястры, і ў даверлівых шэптах дзяцей, і ў знаёмых гуках вясковых раніцы, дня, наступаючага вечара страчвалася пачуццё часу, хвілінамі здавалася, што я заўсёды была тут. Было вельмі радасна адчуваць сябе часткай працяглага жыцця нашай сядзібы, аддаваць цалкам улюбёнасць сэрца яе насельнікам і разумець зусім новы бок сэнсу жыцця, аб якім яшчэ ўчора нават і не здагадвалася...

Можа, менавіта дзеля гэтага існуе стары дом, у кожнага ён свой, напоўнены сталасцю ўзнёслых і адначасова зусім простых і зразумелых чалавечых пачуццяў, дзеля якіх мы ідзем, едзем, плывем, ляцім да яго, каб бясконца вучыцца перадаваць іх нашым дзецям...

## Простая гісторыя

У чарговую камандзіроўку збіралася з настроем. Даўно нічога асаблівага не здаралася, усё, як заўсёды: праца-магазін-дом. Ні табе якіх вяселляў у радні, ні юбілеяў, ні наваселляў, нават і ў адведкі ў гэтым годзе ні да каго не хадзілі. Можа, год выдаўся такім, зусім без феерверкаў. Канешне, яно і добра, калі ўсё ідзе як ідзецца, але ж ужо такая бзыкаватая наша жаночая натура – падавай ёй святы. А калі падумаць, то і праўда: без святаў неяк зусім шэра, «выхадныя» сукенкі ў шафе засумавалі – рэчы, як і людзі, абыякавасць кепска пераносяць, не падабаецца ім, калі аб іх існаванні забываюцца...

А паеду я спачатку электрычкай да райцэнтра, потым аўтобусам да невялікай вёскі, дзе мне трэба будзе амаль тры летнія месяцы працаваць у бібліятэцы, бо тутэйшая бібліятэкарка выйшла замуж, а зачыняць такую ўстанову культуры і асветы нельга. Справа ў тым, што побач з вёскай да восені будзе дабудаваны вялікі малочны комплекс, дом с кватэрамі для прыезджых спецыялістаў таксама хутка прыме камісія, так што жыццё забурліць, а без бібліятэкі ў вёсцы немагчыма. У верасні начальства паабяцала маладога спецыяліста даслаць, а пакуль што падтрымліваць культурны ўзровень жыхароў прыйдзецца мне, не вельмі маладой, але ўсё яшчэ сумуючай без святаў, жанчыне. Канешне ж, я не адразу згадзілася ехаць, начальніца два разы мяне да сябе ў кабінет выклікала, каб расказаць аб перавагах вясковага жыцця, асабліва летам. Дзіўная яна жанчына, хоць і начальніца, ці мне аб гэтым распавядаць трэба, я ж ў вёсцы да шаснаццаці гадоў жыла, пакуль што не паспела пра гэтыя перавагі забыцца. Каму, канешне, і перавагі, калі на адпачынак прыехаць, каб ягады ці

грыбы збіраць, у рэчцы купацца, паветрам чыстым дыхаць, піць ранкам сырадой, а каму – сем дзён на тыдні праца, бо кожны, акрамя работы, мае яшчэ сваю гаспадарку, якая патрабуе немалых клопатаў, калі хочаш добра жыць. Я не згаджалася адразу спецыяльна, каб ніхто не зразумеў, што, на самай справе, мне вельмі хочацца пераменаў, а пах вясковага язміну нават у снах пачала адчуваць. З трэцяй размовы згадзілася, на радасць кіраўніцтву, хутка аформіла паперы, і во – еду...

Аб тым, што ў вёсцы хутка сапраўды пачнуцца змены да лепшага, было зразумела ўжо па якасці дарогі, бо была яна добра адрамантавана, аўтобус толькі злёгку пакалыхваўся, імчаў, як па еўрапейскай аўтастрадзе. Страчала мяне будучая гаспадыня, Ганна Сяргееўна, у яе і жыла мая папярэдніца, пакуль не змяніла прозвішча на мужава і не з'ехала ажно ў далекі Мурманск, дзе на вахце працаваў яе наканаваны. Спадабаліся мы адна адной, відаць, з першага погляду, бо, хутка папіўшы кавы, не згаворваючыся, направіліся аглядаць мясцовыя славутасці і маё новае месца працы. Ключы ад бібліятэкі і дадзеныя інвентарызацыі аб маючымся кніжна-часопісным фондзе былі ў Ганны Сяргееўны – ёй, як паважанаму чалавеку, пенсіянерцы настаўніцы гэта ўсё даверыў сам загадчык раённага аддзела, як, дарэчы, і мяне. Што майго прыезду вельмі чакаюць і ўтульны пакой для пражывання ўжо падрыхтаваны, ён паведаміў мне ўчора па тэлефоне і, ці не дзіва ў наш час, – я ўжо адчуваю, што гэта праўда. Давер у вёсцы – справа дзейсная...

Дом Ганны Сяргееўны, па вясковых мерках, быў немалы. Тры ладныя пакоі, акуратная кухня з сапраўднай вясковай печчу. Калісьці тут жыла вялікая сям'я: яны з мужам, франтавым фельчарам, і чацвёра іх дзяцей. Жылі ў згодзе паміж сабой і з вяскоўцамі – хто лячыў, хто вучыў. За доўгае жыццё побач адолелі і су-

межныя спецыяльнасці (чаго, дарэчы, ад нас на рабоце ўжо другі год патрабуюць невядомыя нам, таямнічыя «вышэйстаячыя органы»), у патрэбны час маглі падмяніць адзін аднаго прынцыпам «хуткай дапамогі». Але муж памёр, адзін сын у Афганістане загінуў, астатнія дзеці разляцеліся, хто куды. «Жывуць усе па-людску, маюць добрыя прафесіі, мяне да сябе клічуць, але я нікуды з дому не рыпаюся, сэрцам прырасла да гэтай вёскі, загадала і пахаваць мяне на тутэйшых могілках. Але не будзем пра сумнае. Самая вялікая каштоўнасць майго жыцця ў тым, што ўнукі на канікулы прыязджаюць. У нас з імі ёсць сур'ёзная дамова – размаўляем толькі па-беларуску. Калі хочаш, далучайся да нас, падпішам «дадатковае пагадненне»,» – весела бліснуўшы вачамі, закончыла свой расповед мая гаспадыня. «Вось жа пашчасціла, я ж якраз надумалася, што апавяданне пра гэтую цудоўную жанчыну напішу, з унукамі будзе добры заварот,» – падумала я і з радасцю, у знак згоды, пацiснула рукі Ганне Сяргееўне і Сашку з Дзімам – удзельнікам дамовы з другога боку, якія разам з намі за вячэрай з ахвотай уплёталі бульбачку, палітую смажаным сальцам, сюды-туды пацягваючы з кубкаў кіслае малачко. У нашу размову з бабуляй не ўмешваліся, але я заўважыла, як уважліва, стараючыся зрабіць гэта па-дзіцячы непрыкметна, яны прыглядваліся да мяне. Знаёмая на вёсцы сітуацыя, заўтра ж трэба будзе даць паказанні ўсім зацікаўленым маім прыездам асобам. Разумныя вочы васьмігадовых стрыечных братоў надавалі мне ўпэўненасці, што лішняга наконт мяне будзе сказана не шмат.

Пра тое, што я пачала пісаць невялічкія апавяданні «пра жыццё» не ведае яшчэ ніхто. «Добра, што пра сваю задумку сёння толькі сабе прагаварылася, вельмі ўжо перад гэтай лагоднай жанчынай пахваліцца хацелася, язык свярбеў, утаймоўваць яго воляй давялося,» – па-

думала я і пра ўсё забылася, бо хваля сну накаціла на мяне адразу, як толькі я апусціла галаву на пахнучую сонцам і свежым паветрам падушку, не даўшы нават часу зняць з вуснаў усмешку – прыкмету радасці быцця сённяшняга дня. А, па вялікаму ліку, чаму і не заснуць з расцягнутымі вуснамі, хто мяне, такую не сур'ёзную, убачыць ноччу, акрамя месяца ў акне? (А што зробіш?) Заснула...

Як добра, што сёння субота, паспею прывыкнуць спачатку да новых жыццёвых абставін, а з панядзелка ўжо займу пасаду, пачну прывыкаць да новай работы. Паслядоўныя змены лепш пераносяцца, чым раптоўныя. Ганна Сяргееўна з першым аўтобусам паехала да сястры мужа ў суседню вёску, мяне даручыла сваім няўрымслівым унукам, а іх – мне. Ужо з сямі гадзін раніцы адчувалася іх гарачае жаданне хутчэй са мной павітацца – перыядычна за дзвярамі майго пакою паскрыпвалі палавіцы. Трэба ўставаць, тут табе не сталіца, у ложку часопіс не пагартаеш.

Вырашылі, што хлапчукі мне пакажуць рэчку. Чаму б не? Гэта цудоўна, можа яшчэ і паплаваем. Паціху зрушыліся. Звычайна ісці па сцяжынцы ў іхнім узросце немагчыма, іх фізіялогія патрабавала выхаду энергіі. Браты то падскоквалі вакол мяне, распавядаючы аб сваіх прыгодах, то пераганялі і хаваліся наперадзе ў хмызняку, які свежай зелянінай дзівосна аздабляў сцежку да ракі. З гэтай нагоды рухацца мне давялося амаль што подбегам. Яно і добра, а то ўжо засядзелася.

А рака аказалася сапраўднай прыгажуняй. З нашага боку бераг круты, адразу глыбіня, супрацьлеглы – пакаты, з дробным пясочкам уздоўж, ляжы сабе і грэйся, калі маеш жаданне пераплысці раку. Адпачнем, падумаем. Селі на траву і пачулі, як маладыя дубочкі з красунямі соснамі шапочуць. Ну, і няхай сабе пашэпчуцца, мы перашкаджаць не будзем, пасядзім трошкі,

на рачныя хвалі паглядзім, ды і дамоў заварушымся. Купацца ніхто не асмеліўся, надта ж вада халодная.

Вяртацца хлапчукі прапанавалі іншай дарогай, лясной. «Ісці далей прыйдзецца, але там вакол дарогі вельмі прыгожы лес, Вам спадабаецца. Ягад пашукаем, мо ўжо і паспелі,» – наперабой трашчалі яны. Што заставалася рабіць – згадзілася, не кожны ж дзень дзетвара хоча прадэманстраваць хараство свайго краю, зрабіць чалавеку тое, што яму спадабаецца. Канешне, дамовіліся, што не заблудзімся, і тыя рашуча паабяцалі.

Хлопцы праўду казалі – прыгожыя тут мясціны. Лес змешаны, але перавага была за соснамі. Яны растуць не надта густа, роўныя, як салдаты на парадзе. Пад нагамі шмат ягадніку, лясных кветак. Галава ажно кружылася ад непараўнальных дрэва–травяна–кветачных водараў, якія не проста адчуваліся носам, а захапілі нас цалкам, сталі на хвіліны часткай істоты, як быццам шапталі кожнай клетачцы: «Усё для цябе, пі асалоду, радуйся». Радаваліся. Якія цудоўныя дні нечакана дае нам лёс!.. Можна зразумець Ганну Сяргееўну: ад такой прыгажосці адарвацца складана.

Праз якую гадзіну мы з падсіненымі губамі (пакаштавалі задобра спелых чарніцаў) ужо крочылі па лясной гравейцы. Размаўляць чамусьці не хацелася, слухалі птушыныя спевы. Пачулі гук матора. За хвіліну з намі параўнялася бліскучая сіняя «Audi», спынілася. Браты, на момант зусім забыўшыся на мяне, павіслі на ўладальніку машыны, які лёгка выпрастаўся побач, нібы саскочыў з сядзення, трымаючы пад пахамі абодвух хлапчукоў.

– Гэта наш хросны – дзядзька Іван, не хвалюйцеся, ён харошы, – наперабой крычалі яны, дрыгаючы нагамі ў паветры.

– Каб не хвалявацца, хутчэй трэба знаёміцца, – сказаў хросны, паставіўшы дзяцей на ногі.



– Мяне Вы ўжо ведаеце, а як Вас завуць? – я яшчэ і рот не паспела адкрыць, а непаседлівая моладзь ужо гучна дакладала.

– Гэта цёця Света, бібліятэкарка, у бабулі жыве, учора прыехала. Мы на рэчку хадзілі.

Вычарпальная інфармацыя, дапаўняць не давялося.

Ехаць у добрай машыне з прыгожым чалавекам, па чароўнай дарозе, з мілай дзятвой было прыемна (злавіла сябе на думцы аб невытлумачальным мностве прыгажосці ў бягучы момант і, аднёсшы гэты парыў душэнай радасці на ўздзеянне пахаў траў, супакоілася).

Сядзячы на заднім сядзенні побач з Сашкам, я ўвесь час намагалася думаць аб чымсьці важным, але ўсе думкі ляцелі прэч, і так хацелася проста глядзець на дарогу і ўсміхацца. Глянула ў люстэрка на вадзіцеля, заўважыла, што ў яго вельмі бліскучыя вялікія цёмныя вочы (у каго ж я такія бачыла?) і тое, што ён гэтымі вачамі штораз усхвалявана зыркае ў мой бок. Крыху прыгладзіўшы свае разгуляўшыяся за дзень валасы, вырашыла надалей не ўсміхацца, каб скласці ўражанне сур'ёзнай, нечакана з'явіўшайся пасажыркі. Даехалі спрытна і хутка. Гаспадыня яшчэ гасцявала, а чаму ж не пагасціць, унукі пад наглядам, а апошні аўтобус будзе а шостай гадзіне вечара. Мы з маладым пакаленнем таксама галадаць не збіраліся – яешанька з цыбулькай толькі мільганула, добра знайшла дарогу да страўнікаў, тым больш апасля нашага невялікага падарожжа. Анікога ўгаворваць не спатрэбілася. На вуліцы прыцямнела ад хмараў – дождж, відаць, будзе. Вырашылі трошкі на канапах паляжаць, у тэлевізар паўглядвацца. Паснулі…

Ганна Сяргееўна агучыла, што сённяшні вечар аб'яўляецца святочным, бо да нас прыйдзе паважаны госць – Іван, хросны бацька ўнукаў. «Ён ненадоўга завітаў па справах, вячэраць будзем разам. Вось жа,

даседзелася да вечара, старая недарэча, зараз ужо часу зусім мала, «цопу-лопу» нічога асаблівага не прыгатуеш,» – бедавала з гэтай нагоды мая гаспадыня, заглядаючы ў халадзільнік. І тут святочнае хваляванне агарнула і мяне. Пасля хвіліннага роздуму прапанавала спячы смачны пірог з вішняй, якая, ужо размарожаная для кампоту, стаяла ў халадзільніку. На пытлівы позірк Ганны Сяргееўны ўпэўнена адказала: «Паспею, смачны, мой каронны нумар, не падвяду. Дапамажы, святы Мікалай Цудатворца!»

Праз гадзіну за сталом, накрытым прыгожым саматканым вышытым абрусам, трое дарослых і двое хлапчукоў мірна размаўлялі, смяяліся, паспеўшы ўжо паласавацца смажанай сялянскай каўбаскай з бульбачкай. І вось, нягледзячы на позні час, усе мірна і уважліва чакалі пірага, які цудоўным чынам мужнеў і пунсавеў у духоўцы. Амаль адначасова яго усе спрабавалі, і той, як я і меркавала, аказаўся вельмі смачным. Пасля шчыра хвалілі мяне, дзякавалі, асабліва новы знаёмы Іван, які сядзеў насупраць, і яго чорныя вочы часцяком заглядаліся на мой твар. Было прыемна – такая ўжо мая залежная ад агульнага адабрэння натура. Усе разам правялі нашага госця да веснічкаў, а Ганна Сяргееўна клапатліва паклала на сядзенне ягонай машыны ўпакаваныя рэшткі пірага: «Паснедаеш раніцай, табе ж ніхто не прыгатуе».

Паехаў. З палёгкай уздыхнула. Здаўна падабаюцца моманты ад'езду задаволеных гасцей. Спаць, аб'еўшыся, не хацелася. Саша з Дзімам уляглiся. Не уключаючы святла, мы сядзім на верандзе з адкрытымі дзвярамі, размаўляем, удыхаючы пах летняй ночы. «Як калісьці дома з мамай,» – падумалася з болем.

Цяжка вызначыць, колькі прайшло часу, неяк адразу стала адчувацца напружанасць маўчання. Першай загаварыла Ганна Сяргееўна – яна ж амаль нічога

пра мяне не ведала: «Бачу, што ты ладная жанчына і душа ў цябе, па ўсім відаць, харошая. Ды, як тая цыганка, бачу сум у вачах, нават, калі ты смяешся. Вось і сюды прыехала не на дзень. На каго сям'ю пакінула, ці чакае хто цябе дома?» Хоць і было зразумела, што на гэтае пытанне новым знаёмым мне абавязкова прыйдзецца адказваць, а ўсё ж працягваць доўга размову аб сабе зараз не хацелася, таму я хутка адказала: «Не, муж мяне не чакае, мая сям'я – двое дарослых дзяцей, ужо маюць свае сем'і, а я – унукаў. Я абавязкова распавяду аб сабе болей, але не сёння». Пагадзіліся.

На правах добра выхаванай гаспадыні Ганна Сяргееўна пачала гаварыць праз сваю сённяшнюю паездку, потым пра нашага госця. Так я даведалася, што здароўе ў залоўкі яшчэ не дрэннае, хоць мае яна ўжо амаль восемдзесят пяць гадоў. А наш нечаканы наведвальнік Іван – сябра зяця, разам служылі на Далёкім Усходзе. Ён у мінулым спартовец, цудоўны трэнер, але зараз ужо яму зусім не да спорту, бо аднойчы атрымаў цяжкую траўму. Цяпер шчыльна і паспяхова займаецца конегадоўляй, для гэтага спецыяльна за мяжой вучыўся. Прыстойны чалавек, толькі адзінокі – яму жонка здрадзіла, знайшла замену, пакуль пасля траўмы лячыўся. З параненым сэрцам быў доўгі час. Зараз з маці жыве, паступова адыходзіць душой стаў: можа, коні яму добрую энергію даюць, надта ж ужо ён аб іх клапоціцца. Наведваецца сюды час ад часу, асабліва, калі дзеці тут гасцююць. «Ой, загаварыла я цябе зусім,» – глянуўшы на гадзіннік, занепакоілася мая апавядальніца. І мела рацыю – была палова другой гадзіны ночы.

Мяне зноў чакаў прыемны адыход да сну (мабыць, магічная падушка). Перад самай раніцай прысніла, як стаяла каля сасны на высокай гары – дзённыя лясныя харашуні, відаць, моцна сэрца кранулі. На снеданне былі варэнікі з тварагом і смятанай – смаката. Цудоў-



на пачалася вясковая нядзелька. Агульнай дамовай вырашылі, што на наступным тыдні спаць будзем уладкоўвацца своечасова, а ў нядзельку паедзем ранenька першым аўтобусам у царкву ўсе разам. Пагадзіліся адзінагалосна – і дарослыя, і дзеці. А сёння мне пакажуць вясковую новабудоўлю. Запрашалі на агляд бабуля з унукамі вельмі натхнёна, і я западозрыла, што ўбачу нешта зусім незвычайнае. Пайшлі. Будоўля, канешне, вялікая, але на нейкі момант я нават пашкадавала, што праз колькі гадоў тут ужо будзе зусім не такая ціхая вёска. Думку вырашыла не агучваць. Назад вярталіся няспешна, сёння ж спяшацца няма куды. Калі ўжо звярнулі на сваю вуліцу, то ўбачылі каля варот Іванаву бліскучую машыну. Занепакоілася Ганна Сяргееўна, дзеці пайшлі хутчэй, штосьці непрыемнае свербанула і па маім сэрцы – можа, што здарылася? Відаць па прадчуванню – здарылася, але нават сам лёс ніяк пакуль што не мог уцяміць – калі тое паспела?..

Павітаўшыся, накіраваліся да ганку. Перад уваходам Іван, штосьці ўспомніўшы, затрымаўся, потым вярнуўся да машыны. Было вельмі бачна, што той хвалюецца, напружана сам для сябе нешта вырашае. Вярнуўся з пакетамі і двума вялізнымі букетамі кветак – белыя ружы і ліліі. Умомант пакой напоўніўся чароўным водарам. «Саша, Дзіма, хадзіце сюды, тут вас чакаюць шакаладныя конікі. Малайцы, што павялі цёцю Свету па лясной дарозе,» – сказаў мяккім голосам, у якім усё ж адчувалася нейкае хваляванне. Падзякаваўшы за неспадзяваныя падарункі, здзіўленыя хлопчыкі пабеглі ў свой пакой. Мы з гаспадыняй пераглянуліся, адчуўшы, што гэта толькі пачатак якойсьці вельмі важнай для Івана гісторыі, бо ён з букетам ужо стаяў перад Ганнай Сяргееўнай. Не дазволіўшы ёй устаць, ціхім голасам вымавіў: «Дзякуй, што Вы ўмееце прыцягваць да сябе добрых людзей і што я маю магчымасць быць

побач з імі». На вачах жанчыны заблішчэлі слёзы. «Што здарылася, Іван, кажы хутчэй, ты што – развітваешся, з'язджаеш куды?» Іван няспешна падцягнуў крэсла да канапы, на якой мы сядзелі, сеў амаль насупраць: «А зараз, паважаныя жанчыны, паслухайце мяне, калі ласка, толькі не перабівайце, пытанні прашу падаваць у пісьмовым выглядзе,» – паспрабаваў нават усміхнуцца ён, але жарт не атрымаўся, наадварот, стала неяк няёмка знаходзіцца пад яго ўважлівым позіркам.

Усе падзеі гэтага моманту былі настолькі незразумелымі і невытлумачальнымі, што хацелася «сыйсці са сцэны», зрабіцца незаўважнай. А ён, між тым, пачаў свой расповед, і мы даведаліся, што даўно, яшчэ калі быў першакурснікам, на студэнцкай навуковай канферэнцыі ўбачыў дзяўчыну – сваю запаветную мару, у якую і закахаўся з першага погляду. Колькі разоў спрабаваў пазнаёміцца бліжэй, чакаў яе ля інтэрнату, але ўсё было марна. А сябры яшчэ з гарэзлівай усмешкай распавялі, што яна летам выходзіць замуж. Канешне, хіба ж можна не заўважыць і не пакахаць замоцна вось такую кучаравую, з яскравай чароўнай знешнасцю прыгажуню Святлану. А яе зялёныя звабныя вочы... Такая выпускніца! Не дзіва, што нехта спрытны хутка назаве яе сваёй жонкай і подбегам памчыць да ЗАГСу, не дагоніш апасля. «А што я магу даць ёй, пачынаючы студэнт? Толькі полымя пачуццяў, ды і тое – з аднаго боку,» – думаў тады. «Карацей кажучы, здаўся без бою, нават і ў галаву не прыйшло, што збірацца выйсці замуж – гэта яшчэ не быць замужам. Так яна і засталася ў маіх успамінах марай, казачным летуценнем,» – ціха вымавіў Іван. Памаўчаў трошкі і, гледзячы на мяне, працягваў: «Лёс вырашыў патурбаваць і выпрабаваць мяне наноў. Я ж і не планаваў заязджаць да вас у суботу, спяшаўся па справах. Не паверыў сваім вачам, калі ўбачыў сваю недасягальную Святлану на лясной дарозе

з хлапчукамі. Адмовіўся ад усялякіх справаў, напрасіўся да вас у госці. Хоць і здавалася гэта немагчымым, але ж я бачыў перад сабой усё тыя ж незвычайнаыя зялёныя вочы, тыя ж валасы, да якіх увесь час хацелася дакрануцца, тую ж плаўнасць рухаў – усё, як некалі даўно, быццам гады адступілі перад вечнай жаночай загадкавасцю. Адначасова зразумеў, што мяне ты зусім не памятаеш. З'ехаў. Ноч роздумаў. Я слухаў сваё сэрца і ўпэўніўся, што ты там, відаць, жыла заўсёды, а майму сэрцу было прыемна існаваць з жанчынай-марай, інакш – як бы я змог адразу адчуць цябе і пазнаць? І зараз я добра ведаю, што ў нашым жыцці не бывае выпадковых сустрэч. Не магу страціць цябе зноў, нельга памыляцца двойчы. І вось я тут. Стань маёй жонкай,» – павольна і вельмі ўпэўнена вымавіў Іван, працягнуўшы букет і схіліўшы галаву.

Я маўчала. Ганна Сяргееўна раптам адчула сябе лішняй пры гэтай размове, з пабялеўшым тварам яна ціхенька выйшла з пакою. Букет так і заставаўся ў Івана. «Дык вось чаму мне падаліся знаёмымі яго вочы, калі мы ехалі ў машыне. Але твар я яго зусім не памятаю, не разглядвала тады ўважліва. Ад далёкага знаёмства застаўся невыразны ўспамін, мае ж мары ў той час былі з другім,» – у думках размаўляла я сама з сабою. Устаўшы, прыняла букет – шкада ж кветак, павянуць. Як у непрытомнасці, пайшла на кухню, наліла ў вазу вады, паставіла букет на стол. Здавалася, што ўсё гэта здарылася не са мной. Ад цішыні аж закладвала ў вушах…

Першым загаварыў Іван.

– Табе патрэбен час? Я пачакаю. Давай прысядзем, паразмаўляем.

– Аб чым? – нярвова пераплятаючы пальцы рук, сказала я. – Гэта ж нерэальна, так не бывае. Ты што, не разумееш, што наш час ужо мінуў?

– Не, наш час толькі пачынаецца. Мы павінны былі прайсці кожны свой шлях, каб стаць сённяшнімі.

– Ты нават не ведаеш, а мо я замужам?

– Так, не ведаю, але мне здаецца, што жанчыны, якія «за мужам», выглядаюць інакш, у іх позірку не адчуваецца трывогі. У глыбіні тваіх вачэй хаваецца сум. Так бывае, калі чалавек сутыкнецца са здрадай. Ды і на доўгі час жонак з дому не адпускаюць.

– Я не зрабіла шчаслівым аднаго, чаму ты думаеш, што з табой будзе інакш?

– Ты не для яго, відаць, была наканавана.

– У мяне дарослыя дзеці. Ты не будзеш мець сваіх.

– Дзеці даруюцца чалавеку Богам. Яны прыходзяць да яго рознымі шляхамі. Я кахаю цябе і буду любіць тваіх дзяцей.

– Не, гэта позна. На вялікі жаль, зусім позна.

– Ты што такое кажаш? Хіба бывае позна людзям адчуваць сябе патрэбнымі адзін аднаму, ведаць, што цябе чакаюць кожную хвіліну, што можна размаўляць аб хвалюючым, а можна маўчаць і слухаць цішыню разам, радавацца і гараваць дваім таксама лепей. Я многа пра гэта ведаю. Павер мне.

– Абставіны часам уносяць папраўкі ў жыццё. Людзі думаюць, што робяць, як найлепш, а на справе атрымліваецца зусім іншае – не тое, чаго чакалі, на што спадзяваліся. Я болей не жадаю рабіць памылкі, ці самой для кагосьці памылкай зрабіцца.

– Не бойся. У кожнага чалавека заўсёды ёсць магчымасць вырашаць, які шлях для сябе вызначыць. Здрады больш не будзе.

Нашы галасы гучалі ўсё цішэй. Я не пазнавала сябе. Усё, што сёння да гэтага казаў Іван, зараз ужо не здавалася такім недарэчным, не хацелася пярэчыць.

– Пачакай, я сама вырашу, у які час і што табе адказаць. Але ж, калі думаеш, што цябе кожны дзень бу-

дзе чакаць пірог з вішняй, то вельмі памыляешся, я яго выпякаю толькі ў асаблівых выпадках. А зараз давай развітвацца, трэба пабачыць, як там Ганна Сяргееўна маецца – у такіх абставінах пажылой жанчыне лёгка можна страціць раўнавагу.

Пасля маруднымі крокамі правяла Івана да веснічкаў. Ад агульнага хвалявання зусім не памятаю, аб чым там яшчэ амаль паўгадзіны размаўлялі. Што за дзень сёння такі?..

Назаўтра працавалася зранку добра. Набегла шмат дзетвары. Не так ужо ім кніжкі спатрэбіліся, як хацелася са мной пазнаёміцца. Пад вечар нават падумала, што ўсе падзеі ўчарашняга дня хутка можна забыць, калі аб іх не ўспамінаць. Вельмі старалася, у аўторак ужо неяк трошкі супакойвацца пачала. Але дзе ж там супакоішся – у сераду, тут як тут, – Іван зноў з'явіўся. Па маім настроі ён зразумеў, што я ўся ў роздуме, і ветліва дадаў:

– Буду чакаць, колькі спатрэбіцца, але ты паспяшайся. Я ж вельмі хвалююся, каб які праараб мне дарогу не перайшоў, на будоўлі хлопцы шпаркія, а цябе не заўважыць цяжка.

– Вось што я табе скажу. Ты, мабыць, захварэў, але гэта хутка пройдзе. Займіся справамі. Не ганяйся туды-сюды. Мне працаваць трэба, – сказала я, хоць і разумела, што гэта зусім не ветліва. Іван уважліва паглядзеў на мяне сваімі бліскучымі вачамі і адказаў:

– А я і не адказваюся – захварэў, бо аднабаковае каханне – гэта сапраўды хвароба. Ратуй мяне хутчэй, каб не памёр.

Ён памахаў весела рукой і з'ехаў у добрым настроі. А што ва ўсім гэтым добрага? Навошта мне гэтыя перажыванні? Спадзявалася на спакойнае вясковае існаванне – а дзе ён, той спакой? Ляжу да паўночы без сну, думаю. Разумею, что дзесьці там, глыбока ў душы прытаілася і ўсё яшчэ дыхае вельмі далікатнае пачуццё ча-

кання шчасця – таго берага, да якога спяшаюцца двое, каб даць адно аднаму магчымасць далейшага жаданага развіцця і ўпэўненасць, што так яно і будзе. Як ні старалася (у вёску вось заехала), а нідзе ад гэтага пачуцця падзецца немагчыма: перамагае, відаць, жаночая частка сэнсу жыцця – быць патрэбнай і каханай...

У суботу я зноў завіхалася ля пліты, вішнёвы пірог абяцаў быць удалым. Настрой у насельнікаў дома быў, як і належыць у суботу, – прыўзняты. Калі на парозе з'явіўся Іван з цукеркамі, віном і кветкамі, то ўсім стала зразумела, што інакш быць не магло, сярод нас ужо панавала нейкая агульная прадбачлівасць. Дзякуючы за падарункі, Ганна Сяргееўна запытала: «Сумуеш без нас?» Гледзячы на мяне паверх яе галавы, Іван ціха і вельмі сур'ёзна адказаў: «Сумую, успамінаю часцей за дыханне». Я вельмі намагалася не глядзець у яго цёмныя вочы, бо адчувала, што патанаю ў іх глыбіні. «Божачка, дай моцы, каб не з галавой, яна ж мне зараз вельмі патрэбная,» – пранеслася ў маіх, зараз такіх зусім непрадказальных, думках. І што гэта з жанчынай робіцца, галоўнае – адкуль што ўзялося?..

На гэтым цуды не скончыліся. Праз месяц атрымала запрашэнне ад мясцовага кіраўніцтва перайсці на пастаянную працу ў бібліятэку, для заахвочвання прапанавалі службовую кватэру ў вельмі прыгожым новым доме...

Было мне аб чым добра падумаць у гэтай камандзіроўцы. А можа, і ёсць сапраўдная праўда ў тым, што ніколі не позна станавіцца шчаслівай, нават зараз? Добра вядома нам з даўніх часоў, што шчаслівы чалавек вакол сябе робіць шчаслівымі шмат іншых людзей і што шчаслівая маці дае сваім дзецям значна болей магчымасцей быць таксама шчаслівымі. Проста людзі пра гэта часта забываюцца, як і пра тое, што выпадковасцей у жыцці, відаць, не бывае...

## Пяшчота

Жанчына расплюшчыла вочы, паглядзела ў бок акна. Цёмна. «Трэба заснуць, бо заўтра напружаны дзень,» – падумала яна, павярнуўшыся да сцяны. Але сон не браў яе ў палон. Чаму? З чаго? Якая ў тым нагода? Штосьці незвычайнае хвалявала яе сэрца, патрабавала перабіраць усе падзеі мінулага дня, каб знайсці прычыну бяссонніцы. Так, нічога незвычайнага не адкапаўшы ў падзеях мінулых дзён, яна, стомленая ад душэўнай перанапругі, заснула толькі на світанні. Нягледзячы на гэта, прачнулася па-звычайнаму лёгка. Снедаць чамусьці не вельмі хацелася, з задавальненнем выпіла толькі гарбату.

Працы, як заўсёды, было многа. Кабета вярталася дамоў, калі ўжо пачынала цямнець. Седзячы ля акна ў аўтобусе, ёй было прыемна назіраць за жыццём вячэрняга горада і думаць, што хутка можна будзе адчуць асалоду цёплых бруяў душа і ўтульнасці ложка.

Так прыемна засынаць, напрацаваўшыся, асабліва, калі зможаш выканаць усё, што планавалася. Некаторы час думкі яшчэ вяртаюцца да падзеяў дня, усплываюць нанова часткі дзённых размоў, выразныя твары людзей, як быццам перад сном наша свядомасць пачынае падрыхтоўку для наступнага дня: штосьці праплыло і знікла зусім, як і не было, а штосьці дабавілася ў бясконцы ланцужок памяці для таго, каб застацца там назаўсёды…

Перад сном учарашні стан пачаў вяртацца: нясмела нейкі віхорчык неспакою ізноў падштурхнуў яе прачнуцца. На дварэ ў самай моцы панавала ноч, і тое незнаёмае пачуццё хвалявання зварушыла думкі, прымусіла шукаць крыніцу неспакою.

«Усё ж добра, нічога не здарылася, спі,» – загадала яна сабе. Паслухалася, заснула...

Звычайная раніца. На снеданне гарбата, бо сыр меў нейкі непрыемны пах. Два прыпынкі вырашыла прайсці пешу. Працавалася добра, прыгоды ночы ніяк не паўплывалі на бадзёрасць настрою. Параілася са старэйшай калегай па працы і пасля работы пайшла ў паліклініку. Потым зноў той жа аўтобус, тыя ж заклапочаныя твары гаспадынь у краме, тыя ж прыемныя бруйкі вады ў душы, але... адначасова ўсё гэта нейкае іншае. Твары людзей выцягнутыя. Крамы, нібыта біўні маманту, – задужа доўгія, прыпынкі поўныя замаруджаных людзей. Бо быў момант, які ўсе падзеі дня падзяліў на часткі: усё, што было да яго, зараз існавала адносна само ў сабе, засталося дзесьці там, яно ўжо не такое істотнае, бо цяпер ёсць штосьці новае – тое, што пакуль немагчыма да канца ўсвядоміць і прааналізаваць: яна будзе маці. Не-не, не будзе. Ужо ёсць! Зусім маленькае дзіцятка ўжо сведчыць аб сабе, бо пачынаюцца змены – проста жанчына становіцца цяжарнай...

«Патрэбна болей хадзіць, буду лепш спаць,» – думала жанчына–маці, утульна падсунуўшы руку пад падушку. Заснула амаль імгненна, бо задужа стамілася ад падзеяў дня. Але, як і ў папярэднія ночы, прачнулася сярод цішыні, толькі зараз яна ўжо ведала, чаму. Сэрца пачынала часцей біцца, ад яго па ўсім целе расплывалася цёплая пяшчота, затрымлівалася пад рукой, якую зараз увесь час хацелася трымаць на жываце, потым зноў вярталася назад, спынялася, каб даць магчымаць прыгадаць свае новае становішча. Пачуццё адказнасці ўзнікла умомант, а як жа інакш, бо ў цябе жыве новы чалавек, яшчэ вельмі маленькі, бездапаможны, між тым вельмі важны, бо праз яго здзейсніцца вялікі цуд бясконцага жыцця, дзеля якога створаны гэты свет і чалавек ў ім. І яна ўсё ясней разумела, што

будзе належыць ужо не адной сабе, а назаўсёды будзе звязана з тым, каго носіць у сваім целе, і ўжо ніколі не будзе зусім свабоднай, таму што нельга быць вольнай ад сябе, ад сваёй душы, ад свайго сумлення.

Так усвядамленне вечных і нязменных законаў быцця запаліла ў будучай маме святло сапраўднай жаночай мудрасці, бо яна сёння ўжо ведала тое, аб чым не здагадвалася ў мінулыя дні і ночы. У глыбіні душы яна адчувала, што пачалося тое самае важнае, дзеля чаго яна прыйшла ў гэты свет. Праз не зачыненую фіранкай палову акна яна ўглядвалася ў начное неба, каб узнесці малітву падзякі Богу за гэты падарунак, за магчымасць пазнаць сапраўднае шчасце аддаваць сваю любоў і ведаць, што яе сутнасць ніколі не згубіцца ў агромністым сусвеце, ніколі не скончыцца рух яе духу, ніколі не перастане існаваць…

А любоў – яна мацней за ўсё, яна нічога не баіцца, дае чалавеку крылы, цягу, накірунак і, урэшце, прастору, яна ўсё аддае і нічога за тое не патрабуе.

Можа, таму цяжарнасць надзяляе жанчыну асаблівай прыгажосцю, якая прымушае бясконца ўглядвацца ў яе глыбокія вочы, у якіх змяшчаецца цэлы сусвет, пісаць яе партрэты, прысвячаць ёй дзівосныя вершы, рамансы і… апавяданні.

## Рака жыцця

Рэчка сцішыла хуткасць сваёй вады, імкнучыся разгледзець новае адлюстраванне яе твару «Што зрабілася, няўжо адчай? – думала сівая рака. – Я памятаю цябе яшчэ дзяўчынкай з доўгай цёмна-русай касой і бліскучым поглядам вялікіх, здзіўленых шэрых вачэй, у якіх заусёды блішчэлі агеньчыкі радасці.

Потым ты стала маладой жанчынай, і немагчыма было налюбавацца прывабнасцю твайго твару, прыгажосцю імклівых і павольных рухаў, калі ты дакраналася да сваіх дзяцей, а таксама спакойным замілаваннем вачэй. Усё гэта прыходзіць да жанчыны, калі яна становіцца мамай.

Я таксама памятаю, як ты сядзела на беразе і ўглядвалася ў ваду стомленымі, але такімі ж цёплымі вачамі. Мае спешныя воды чыталі тады ў іх стоеную трывогу і нейкі страх. Нават водам было балюча, бо яны ведалі, што страх апаноўвае, калі кваяцца на каханне. І яны шапталі табе: «Не бойся, ідзі наперад, толькі не спыняйся. Мы добра ведаем, што каханне нікуды не знікае, ніколі не перастае, яго нельга ўкрасці, яно заусёды будзе тваім, толькі ўжо зусім іншым. Абразы перад ім не маюць сілы».

Зноў і зноў рэчка разглядвала жанчыну. Глыбокі і пранікнёны погляд па-ранейшаму маладых вачэй, як быццам ён бачыць, што там, на самым дне пад глыбокімі водамі ракі. Магчыма, ён ведае цану незвычайна простых пачуццяў, з якімі перамагаеш сябе дзеля большай дасканаласці, без якой немагчыма далейшае развіццё.

«Усё добра, – з палёгкай уздыхнула мудрая рэчка. – Ты здолееш усё, бо зразумела, што шчасце, яно у табе, у тваіх жылах і нервах, пальчыках і плячуках, у тваіх такіх прывабных вуснах і той усмешцы, якая прымусіць прысягнуць на вернасць каханню і яму. І таму каханне ніхто не зможа забраць, калі ты не дасі на гэта дазволу».

## Складаны дыягназ

Кожным разам, калі я еду на машыне ці аўтобусе, стараюся выбраць месца ля акна, каб была магчымасць лепей разглядаць пануючыя змены ў наваколлі. Вельмі папрыгажэлі невялікія гарадкі і многія цэнтральныя сядзібы паселішчаў. Цяпер яны красуюцца новымі рознакаляровымі дахамі, дагледжанымі школамі і дзіцячымі садкамі. Радасна, што амаль каля кожнай хаты стаяць уласныя легкавыя машыны, большасць з іх – іншамаркі. І адначасова шкада, што зусім іншы лёс напаткаў невялікія, і ад таго яшчэ больш утульныя, вёскі, як і тую, дзе я нарадзілася і дзе прайшло маё дзяцінства.

Яна пакуль што існуе, але з кожным годам усё менш застаецца хатаў, у якіх раніцай з комінаў ідзе дым, а значыць, гаспадыня гатуе снеданне. Дзіцячыя галасы аздабляюць наваколле толькі летам, калі маладыя сем'і, аддаўшы перавагу прыгажосці наваколля і ласкавасці хваляў нашай ракі перад турэцкімі ці балгарскімі берагамі, вырашаюць свой адпачынак правесці ў родных мясцінах. А наваколле тутака і сапраўды цудоўнае, амаль магічнае. Казачная цішыня рэдка калі парушаецца, бо да шашы далёка, каля дзесяці кіламетраў, а па вясковай вуліцы зрэдку хто праедзе на ўласнай машыне ці матацыкле. Старадаўні гаспадар-лес, які спрадвеку ўладарыць на ўсіх межах вакол вёскі, дарue жыхарам не толькі ягады, грыбы, але надзейнае пачуццё бяспекі і спакою. Можа, таму дзверы ў хатах пры адсутнасці гаспадароў заўсёды ахоўваліся толькі простай зашчапкай – сведчаннем, што заходзіць няма да каго. І нават зараз ні ў адным доме, дзе ўжо ніхто не жыве, вокны дошкамі не забітыя, і таму глядзець на маўклівыя двары не так балюча. Здаецца, што гэта ўсё часова і неўзабаве хтосьці скрыпне веснічкамі, вернецца, каб пачуць

гукі світання, працоўнага вясковага дня, ціхага вечара, чароўнай ночы і ад гэтага атрымаць асалоду простага і зразумелага жыцця побач з вечнай прыгажосцю і мудрасцю, зноў адчуць сябе вельмі вартым стагоддзямі наладжанага гарманічнага існавання. Таму адчуць сілу такога быцця магчымасць ёсць у кожнага, хто наведаецца ў нашыя мясціны любой парой года. Вось і зараз, калі за вокнамі аўтобуса замільгалі знаёмыя павароты і просекі, на сэрцы непрыкметна стала спакойна, клопаты адышлі на задні план, не гледзячы на тое, што мэта маёй паездкі была зусім не з вясёлых – я ехала на вясковыя могілкі, дзе пахаваны мае бацькі.

Прыпынак на «галоўнай» плошчы вёскі, там заўжды раніцай абмяркоўваліся калгасныя справы. У гэтым месцы можна было даведацца не толькі ўсе навіны і дэталі з жыцця сялян, але і пачуць пра становішча ў сусветных справах. Дзіўная рэч, я і дагэтуль не зусім разумею, як гэта ў нашай вёсцы ведалі ўсё аб усіх, нават аб сваяках суседзяў, пры тым, што няпрошанага ўмяшання ў асабістыя клопаты чужой сям'і не наглядалася, ва ўсялякім разе, я гэтага не памятаю. Але ж калі так здаралася, што хтосьці з дзяцей «забыўся» павітацца са старэйшымі ці яшчэ што-небудзь зрабіў не зусім належным чынам, то можна было ніяк не сумнявацца ў тым, што бацькі вельмі хутка аб гэтым даведаюцца. («Па паветры хіба?» – думалі мы ў той час.) Цвёрда існавала адчуванне, што выхаванне ў нашай вёсцы адбывалася па складзенай традыцыі ўсеагульнага ўсведамлення: маўляў, чужых дзяцей не існуе. І калі добра падумаць, то ў такім усведамленні няма ніякай мудрагелістасці, гэта сапраўды павінна быць так, бо немагчыма наперад ведаць, каму ў старасці твой сын дапаможа пераступіць прыступак, і чыя дачка паднясе табе сумку, хто ў адказны момант з'явіцца тым самым бліжнім, самым неабходным «тут і зараз»...

Убачыўшы мяне, выйшла павітацца суседка. Умомант па той жа традыцыі абмяняліся навінамі, спланавалі дзень. Было прыемна даведацца, што, па заяве жыхароў вёскі, з раённага цэнтру прыязджала брыгада супрацоўнікаў МНЗ, якая дапамагла навесці парадак на могілках: спілавалі і падпілавалі старыя ці найбольш небяспечныя дрэвы, многае выкарчавалі, дружна сцерлі з прасторы непатрэбны хмызняк. А яшчэ яна сказала, што ўжо двойчы ля мамінай магілы бачыла незнаёмага, сярэдняга ўзросту чалавека, ён прыязджаў спецыяльна на іх могілкі і больш нідзе не затрымліваўся. Але нават разам мы не змаглі вырашыць, хто б гэта мог быць...

На могілках заўсёды асаблівая цішыня. Але калі я трапляю на нашыя вясковыя, то здаецца, што гэта самае спакойнае месца ў свеце. Дрэвы (пераважна сосны) вялікія, шматгадовыя. Гледзячы на іх, думаеш аб тым, колькі падзей мінула, сведкамі якіх ім давялося быць. Фізічна адчуваеш прысутнасць былога, у кожнага свайго, пра якое ведаюць і аб чым перашэптваюцца гэтыя паважныя хвоі, пакалыхваючы ўверсе шапкамі-галовамі, нібы сцвярджаючы, што ўсё праходзіць, хоць і не ўсё забываецца. Можа, таму і думаецца тут інакш, а тое, што хвалявала цябе яшчэ раніцай, робіцца ўжо не такім важным. Далей вырашэнне цяжкіх пытанняў неяк адбываецца само сабой, і, на дзіва, такі ход рэчаў – з'ява, звычайная для ўсіх. Вось і зараз слёзы на вачах высахлі, я ўглядвалася ў ясныя і мілыя сэрцу фатаздымкі маіх бацькоў і думала аб тым, як многім ім абавязана і як часта ў жыцці пры розных абставінах у думках звяртаюся да іх, нібы параўноўваю свае ўчынкі з тою шкалою каштоўнасцей, якая існавала ў нашай дружнай і цудоўнай сям'і. Зусім нядаўна ўспомнілася, як аднойчы (мне тады было каля дванаццаці гадоў), мы вясновым вечарам сядзелі з мамай на ганку, ча-



калі тату. Гледзячы на поўню месяца, я дэманстравала маме свае веды па астраноміі, распавядаючы ёй пра паходжанне плямаў на спутніку нашай планеты. Мама задумёна слухала, і калі мой запас ведаў вычарпаўся і я замаўчала, мама прыгарнула мяне да сябе, зазірнула ў вочы. Я адчувала, што яна мае жаданне сказаць штосьці важнае, і цярпліва чакала.

– Вялікая ты ўжо стала, дачушка, многа ведаеш. Малайчына, што любіш чытаць. Вучоныя шмат працавалі, каб дасканала пра гэтыя плямы растлумачыць. Давай і мы разгледзім іх уважліва, бачыш, яны маюць пэўныя формы. Прыглядзіся, знізу адзін чалавек падае, амаль зусім ляжыць, а вышэй відаць, як над ім стаіць другі, які яго забівае, трымае вілы. Гэта браты. Адзін з іх, Каін, займаўся земляробствам, другі – Авель, пасвіў статкі. Авель быў не ганарлівы і памяркоўны, Каін меў жорсткі і злаславы характар. Па біблейскім праданні, яны аднойчы прыносілі ахвяру Богу. Авель рабіў гэта ад чыстага сэрца, з надзеяй і малітвай аб міласці, Каін жа проста выконваў звычай, без любові і страху Божага. Гасподзь бачыць сэрца кожнага, ахвяру Авеля ён прыняў, дым ад яе паднімаўся ў нябёсы. Каін жа, убачыўшы, што ад яго ахвяры дым рассцілаўся па зямлі, зразумеў, што яна Богу не патрэбна. Пасля гэтага Каін стаў зайздросціць свайму брату, выклікаў яго ў поле і забіў. Перад Богам у сваім граху не прызнаўся, быў праклятым. Сумленне яго мучыла ўвесь час, нават на зямлі бацькоў ён не змог спакойна жыць. Жыццё чалавека – найвялікшая каштоўнасць, яго шанаваць патрэбна. Каб людзі не забываліся на гэта, быў пакінуты вечны напамін, які мы бачым кожны раз, калі сходзіць поўня.

«Мабыць, і фашысты былі ад Каіна,» – вырашыла я пасля нядоўгага роздуму і сказала пра гэта маме. Яна згадзілася са мной, трошкі памаўчаўшы, дадала: «Вайна заўсёды супраць Бога, бо забірае чалавечыя жыц-

ці. Але ж, бачыш, Каін і без вайны гэта зрабіў». Так у маё, яшчэ амаль дзіцячае сэрца, гэтым вечарам увайшоў зусім незнаёмы і дарослы боль ад усведамлення таго, што людзі здольны забіваць адзін аднаго, нават брат брата. Аб тым, што зайздрасць – вельмі цяжкае для чалавека пачуццё, яна тым і небяспечна, што адразу іншаму чалавеку і не бачна, асабліва, калі яна кваліцца не на фізічнае чалавечае жыццё, а палюе за яго душой, забіраючы спакой, веру, надзею, я, канешне, усвядоміла значна пазней. Як, дарэчы, і тое, што здрадзіўшы ці забраўшы, што яму не належыць, чалавек, нібы той Каін, таксама жыць не можа – поўня, мабыць, нідзе не дае набыць спакой…

«Трэба сухое лісце вынесці,» – падумала я, агледзеўшыся. Выходзячы за агароджу могілкаў, заўважыла чырвоны аўтамабіль, з якога якраз выходзіў невысокага росту мужчына. Ен быў па-спартыўнаму апрануты і выглядаў моладцавата. У якісьці момант нашы вочы сустрэліся, я здзівілася, бо ўбачыла ў яго позірку разгубленасць адначасова з дзіцячай радасцю. «Такая рэдкая з'ява ў сталага мужчыны,» – прамільгнула ў галаве. Праз хвіліну ён ўжо падыходзіў да мяне.

– Добры дзень, – яго словы прагучалі неяк не па абставінах радасна. Я ж павіталася зусім стрымана. Мабыць, адчуўшы мой настрой, ён хутка прадоўжыў:

– Вы, пэўна, дачка цёткі Марыі, я Вас пазнаў, падобныя на яе. Як жа мне сёння пашчасціла сустрэць Вас, даўно патрэбна было пабачыцца. Цётка Марыя і тут дапамагла. Пасля гэтых словаў я зразумела заўважаныя асаблівасці ў яго позірку, падумала, што, магчыма, яго дзецям, як і мноству знаёмых мамы, неабходна мая дапамога як урача-педыятра, і ўнутрана гатавалася слухаць.

– Вам патрэбна мне штосьці распавесці? Мы паразмаўляем, толькі мне неабходна тут лісце прыбраць.

Ён падбег да машыны і вярнуўся з венікам у руках:

– Я дапамагу, вось і венік з сабою ўзяў.

Працавалі моўчкі, кожны, мабыць, думаў пра сваё. Праз гадзіну помнікі былі чыстыя, усё лісце вынесена. Мне нават здавалася, што час расцягнуўся, так хутка ўсё здарылася зрабіць.

– Мяне Сашам завуць, Вы не спяшайцеся на аўтобус, я Вас да горада давязу. Пачакаю, калі патрэбна з кім пабачыцца, – клапатліва адказаў мой новы знаёмы, такімі адносінамі выклікаўшы нечаканы давер з майго боку. Мы прыселі на лаўку ля сасны, я падрыхтавалася слухаць. Старалася быць уважлівай, было відаць хваляванне Аляксандра...

– Ведаеце, каб Вы ўбачылі мяне гадоў восем назад, то мабыць, і слоўца ад мяне не захацелі б пачуць... Я вайсковую службу праходзіў у Афганістане. Вярнуўшыся пасля вайны, ажаніўся, нарадзілася дачка, мы былі шчаслівыя. Усё было добра, пакуль я не застаўся без працы. У нашым будаўнічым упраўленні скарачалі штаты, пакідалі толькі кваліфікаваных і здаровых, ды і тым па тры месяцы заробак не плацілі. Многія мае знаёмыя падаліся на заробкі ў Маскву, а я меў надзею знайсці работу дома, мне зусім не хацелася пакідаць сям'ю, трэба было дапамагаць пастарэўшым бацькам у вёсцы, якія за мой «афганскі час» і так усе вочы выплакалі. Перыядычна работа яшчэ знаходзілася, выконваў часовыя заказы. Вечарамі з такімі ж хлопцамі сядзеў за півам, потым сталі з віном сябраваць. Я і не заўважыў, як за тры гады апынуўся на самым дне. Ні слёзы жонкі і мамы, ні жорсткія дакоры бацькі мяне не кранaлі. Зранку мяне адхадняк «калаціў», і я ў непрытомнасці шукаў спіртное. На медыцынскую дапамогу ніяк не згаджаўся, бо такія абставіны майго жыцця ўжо не хвалявалі, нават у нечым задавальнялі. Пра наступны дзень думаць не мог, не хацеў, бо гэта было

вельмі страшна. Хутка ўжо і дамоў начаваць перастаў прыходзіць...

Аднойчы раніцай я прачнуўся ад таго, што хтосьці мяне тармасіў, спрабаваў перавярнуць, адсунуць. Уставаць не хацелася, але мне настойліва не давалі спаць далей. Я адкрыў вочы і ўбачыў бабульку ў белай хусцінцы, маленькую, гадоў пад восемдзесят. Яна спрабавала мяне абудзіць і ўсё прыгаворвала:

– Дзіцятка, уставай, тут нельга валяцца, падніміся. Я сеў, агледзеўся і зразумеў, што заснуў каля агароджы сабора, які будаваўся ў нашым горадзе, і што гэта вельмі не падабаецца прыставучай, як пчала, бабулі. Надумаўся зноў легчы, але па настойліваму погляду старой зразумеў, што адыходзіць ад мяне яна не збіраецца. Каб яна адчапілася, сказаў, што згубіў адзін чаравік, пакінуць гэтае месца не магу. Бабуля прыхінулася да агароджы побач са мной і стала распытваць, дзе я быў і дзе мог згубіць той чаравік?

– Ну, што табе патрэбна, старая, у міліцыі быў, затрымлівалі днём, потым у бальніцу вазілі, там дзесьці і згубіў.

Бабулька задумалася, а потым, строга так гледзячы мне ў вочы, вымавіла:

– Ведаеш што, сынку, адыдзі далей, там для будаўнікоў сабора лаўка зроблена. Пасядзі, дачакайся мяне, я збегаю пашукаю твой чаравік.

Не ведаю чаму, я згадзіўся. Правёўшы мяне вачыма, яна «пабегла». Я паглядзеў уздагон і ўбачыў, як бабулька ледзьве переступае правай нагой, відаць было, што гэтая нага вельмі балела, бо яна разы ў два была таўшчэйшая за левую. Каб заглушыць нечакана ўзнікнуўшае пачуццё спагады да незнаёмага чалавека, я падумаў: «Нічога, бабуля, кавыляй, тут недалёка, будзе табе занятак, а я ў спакоі паляжу на лаўцы. Ты сама пайшла, я цябе не прасіў». Не заўважыў, як зноў заснуў.

Калі адчуў знаёмае ўжо тармошанне, то зразумеў, што прайшло ўжо гадзіны тры, бо сонца добра прыпякала.

– Сынок, уставай, я твой чаравік знайшла. Мне ў міліцыі сказалі, што кіроўца, які цябе ў бальніцу вазіў, памыў машыну пасля змены і дамоў пайшоў. Я і да яго дахаты збегала, даведалася, што ён твой чаравік выкінуў у скрыню са смеццем за гаражом. Вось, я яго там і знайшла, добра, што паспела раней, чым «смеццевоз» прыехаў. Маеш шанец устаць на ногі, абувайся, ідзі дамоў і больш так не ўпівайся.

Я аслупянела глядзеў на яе набрынялую нагу, бачыў дабрыню ў стомленых вачах і не разумеў, навошта ёй было шукаць чаравік мне – незнаёмаму, бруднаму, атупеўшаму ад запояў чалавеку.

– Немагчыма мне дамоў, няма мне з чым да жонкі з дачкой ісці, – адказаў прыцішана я.

Не ведаю чаму, але мне раптам невыцерпна захацелася заплакаць, упершыню за многія гады слёзы пацяклі па маім твары, але сораму я не адчуваў. Бабуля прысела побач, пачала гладзіць маю брудную руку і таксама ціхенька ўсхліпвала. Потым прамовіла:

– А ты прыходзь да нас на будоўлю, будзеш, пакуль акрыяеш, у простых работах дапамагаць, а потым і тынкаваць пачнеш. Я цябе да бацюшкі завяду. Тут плацяць не шмат, але ж ты будзеш займацца божай справай, сям'ю пракорміш.

Я такіх словаў даўно не чуў, яны кранalі мне душу. Але думаў пра тое, што працаваць я ўжо даўно развучыўся, не змагу нічога зрабіць, пра ўсё забыўся, навошта мне гэтая марока, ды яшчэ ў храме? Зрабіў выгляд, што падумаў і выдаў:

– Не, мамаша, я працаваць не змагу, я ж алкаголік, хворы, ты і не ведаеш, якая гэта страшная хвароба.

Яна заглянула мне ў вочы, стараючыся штосьці ў іх убачыць, і вельмі ўпэўнена, ціха і душэўна сказала:

– Не, дзіцятка, не хвароба гэта ў цябе, а распуста. Калі ўпаў, то падымайся, чалавеку ў брудзе ляжаць нельга.

І так гэтыя словы трапілі ў кропку, што мне захацелася стаць іншым. Я не буду распавядаць, як цётка Марыя прасіла прыняць мяне на работу, як прывяла потым у царкву, маўляў, «ты ж ахрышчаны!», як прасіла заробак атрымліваць мне разам з жонкай, як потым я ўладкаваўся на новую работу... Вось толькі прыводзіць яе ў новае жыццё не паспеў – былі з сям'ёй на адпачынку, калі яна памерла. Езджу цяпер сюды, цётка Марыя для мяне як другая мама, дапамагла нанава нарадзіцца. А Вас вельмі хацеў пабачыць, Вы ўрач? Распавядайце сваім калегам пра мой выпадак, пра гэтую «распусту», ад якой можна пазбавіцца і падняцца, калі дапамогуць. Дапамагайце, калі ласка.

Пара збірацца. Суседка выйшла развітацца. Убачыўшы мяне разам з Аляксандрам, запытала: «Ты яго ведаеш?» Я, у знак згоды, кіўнула галавой.

Усю дарогу, пакуль мы ехалі, я думала пра тое, што жыццё ўвесь час дае чалавеку магчымасць вучыцца, на кожны ўзрост свая навука. Успомніла, як аднойчы мама мне весела распавядала аб тым, што шукала чалавеку чаравік у скрыні са смеццем у двары міліцыі. Дзяжурны міліцыянер, відаць, хвалюючыся за яе аўтарытэт, казаў ёй: «Бабулька, хопіць ужо там корпацца, даўся табе гэты чаравік. Аб чым людзі падумаюць, убачыўшы цябе за гэтым заняткам?» І я тым часам таксама была незадаволена гэтым учынкам. У думках згаджалася з міліцыянерам, сказала маме, каб яна так больш ніколі не рабіла. Памятаю, як яна раптам стала вельмі сур'ёзнай і цвёрда адказала мне: «А гэта, дачушка, не сорам. Сорам, калі людзі людзей не бачаць».

## Смешнае і сумнае і побач

Дзень быў, як звычайна бывае ў настаўніцы на пачатку верасня, напружаным. У нейкі момант мне захацелася сесці на канапу, пакласці выцягнутыя ногі на крэсла і ні аб чым не думаць. Паспрабавала, на хвілін дзесяць такі стан атрымаўся спрыяльным, не болей. Штосьці непакоіла, засела ў маёй памяці міжвольна, патрабавала дзеяння, але што? Паціху, не ўстаючы з канапы, стала перабіраць паслядоўнасць усіх падзей дня, каб намацаць тую, на якую трэба было якімсьці чынам рэагаваць, ды часу на той момант не было. З вамі таксама бывае такое? Канешне ж, ведаю, што бывае. Але вашай віны ў тым няма, супакойцеся. Проста справаў калі-нікалі для адной галавы на адзінку часу бывае зашмат – вось яна і раскладвае іх па куточках памяці ў асобныя скрынькі, вызначае для кожнай свой тэрмін. І ён абавязкова наступае, скрыня адчыняецца, а як жа іначай? А пакуль гэты час не надышоў – трэба заняцца справамі.

Заглядваю ў лядоўню, каб згатаваць вячэру, бяру курыцу, запакаваную ў жоўты пластмасавы латок, і на табе – атрымлівай заданне, спадарыня: успомніла, што мая ўвага сёння мімалётам спынялася на кавалачку газона за кустамі ля нашага пад'езда, куды на перакус збіраюцца мясцовыя бяздомныя каты і коткі, і мы тым часам з суседкай прыстасаваліся іх падчастоўваць. Так званая  дапамога братам нашым малодшым. Было чаго спыніць увагу. Там хтосьці разам з ежай выкінуў і мяшэчкі з паперай. Жоўтыя латкі, куды мы налівалі малако для кацянят, таксама забрудзіліся. І вось нашая грамадска-кацінная перакусачная выглядала неахайна. Непрыемнасцей чакаць не трэба, лепш іх папярэдзіць. Пайду прыбяруся, пакуль зусім не сцямнела. Пайшла.

Уважліва прыглядваюся, паправіла акуляры, падняла галінкі куста – не, нічога няма: ні смецця, ні «посуду». Няўжо хтосьці разбурыў усю кацінную гаспадарку? Можа, і катоў разам прагналі? Учынкі ж розных людзей розныя, мо каму і дакучалі гэтыя каты. Так нехораша выйшла, раней трэба было ўсё гэта зрабіць, а зараз што? Дзе тых коцікаў шукаць, напалохаліся, відаць. Расхвалявалася, што суседцы скажу?

Падыходзячы да дзвярэй, не страчваючы надзеі, яшчэ раз прыглядаюся і раптам бачу, што ўздоўж сцяны дома, нібы жывыя, аднолькава шпарка рухаюцца па траве абодва кацінныя латкі, амаль паралельна адзін аднаму. Што за праява такая? Засумнявалася, падыйшла бліжэй. (А можа, са мной штосьці не так, ці мне падалося, ці сцёклы ў акулярах працёрці трэба?) Не, нічога такога ні са мной, ні з акулярамі не здарылася – жоўтыя латкі, добра прыкметныя нават у прыцемках, рухаліся.

У галаве з хуткасцю маланкі адна здагадка змянялася другой: анамальная з'ява, рознасць тэмператур, ціску, мясцовы дамавік дзейнічае, знак іншапланецян!? Рашуча вырашаю назіраць далей. Заўважаю, што за латкамі штосьці такое невялікае варушыцца, таксама рухаецца ў тым жа напрамку, цёмнае і круглае, ледзь прыкметнае. Падкрадаюся бліжэй (ну, не зможа ж яно мяне з'есці) і разумею, што гэта – вожык!!! Маленькі жвавенькі звычайны вожык! І паўзе ён за бацькамі, якія накалолі на свае спіны кашачы посуд і вязуць, відаць, у сваю яжыную кватэру. Вось дык прыгоды, ці паверыць у гэта можна? Адкуль вожыкі з'явіліся ў сталічным двары, хіба хто з лесу прывёз, навошта? Зрабіўшы гэтыя вышуковыя мрапрыемствы, мне стала зразумела, хто абрабаваў катоў, і ад таго яшчэ больш радасна – ніхто іх сёння не крыўдзіў. А посуд я ім зноў прынясу, чысцейшы і навейшы.

Пакуль радавалася, латкі ўжо рухаліся з другога боку ад сцежкі, старанна абмінаючы машыны на стаянцы. Нашто гэтыя латкі спатрэбіліся яжынай сям'і? Мо гасцей насклікалі? А вы, чытачы, выпадкова, не ведаеце, мо яшчэ ім відэльцы з абрусам патрэбныя?



## Спецыяльны аглядальнік

Гэта была звычайная жанчына гадоў каля шасцідзесяці (на той час, з якога я яе памятаю), з прыгожым імем Сцепаніда: сярэдняга росту, з круглым тварам, яшчэ ладнай жаночай постацю, хоць і стаўшай з гадамі заметна важкай. Не гледзячы на гэта, Сцеша была вельмі вёрткай. Але больш за ўсё ўражвалі яе вочы, і ні іх анатамічныя асаблівасці, не – як у многіх, яны былі невялікія, шэрыя. Уражвала іх ласкавае ўменне ў кожным поглядзе на субяседніка даць адчуць, што з ім цікава і ўсё, што ён кажа, варта запомніць. Адметная акалічнасць характару чалавека. У глыбіні яе позірку нібы хавалася нейкая патаемная думка, і яе вельмі хацелася пачуць агучанай...

Вось напісала, што звычайная, і захвалявалася. Добра ж ведаю, што не бывае звычайных людзей, тым больш – жанчын. Кожны чалавек – адзіны на ўвесь наш сусвет. Толькі мы часта пра гэта забываем і пачынаем параўноўваць, падраўноваць і падчэсваць. А на самой справе, немагчыма ж быць усім аднолькавымі, бо ў кожнага ёсць сваё асабістае вызначэнне, і не ад нас гэта залежыць, кожны робіць тое, каму што наканавана.

Узяць хоць бы жыхароў нашай вёскі: дзядзька Васіль – адмысловы штукар, цётка Ніна вышые абрус так, што кветкі на ім выглядаюць, як жывыя, а без песень дзядзькі Рыгора ні адно вяселле не абыйшлося. Калісьці нам, яшчэ падлеткам, казаў наш дзед Іван: «Не тое важна, на якую справу цябе, дзіцятка, вызначыў лёс, на вялікую, ці на зусім простую, важна, што рабіць яе трэба так, каб за цябе яе лепш ніхто не зрабіў. Такі падыход да справы заўсёды дае свой плён, а шчасце само цябе знойдзе». Ну, што ж тут яшчэ можна дадаць?

Наша суседка Сцепаніда мела ўласцівы ёй талент ад самай маладосці. Зараз яна жыла адна. Муж не вярнуўся з вайны, бацькі даўно пакінулі гэты свет. Адной прыйшлося паднімаць на крыло абодвух дачок і малодшага сына. Пасля яе дзеці паспяхова ўзяліся паднімаць цаліну. Часта пішуць пісьмы, радуюцца працы і заробкам, абяцаюць праз каторы час зноў вярнуцца жыць на роднай зямлі. Вось наша Сцеша і чакае. Нікому не жаліцца, жыве сабе, як умее, усяму радуецца. Уступіць, бывала, на двор і кажа нашай маме: «Ці чула ты, што па радыё дождж абяцалі?» А на твары такая лагодная ўсмешка і столькі радасці ад гэтай навіны, што ўсе мы пачыналі таксама ўсміхацца. А мама тут як тут, усё хутка разумела і казала нам: «Чаго так доўга разважаць, будзе той дождж ці не? Хуценька збірайцеся, ды сухое сена з аселіцы ў пуню знясіце, яго там нямнога. Пра цётку Сцепаніду не забудзьцеся, у яе сена таксама ўжо сухое». А мы і радыя – гэта ж колькі новага між іншым ад суседкі даведаемся, калі пашчасціць – то першымі.

Справа ў тым, што Сцепаніда якімсьці невядомым чынам ведала пра ўсе вясковыя падзеі і іх дасканальныя падрабязнасці, у тым ліку і даўно мінулыя. І так здатна ў яе атрымлівалася знаходзіць у справах сувязь часоў, што заставалася толькі здзіўляцца. Часам было і так, здавалася, яшчэ і не зрабілася нічога, вартага грамадскай увагі, а яна ўжо аб гэтым ведала, нават прадбачвала, чым «сэрцы заспакояцца». Аднойчы мы чулі, як тата запытаў суседку, ці не мае яна якое трэцяе спецыяльнае вуха, бо немагчыма было ўявіць, як можна было чуць, стоячы ў сваім двары, якімі словамі сварыліся між сабой Алена з Ганнай на другім канцы вёскі, у якую суботу вырашылі сватацца да Сцяпанавай дачкі, чаму перасталі прыходзіць у госці да суседзяў сваякі з зарэчнай вёскі і з якіх часоў усплылі недагаворкі між імі, калі запланавалі пачынаць рамонт

маладажоны Рая з Колем, колькі слоікаў вішнёвага варэння ўжо загатавала на зіму здатная гаспадыня Ніна – усё гэта і іншага не менш змяшчалася ў непамернай памяці нашай суседкі Сцепаніды і выходзіла праз яе вусны па патрэбе.

Аб тым, што без працы нічога само з неба не падае, ведаюць многія, і Сцепаніда таксама. Каб першай адчуць пульс жыцця вёскі, яна з самай раніцы наведвалася да суседзяў: справа, злева, насупраць. Запальвала ў печы і ішла. Вярталася да сваіх абавязкаў гаспадыні ў залежнасці ад абставін, часам ужо і дровы згаралі, ледзь паспявала чыгункі з бульбачкай і капусткай у жар паставіць. Навошта ёй гэтыя паходы за навінамі былі патрэбныя, ніхто не разумеў. Затое з лёгкасцю карысталіся пры выпадках звесткамі з бяздоннага ларца ўсёбачнага вока добразычлівай Сцепаніды...

Многа часу прайшло ад таго здарэння, праз якое да сённяшняга часу памятаюць у вёсцы і з задавальненнем пры выпадку распавядаюць сваім дзецям і ўнукам. Не выключэнне і я. Уяўляю, як Сцепаніда, радуючыся цёпламу суботняму чэрвеньскаму вечару, стоячы перад маленькім люстэркам, падвязала пад вузлом валасоў квятастую хустку, апранула святочны жакет і рушыла да цэнтру вёскі, дзе моладзь наладзіла танцы. Уважліва прыглядалася, каб нічога не прапусціць. Здаецца – усё, як заўсёды. Хіба толькі Галя нешта не вельмі ахвотна пайшла на вальс з Іванам – мабыць, не спадабалася ёй, што ў перапынку ён доўга размаўляў з новай бібліятэкаркай, а ўпэўненасць, што размова была пра кніжкі, мізэрная. Ды нічога, справа маладая, паміраццa. За вярсту бачна, што кахаюць яны адзін аднаго, мо і вяселле да восені зладзіцца. «Заўтра зранку зайду да суседзяў, Галіных бацькоў, прыгледжуся, ці рыхтуюцца да вяселля,» – з такой думкай Сцепаніда накіравалася дамоў...

Не спяшалася. Надта ж ужо вечар прыгожы. Ваколь панаваў пах язміна і ліпы, цёпла, мо і салавейка заспявае... «Не толькі ж пеўняў раніцай мне слухаць, пачакаю трошкі, водарам надыхаюся, паспею яшчэ выспацца,» – з рамантычным настроем падумала Сцепаніда і прысела на кусок зрэзанага вялізнага дуба, які ляжаў каля веснічкаў яе хаты і ўжо многа гадоў выконваў ролю лаўкі. Не прайшло і колькі хвілін, як яна пачула галасы і ўбачыла размытыя цемрай постаці. «Відаць, Іван Галю дамоў з танцаў праводзіць. Трэба схавацца, каб іх не спалохаць, хай сабе ідуць. А мо і пра вяселле што ненарокам пачую,» – маланкава пранеслася ў галаве Сцепаніды. Хуценька падхапілася і схавалася ў вялізны куст бэзу, каля якога якраз і знаходзіўся дублаўка...

Гэта і сапраўды былі Іван з Галяй. Відаць, ім таксама вельмі падабаўся і гэты цудоўны вечар, і гэты дуб – не захацелі ісці далей і селі. Такой змены сюжэту Сцепаніда не чакала, але вылазіць было сорамна. На лаўца, як кажуць, і звер бяжыць – пашчасціла нашай Сцешы, бо Галя раптам заспяшалася дамоў, успомніла, што заўтра з мамай паедуць першым аўтобусам у горад, трэба ж ужо пра вясельную сукенку клапаціцца. Весела падхапіліся і хуценька пайшлі – як быццам, іх тут і не было. Ад непрадбачна пачутай звесткі пра вяселле ў жанчыны стала радасна на душы. Каму ж кепска, калі моладзь кахаецца і жэніцца? «Відаць, і мяне на вяселле запросяць, я ж Галінаму бацьку раднёй даводжуся, хоць і чацвёртай стрэчы,» – такія думкі надта пасавалі гэтай цудоўнай ночы і Сцешынаму лагоднаму настрою. Не хацелася нават варушыцца, маладая лістота бэзу прыемна краналася шчакі, і Сцепаніда не заўважыла, як заснула...

Раніцай тата стаяў каля веснічак і чакаў, каб усе гаспадыні, што жывуць за мостам, паспелі прыгнаць



сваіх каровак – была наша чарга агульны статак пасвіць. Але ж штосьці незразумелае рабілася, калі каровы параўноўваліся з кавалкам дуба ля двара Сцепаніды: яны раптам спыняліся, паварочвалі галовы ў бок куста бэзу і пачыналі мычаць. Прыходзілася падганяць іх дубцом, каб рухаліся далей. А чаго ж гэта Сцепаніда карову не выганяе? Тата падыйшоў бліжэй: тручы кулакамі заспаныя вочы, Сцепаніда, седзячы ў кусце, разгублена круціла галавой, не разумеючы, дзе яна. Усім астатнім усё было зразумела... Харошы пост праспала.

Дружны рогат прысутных хутка прывёў заспаную спадарыню ў пачуццё. Тата чакаў, трэба ж было Сцепанідзіну карову да статку забраць. Калі сваячка падыйшла з поўным вядром сырадою, ён жартоўна заўважыў: «Суседка, мо табе ў раённую газету працаваць уладкавацца? Будзеш добрай спецыяльнай аглядальніцай навінаў». Моўчкі Сцепаніда колькі хвілінаў сур'ёзна паглядала ў яго бок і раптам з нечаканай усмешкай адказала: «Якой «аглядальніцай»?! Я ж нічога не бачыла, толькі чула, вельмі ж цёмна ў кусце было...»

Мушу дадаць, што нават гэтае здарэнне не паўплывала адмоўна на развіццё таленту Сцепаніды. І нават у больш сталым узросце яна не абыходзілася без прыгод, якія здараліся пры зборы інфармацыі. Яе працягвалі любіць вяскоўцы, бо ткала кросны інфармацыі яна лепш за іншых – без злосці, подласці, нават, наадварот – з жаданнем дапамагчы носьбітам навінаў. Здаралася, што дапамагала. Памятаючы пра «трэцяе» вуха Сцепаніды, у некаторых надоўга прападала жаданне сварыцца. А што тычылася кахання – хай сабе распавядае, каму ж яно шкодзіць? Супраць гэтага нікога не было.

## Струны рвуцца

Вяселле гулялі ўсяго два дні, бо жаніх быў прыезджы, ажно з самога Уралу, і пераезду вясельнага картэжу ад нявесты да жаніха адбыцца не магло, да авіяпералётаў вяскоўцам было так далёка, як да самога неба. Яно, канешне, можна было б і цягніком, як раіў самы старэйшы жыхар вёскі дзядзька Серафім, але ж на каго пакінуць сваю і калгасную гаспадарку? Ды і з другога боку – колькі гэта патрэбна напояў і ежы з сабой узяць, каб хапіла на ўсё падарожжа, вяселле ж не павінна спыняцца на сярэдзіне? Улічваючы тое, што амаль трэцяя частка жыхароў вёскі была раднёй маладой, а астатнія – суседзямі ці сябрамі, то ўсім мірам вырашылі, што вяселле будзе ў скарочаным варыянце з частковай кампенсацыяй: замест аднаго з паловай дзён у нявесты і ў жаніха паасобку будуць поўныя два дні ў нявесты, на адным месцы. А жаніх з'явіцца з дружбантамі ад сваёй цёткі. Гэтая акалічнасць трошкі засмучала моладзь (калі па праўдзе – то не толькі яе), бо адзін дзень весялосці ў прыемным асяроддзі, з дзіўна таленавітымі і знакамітымі на ўвесь раён музыкантамі, трыма Алесямі (гарманіст, скрыпач і барабаншчык), усё ж быў скасаваны. Ды што ж рабіць? Хочаш ці не, але абставін заставацца гуляць на панядзелак нават у самых заўзятых і адмысловых весялуноў не заставалася.

Але калі добра разгледзець гэтую справу, то ўжо і грэх было праяўляць незадаволенасць, бо магчымасцей для дэманстравання наяўных, расквітнеўшых за паўгода ад апошняга вяселля талентаў, у кожнага было дастаткова. Вазьмі хоць дзядзьку Павала – хіба можна было ўявіць яшчэ дзень назад, што ён, паважны і зухаваты ўдавец з кучаравай, хоць ужо і сівой шавялюрай на галаве (можа, з гэтай нагоды яго і клікалі ў вёсцы

Павалам замест Паўла па пашпарце), пасля трэцяй чарачкі працяжна, на прыгожай высокай ноце зацягне: «Живёт мая отрада-а в высоком терему-у-у,» – пры гэтым абмахваючыся ад гарачыні, нібы веерам, ражэчкам хусткі ўсё яшчэ прыгажуні Алены, цёткі жаніха, якая жыла ў суседняй вёсцы. Праз Алену і адбылося знаёмства нашых маладых, бо гэта ж яна сказала свайму пляменніку Валодзю, калі той прыехаў да яе пагасціць: «Жаніцца табе ўжо час, і нідзе ты лепшай жонкі, чым Міколава Галя, не знойдзеш. Прыгледзься да яе». Той і прыгледзеўся, паклікаў Галю ў жонкі, яна згадзілася – вось вяселле і гудзіць. Ладная пара атрымалася. Абое чарнявыя, рухлявыя, выхаваныя ў працы – яны з паўслова разумелі адзін аднаго. Каханне не прымусіла сябе доўга чакаць – з'явілася раптам, як быццам па словах Алены, якая ў гэтай справе не памылілася, бо з дзяцінства ведала і Валодзю, і Галю.

Сама Алена жыла адна, мела ўжо больш за сорак гадоў, але замуж не выйшла, хоць і прэтэндэнты на яе руку і сэрца трапляліся. Высокая, ладна складзеная, з прыгожа ўложанай вакол галавы касой, яна і сёння выклікала зайздрасць у многіх жанчын, але не звяртала на гэта ўвагі – усмешка не сходзіла з яе губ і вельмі пасавала да цёмных вачэй і разружавеўшагася твару. Сватаўся да яе аднойчы і Павал, а сватам ў гэтай справе ён запрасіў быць свайго суседа, адмысловага спевуна і веселуна. Алена запрасіла гасцей за стол, пачаставала, а калі трэба было ўжо трымаць адказ, сказала: «За свата твайго, Павал, пайшла б, а за цябе, пакуль што – не». Яе «пакуль што» не давала спакою гэтаму чалавеку, надзею ён не страціў. І, мабыць, меў рацыю, бо інакш, як растлумачыць тое, што на вачах усіх гасцей Алена дазваляла Павалу абмахвацца яе хусткай?..

Песню пра церам спявалі з пачуццём, потым перайшлі на частушкі. Дзіўная справа, здаецца, што

ўжо ведаеш наперад, хто якую сваю «каронную» частушку заспявае, а кожным разам знаходзяцца новыя, нібы шла паміж працай у кожнага падрыхтоўка, як у тэатры, новага рэпертуару. Калі час і жаданне людзі знаходзілі? А можа, у тым і ёсць асаблівасць жыцця ў вёсцы, побач з прыродай, што ўсе гэтыя трапныя прымаўкі, пагаворкі, філасофскія казкі і прыпеўкі там нараджаюцца ў людзей самі па сабе, з'яўляюцца, як новае лісце на дрэвах вясной, і ніхто не заўважае, калі гэтая дзея адбываецца. «Кожнаму сваё,» – так часта сцвярджаў дзядзька Серафім, калі яго жонка дапытвалася, напрыклад, чаму ж ён зноў не паспеў да дажджоў, як усе людзі, дроў нарыхтаваць. А у самыя крытычныя моманты ён дапаўняў:

Памідоры, агуркі –
Восенню ў карзіне.
Хтосьці ездзіць на кані,
Хтосьці ў лімузіне.

Ну, што тут яшчэ тлумачыць?..

Весялосць лілася цераз край. І маладыя, і госці былі задаволены, не стаміліся, не гледзячы на тое, што амаль дзве гадзіны цягнуўся абмен падарункамі. Сват паважліва, з прыгаворкамі і жартамі выклікаў на падарунак спачатку хросных і родных бацькоў, потым сваякоў, апасля сяброў, суседзяў. Падарункі ўсім дэманстраваліся, часам былі з якой-небудзь неспадзянкай. Сярод гасцей былі і тыя, хто адорваў маладую сям'ю цялушкай, авечкай, ці нават парсючком. Такі падарунак, канешне, не паказваўся, але каб аб ім не забылася, сват некалькі разоў гучна аб'яўляў, што ён усё запісаў на столі супраць покуці, і вызначаў тэрмін перадачы абяцаных жывых дароў. Потым наступіў час нявесты: яна не толькі ўручала свае падарункі бацькам і блізкім родным жаніха, але і нядоўга танцавала пад гукі гармоніка і скрыпкі з кожным з іх. Пры гэтым сват

нахвальваў прыгажосць і годнасць Галі. Параўноўваючы яе то з ясным сонейкам, то з чырвонай ружай, то з хуткім, працавітым ручайком, то са спелай вішанькай, звяртаўся да жаніха, яго бацькоў і радні з пажаданнем любіць, берагчы і шанаваць такую дбайную маладзіцу і абяцаў бацькам Галі трымаць на гэтым фронце пільны кантроль. Кожнаму госцю наліваўся кілішак ад маладых. Адорванне – вельмі прыемная і цікавая для ўсіх частка вяселля, бо кожны бок меў магчымасць паказаць на людзях сваю павагу, любоў і добрыя адносіны, цеплыню сэрца і шырыню душы. Нездарма людзі кажуць, што не тое страціў, што аддаў, а тое, што схаваў.

Тым часам, пацішу набліжаўся вечар. Немясцовыя госці адзін за адным ад'язджалі, разыходзіліся і вяскоўцы па вечаровых гаспадарчых справах, заставалася толькі некалькі суседзяў. Ды і то праўда – куды ім спяшацца, калі да роднай хаты ўсяго колькі крокаў (праўда, часам вельмі цяжкіх), а вясельныя сталы яшчэ не пустыя, можна на развітанне пачаставацца, пагутарыць спакойна.

Пара ўжо і музыкам складваць свае інструменты. Самы сталы з іх, скрыпач, падышоў да гаспадара, штосьці ў яго запытаўся і накіраваўся да гаспадыні Ліды, маці Галі, якая якраз развіталася з чарговым госцем. Нахінуўшы галаву, ён запрасіў яе на танец. Ліда спачатку разгубілася, але, глянуўшы на Мікалая, усё зразумела і, хутка развязаўшы вышыты фартушок, сціпла працягнула руку Алесю. Той кіўнуў гарманісту і пад шыкоўныя гукі вальса, закружыўся разам з Лідай. Чароўныя ноты спынілі размовы нешматлікіх прысутных. Штосьці незвычайнае і адначасова вельмі сапраўднае было ў гэтым танцы двух немаладых людзей. Яна, гэтая незвычайнасць, адсвечвалася неспадзяванай пяшчотай на тварах прысутных, нават здавалася, што сцішыўся час. Нечаканым і дзіўным было не толькі



тое, што танчыў скрыпач, прыгожымі рухамі постаці і сівой галавы выклікаючы захапленне ў прысутнай моладзі, не тое, што Ліда на якісьці момант на вачах усіх зрабілася маладой і вабнай жанчынай і не тое, што замілаванне жонкай Мікола ўжо не мог схаваць у глыбіні сваіх сініх стомленых вачэй. Кожны разумеў – адбываецца нешта такое, што ніколі больш не будзе мець паўтору і ніколі не забудзецца...

Танец быў нядоўгім. Алесь падвёў Ліду да Мікалая, падзякаваў за дазвол патанцаваць з яго жонкай. Той, у сваю чаргу, выказаў вялікае задавальнне добрым музычным аздабленнем вяселля, каля веснічкаў моцна паціснуў руку кожнаму музыканту. На тым і развіталіся. Уваходзячы ў хату, Мікалай беражліва пагладзіў гладкія валасы Ліды і, гледзячы ёй у вочы, прашаптаў: «Вось і аддалі замуж дачушку, разумніца ты мая...»

Быў у вёсцы чалавек, які добра разумеў такі нечаканы вясельны фінал. І гэта – дзядзька Серафім, сведка гісторыі, што адбылася амаль што дваццаць пяць гадоў назад. У гэтай жа хаце было вяселле, толькі маладымі былі Ліда і Мікалай. А сватам на гэтым вяселлі быў дзядзька Серафім. Музыкамі якраз былі тыя ж Алесі, толькі шмат маладзейшымі. Запаліла каханне ў сэрцы Алеся прыгажуня нявеста з першага погляду – скрыпач, як ні стараўся, нічога з сабой не мог зрабіць, – маладая кроў, як вядома, на каханне хуткая. Гулянка ў жніўні была, вокны вечарам ва ўсёй вясельнай хаце былі адчынены, у тым ліку і з боку ад нявесты. Пакінуўшы сябрам скрыпку з парванай струной, Алесь пайшоў на вуліцу і, стоячы пад акном за спіной Ліды, ціха і горача шаптаў ёй аб каханні і ўпрошваў збегчы з вяселля разам з ім. Але Мікалай, дзякуй Богу, з аднаго погляду ўсё зразумеў і ціха, але строга запытаў: «Ты чаго, Алесь, тут пад акном стаіш, табе ж у хаце іграць трэба, людзей весяліць. Сябры так не робяць».

Апусціўшы вочы, напоўненыя слязьмі, Алесь сумна і з цяжкім сэрцам прамовіў: «Струны рвуцца, Мікалай».

Госці так нічога і не заўважылі. Вяселле адбылося, як і мела быць. Струну Алесь змяніў. Музыкі пранікнёна рабілі сваю справу, было весела. А што скрыпач быў сумны – то гэта хіба творчы настрой. Можа, ён па характару такі сур'ёзны... Свату ж Мікола даручыў не спускаць з Алеся-скрыпача вачэй – на ўсялякі выпадак...

І хто ж яго ведае, можа, такім чароўным быў гэты сённяшні вальс Ліды з Алесем менавіта таму, што на тым далёкім вяселлі парваліся струны толькі на скрыпцы. Здолелі ж яны не парваць струны душаў сваіх. Дзіўная і надта далікатная гэта рэч – душа чалавека, моцна трымацца часам трэба, каб пачуць яе яшчэ мацней, каб не згубіцца сярод бясконцых спакусаў...

## Танцы. Танцы?.. Танцы!

Гукі вясковага працоўнага дня паступова сціхалі, губляліся ў наплываючай пяшчотнай цішыні летняга вечару і ўжо заставаліся недзе там, у гісторыі, а зараз пачынала панаваць сціплая, а таму да болю кранальная прыгажосць надыходу кароткай летняй ночы. У гэтыя нядоўгія хвіліны знаходзілася месца і ціхаму ветрыку, і мяккаму свету нябесных зоркаў, і малочнаму паху жылля, які быў незвычайна аздоблены непараўнальнымі нотамі ад мноства траў і кветак. Мабыць, нават самы таленавіты знаўца-парфумер не здолеў бы стварыць водары, якія маглі хоць здаля быць падобнымі да тых, што ў наваколлі, непаўторных і зменлівых, як прыгажосць жанчыны ў розную пару яе ўзросту. Бо хіба ж можна перадаць пах пралескі ў руках маладзенькай дзяўчынкі-падлетка, лёгкі, як вясновы вецер, пах чаромхі і бэзу каля хаты гарэзлівай чарнавокай дзяўчыны, галавакружальны і спакуслівы, як каханне, пах язміну ў кветніку пад акном чырванашчокай маладухі, які на пачатку лета аддае правы мядоваму паху ліпы, каб супакоіць усе сэрцы і  павольна наблізіць іх да хараства паху ліліі – кветкі яскравага сонечнага лета жыцця жанчыны-каралеўны. А потым – восень з водарам вяргіняў, яблык і грушаў – плёнам пражытых пачуццяў і незабыўных мятна-рамонкавых успамінаў. Дзівоснае цуда сусвету – даць столькі магчымасцяў чалавеку для адчування прыгажосці асяроддзя, у якім той жыве...

Так і скончылася б непаўторнасць сённяшняга летняга вечара, калі гэта не была б субота. Ужо апоўдні гаспадары прыладзілі свае косы пад стрэхі, бо заўтра касьбы не будзе – засталося скасіць траву ўздоўж ракі, але трэба было колькі дзён пачакаць, каб пасля наваль-

Апусціўшы вочы, напоўненыя слязьмі, Алесь сумна і з цяжкім сэрцам прамовіў: «Струны рвуцца, Мікалай».

Госці так нічога і не заўважылі. Вяселле адбылося, як і мела быць. Струну Алесь змяніў. Музыкі пранікнёна рабілі сваю справу, было весела. А што скрыпач быў сумны – то гэта хіба творчы настрой. Можа, ён па характару такі сур'ёзны... Свату ж Мікола даручыў не спускаць з Алеся-скрыпача вачэй – на ўсялякі выпадак...

І хто ж яго ведае, можа, такім чароўным быў гэты сённяшні вальс Ліды з Алесем менавіта таму, што на тым далёкім вяселлі парваліся струны толькі на скрыпцы. Здолелі ж яны не парваць струны душаў сваіх. Дзіўная і надта далікатная гэта рэч – душа чалавека, моцна трымацца часам трэба, каб пачуць яе яшчэ мацней, каб не згубіцца сярод бясконцых спакусаў...

## Танцы. Танцы?.. Танцы!

Гукі вясковага працоўнага дня паступова сціхалі, губляліся ў наплываючай пяшчотнай цішыні летняга вечару і ўжо заставаліся недзе там, у гісторыі, а зараз пачынала панаваць сціплая, а таму да болю кранальная прыгажосць надыходу кароткай летняй ночы. У гэтыя нядоўгія хвіліны знаходзілася месца і ціхаму ветрыку, і мяккаму свету нябесных зоркаў, і малочнаму паху жылля, які быў незвычайна аздоблены непараўнальнымі нотамі ад мноства траў і кветак. Мабыць, нават самы таленавіты знаўца-парфумер не здолеў бы стварыць водары, якія маглі хоць здаля быць падобнымі да тых, што ў наваколлі, непаўторных і зменлівых, як прыгажосць жанчыны ў розную пару яе ўзросту. Бо хіба ж можна перадаць пах пралескі ў руках маладзенькай дзяўчынкі-падлетка, лёгкі, як вясновы вецер, пах чаромхі і бэзу каля хаты гарэзлівай чарнавокай дзяўчыны, галавакружальны і спакуслівы, як каханне, пах язміну ў кветніку пад акном чырвонашчокай маладухі, які на пачатку лета аддае правы мядоваму паху ліпы, каб супакоіць усе сэрцы і павольна наблізіць іх да хараства паху ліліі – кветкі яскравага сонечнага лета жыцця жанчыны-каралеўны. А потым – восень з водарам вяргіняў, яблык і грушаў – пл
ёнам пражытых пачуццяў і незабыўных мятна-рамонкавых успамінаў. Дзівоснае цуда сусвету – даць столькі магчымасцяў чалавеку для адчування прыгажосці асяроддзя, у якім той жыве...

Так і скончылася б непаўторнасць сённяшняга летняга вечара, калі гэта не была б субота. Ужо апоўдні гаспадары прыладзілі свае косы пад стрэхі, бо заўтра касьбы не будзе – засталося скасіць траву ўздоўж ракі, але трэба было колькі дзён пачакаць, каб пасля наваль-

ніцы сыйшла вада. Жаночая частка вёскі зранку пераварочвала скошаную ўчора траву, зграбала сухое сена, потым завіхалася ў хаце, двары і ў лазні, каб паспець да вячэры ўсюды навесці чысціню і парадак, пацёрці загарэлыя да чарнаты плечы хлапчукоў і пачасаць пабеленыя сонцам, мокрыя валасы дзяўчынак. Ды і самім памахаць пахучым новым венікам вакол сябе і гаспадара не грэх. Пасля вячэры хтосьці накіраваўся праменька да ўтульнай пасцелькі, хтосьці ішоў на пасядзелкі на лаўку да суседзяў, каб трошкі пагутарыць, падыхаць чароўнымі водарамі лета. Усё ціха і велічна, як і належыць быць, калі на змену вечара павольна наплывае ноч...

Аб тым, што гэтая цішыня будзе нядоўгай, ведалі дзяўчаты. Бо нездарма ж зранку, калі яны на лузе ля ракі зграбалі сена, хлопцы на другім беразе цікавіліся, што прыгажуні будуць рабіць вечарам. «Спаць будзем,» – гарэзліва адказвалі яны, усім сваім выглядам сцвярджаючы супрацьлеглае. А было ў тыя дватры гады так, што на гэтым беразе ў вёсцы падрасло шмат дзяўчат на выданне, затое ў суседзяў за ракой болей было самастойных, ужо пасля службы ў войску, хлопцаў. Хтосьці жыў і працаваў у вёсцы, а хтосьці – у другім месцы, але напрыканцы тыдня прыязджаў да бацькоў. Скарачаць суботнія вечары разам моладзі суседніх вёсак было намнога цікавей. Вось і пакручваліся дзяўчаты ля люстэрка, услухваючыся ў цішыню. Ад сэрца адлягло, калі ад лесу, што паласой цягнуўся вакол вёскі, пачалі разлівацца гукі гармоніка-зазывалы. Гэта азначала, што сёння ў вёсцы будуць танцы...

«Татачка, не засынай, – казала Галя, хутка забягаючы ў пакой. – Ужо гармонік чуваць, усё роўна табе патрэбна будзе ўставаць, каб бубен хлопцам вынесці, танцы ж будуць». Уважліва паглядзеўшы на дачку, Рыгор, знакаміты вясковы пявун і ўладар барабану, які

яму аднойчы на кірмашы аддалі ў давесак даплаты за авечку, прыслухаўся да гукаў за акном і спакойна адказаў: «І хто ж табе сказаў, што я сплю? Як бачыш – не. Але і барабан я нікому давяраць не збіраюся, калі спатрэбіцца – сам барабаніць буду». На гэта і разлічвала Галя, бо ведала, што татка вельмі любіў прымаць удзел у музычных справах моладзі. Адказнасць за бубен у вуснах Рыгора заўсёды гучала, як важная дзяржаўная справа, абавязковая да выканання, таму на танцы вымушана была збірацца і Ганна, яго жонка, бо аднаго яго адпускаць было небяспечна – на чуб Рыгора да гэтай пары заглядвалася не адна жанчына. Ды і, па сакрэту кажучы, Ганне яшчэ і самой калі-нікалі хацелася закружыцца ў вальсе – у юнацтве яна была адмысловай танцоркай.

Зусім іншы сюжэт разварочваўся ў хаце Васіля і Валі, бацькоў шасцігадовага хлопчыка і трохгадовых дзяўчынак-блізняткаў. Пачуўшы гукі гармоніка, Васіль заспяшаўся на ганак, трэба было ў цемры навобмацак знайсці належныя туфлі – ён без доўгіх роздумаў збіраўся на танцы. «І калі ўжо ты натанцуешся? Хоць бы людзей засаромеўся – трое дзяцей ў хаце,» – шэптам, каб не збудзіць дзяцей, з ноткамі незадавальнення казала Валя. Стомленая клопатамі гаспадаркі і малымі дзецьмі, яна ўвесь час хацела спаць. Ёй і ў маладосці танцы не былі асалодай, а зараз, расквітнеўшай пасля родаў, павольнай і дароднай жанчыне гэтыя выкрунтасы былі зусім не даспадобы. Завязваючы шнуркі на туфлях, Васіль адказаў: «Ідзі, калі ласка, апранайся, пакуль я за мамай збегаю, каб за дзецьмі прыгледзела, ты ўжо падрыхтаванай будзь, трошкі патанчым і вернемся, ніякага сораму тут няма». Так і зрабілі. Валя ведала, што перайначыць Васіля наконт танцаў было немагчыма. Праз паўгадзіны, з зачэсанымі на бок светлымі валасамі, у блакітнай святочнай кашулі, Васіль у

ліку першых ужо падыходзіў да месца, радасна паглядаючы на жонку ў прыгожай, з рамонкамі сукенцы, моцна трымаючы яе за руку. З розных бакоў сюды ўжо накіроўвалася моладзь і тыя больш сталыя людзі, каму не спалася, бо хацелася «і на другіх паглядзець, і сябе паказаць». Вакол музыкі з гармонікам кучкаваліся наляцеўшыя, як мухі на мёд, «зарэцкія» хлопцы. Яны незаўважна, але з вялікай цікавасцю, пагладалі на падыходзячых дзяўчат...

Танцавалі гэтым летам у недабудаванай хаце Сямёна, бо невялічкі будынак клуба патрабаваў рамонту. Яно і лепей: падлога ў хаце ўжо была ўкладзена, а прастора яшчэ не падзелена на жыллёвыя памяшканні. Сямён ахвотна згаджаўся на «танцавальную арэнду», бо, па сакрэту ад жонкі, яму ад хлопцаў сёе-тое трапляла ў кілішак, і ён з задавальненнем распавядаў, што ў «натанцаваным доме» ім з жонкай жыць будзе весела. Часцей за ўсё на гармоніку граў Валодзя, электрык з суседняй вёскі, які з'яўляўся не толькі паважаным знаўцам уласцівасцяў электрычнага току, але і добрым музыкам-самавучкай. Быў ён невысокага росту, з цёмнымі кучаравымі валасамі, меншым у сям'і. Старэйшыя два яго браты былі ўжо сямейныя, жылі ў раённым цэнтры. На Валодзю бацькі мелі надзею, што пасля жаніцьбы ён будзе жыць побач з імі. Вельмі радаваліся, калі сын пажадаў вучыцца граць на гармоніку, бо гарманіст заўсёды меў у дзяўчат перавагу перад іншымі хлопцамі, нават на рост увага не звярталася. Валодзю падабалася праз гукі гармоніка выказваць настроі мелодый. Асабліва добра яму гралася, калі побач знаходзіўся бацька прыгажуні Галі – дзядзька Рыгор са сваім барабанам, якім ён вельмі дасканала адцяняў і падтрымліваў гармонік, дапамагаў перадаць непаўторнасць кожнай песні ці танца. А што тычыцца полькі – то пераўзысці іх выкананне гэтага твору не давялося ніко-

му, нават знакамітым музыкантам з суседняга раёна, якія суправаджалі вяселлі, калі жаніхі былі з іх боку. Валодзева ўласна складзеная полька спачатку была няспешнай, давала магчымасць танцорам адчуць і трапіць у рытм гармоніка з барабанам, а ўжо потым пачынаў адбывацца нейкі цуд: мудрагелістыя беларуска-руска-польскія пераборы былі пераменлівымі, нечаканая лірычнасць раптоўна змянялася хуткімі і іскрыстымі, як навальнічныя ручаі, спалучэннямі рытмаў, вытрымліваць якія ў танцы мог не кожны – толькі тры-чатыры пары заставаліся ў крузе да заканчэння такой адмысловай полькі.

Калі-нікалі паміж парамі танцораў пачыналася прыхаванае спаборніцтва, пераможцам лічыўся той, які быў у руху танца, пакуль не пераставаў расцягваць мяхі гармоніка музыкант. Нязменным удзельнікам такога своеасаблівага марафону амаль заўсёды з'яўляўся Васіль. Танцаваць ён звычайна пачынаў са сваёй жонкай. Стамлялася Валя хутка, Васіль з павагай усаджваў яе на лаўку каля музыкантаў, сам часцей за ўсё ішоў запрашаць швагерку Ніну, маладую і вёрткую, спартыўна складзеную, вельмі здатную да полькі (змена партнёршаў у польцы не забаранялася). Тады пачынаўся сапраўдны танцавальны спектакль, бо Васіль дэманстраваў усе свае магчымасці па частцы выкрунтасаў нагамі, Ніна ледзьве паспявала патрапляць гэтаму хуткаму рытму, пры тым трэба ж было яшчэ і музыкаў слухаць. Сваю партнёрку Васіль у час танца трымаў не насупраць сябе, а трошкі збоку, бо інакш як жа ён змог бы, затрымаўшыся на абцасах якую хвіліну, каб удыхнуць паветра, раптам крутануцца на іх разам з дзяўчынай і пачаць хутка і дробна перабіраць нагамі пад кожную нотку, вылятаўшую з-пад пальцаў гарманіста. Пры гэтым ён роўна трымаў постаць, а валасы так і заставаліся нерухома зачасанымі на бок. Калі ён



навучыўся так танчыць, не ведалі нават бацькі. Вось і сёння, атрымаўшы сваю чарговую перамогу, Васіль, як і абяцаў жонцы, паважна накіраваўся да дзвярэй, клапатліва падтрымаўшы Валю, калі тая пераступала парог сенцаў. Заўтра раненька трэба на луг – Васіль быў галоўным конюхам, адказваў аж за трыццаць калгасных коней…

Пасля кароткага перапынку Валодзя вырашыў граць кракавяк. Гэты танец падабаўся танцорам рознага ўзросту. Ён таксама быў энергічным, але меў тую асаблівасць, што на працягу яго ўвесь час адбываўся абмен партнёркамі па танцу. Усе пары танцавалі, прытрымліваючыся ўяўнай акружнасці. Потым мужчыны заставаліся ў цэтральнай частцы круга і прыгожа так вялі жанчын за руку па яго вонкаваму боку, прытанцоўваючы, як рысакі, перад імі. У належны момант чулася каманда ад вядучага першай пары: «Адна – уперад!» Тады кожная танцорка пераходзіла да папярэдняга мужчыны і ўвесь праход круга кружылася з ім. Заўсёды знаходзіліся тыя, хто хацеў патанцаваць з той ці іншай дзяўчынай даўжэй, і каманда на пераход наўмысна не падавалася. А бывала і так, што за адной фразай праз хвіліну чулася другая: «Яшчэ раз!» Так «тонка» у час гэтага танца хлопцы маглі выказваць сімпатыі да сваіх сяброўак на вачах усей прысутнай грамады.

Але часцей за ўсё танцавалі вальс, некалькі разоў музыка абвяшчаў яго «белым». А як іначай, трэба ж было і мужчынам пахваляваццa, ці запросяць іх, ды і жанчынам таксама хацелася мець права на выбар. Самым прыгожым у гэтым танцы было тое, што можна было назіраць грацыю і прыгажосць рухаў кожнага, бо танцаваць вальс мясцовыя настаўнікі вучылі ўсіх яшчэ ў пачатковай школе. Грацыёзна адкінутая галава, задумёны погляд, ладная постаць у прыгожай сукенцы

ці спадніцы, якія кружыліся разам з гаспадыняй, рыцар побач з каралеўнай – усё гэта было рамантычна і казачна, зусім не падобна да таго працоўнага жыцця, што было днём. У такі момант часам не вытрымліваў нават Рыгор, ён пакідаў бляскаць у барабан і запрашаў на танец сваю каханую Ганначку. Казачнасць моманту распаўсюджвалася і на тых, хто прыйшоў сюды, каб паглядзець на моладзь, на сваіх і на чужых дзяцей, паразмаўляць з суседкай, бачыць усё сваімі вачамі і, канешне ж, атрымаць інфармацыю для складання далейшых прагнозаў жыцця вёскі. Сярод гэтых наглядальнікаў былі і вельмі таленавітыя, бо, не горш за сённяшнюю відэакамеру, яны маглі на працягу каторага часу перадаваць усе падзеі і пачуцці вечара, нават тыя, якіх яшчэ не было. Часам, яны таксама не вытрымлівалі і ўцягваліся ў танцавальны працэс, а калі не дазваляў узрост ці здароўе, прытанцоўвалі нагамі, седзячы на доўгіх лаўках, прадбачліва прынесеных Сцяпанам...

Нязменнай уладарніцай аднаго месца на лаўцы была шасцідзесяцігадовая цётка Кацярына, добрая гаспадыня вялікай гаспадаркі, спагадлівая жонка параненага ў вайну Івана. Мабыць, яна і сама дасканальна не ведала, колькі ў яе гусей, качак і курэй. Паспявала спраўляцца з любой справай: акрамя ўласнай гаспадаркі, не адставала ад маладых і на калгасным полі, і ў лузе. А якія ж прыгожыя дываны ткала яна з суседкамі ў доўгія зімнія вечары! Яны ўпрыгожвалі не толькі ложкі ва ўласнай хаце, але і ў кватэрах дачкі і нявесткі, якія жылі ў Мінску. Дзеці часта наведваліся да бацькоў, дапамагалі ў гаспадарцы, самі ж усе працавалі на трактарным заводзе, куды трапілі па размеркаванню з раёна. Энергічнасць Кацярыны не абмяжоўвалася дзённай працай. Нейкім незвычайным чынам яна ведала, хто ўвечары прыходзіў пасядзець на лаўцы ля

дома ўдавы Волькі, з кім пасля кіно вярталася дамоў дачка Марылі і як доўга яны гутарылі, стоячы каля веснічкаў. Праз танцы ўжо і казаць няма чаго – здаецца, што без прысутнасці цёткі Каці яны проста не маглі б адбыцца. І хоць жылі яны на краі вёскі, на танцы да Сцяпана яна не спазнілася. Нягледзечы на ўзрост, Кацярына была яшчэ вельмі жвавай. Збіралася хутка, зверху любімай цёмна-бардовай сукенкі з шырокім падолам апранула сіні жакет. А каб падол выглядаў яшчэ шырэйшым, пад сукенку апранула споднюю спадніцу, якая была падшыта новымі палатнянымі карункамі. Такія споднія спадніцы ў нашай мясцовасці называліся «галькамі», лічылася добрым густам, калі карункі «галькі» пры рухах трошкі віднеліся з-пад падолу. Кацярына ведала, што калі яна будзе ўладкоўвацца на лаўцы, «гальку» абавязкова заўважаць. Гэтая акалічнасць яе падбадзёрвала ісці хутка, яна нават Іванаў ліхтарык узяла, каб падсвечваць у цёмных месцах вуліцы. Сам Іван бавіць дарэмна час на танцах не згадзіўся. Ён падвёў сваю танклявую жонку да веснічкаў, сказаў, што дзверы зачыняць не будзе, каб яна меней грукала, калі вернецца дамоў.

Першы вальс знаёмстваў ужо амаль закончыўся, калі Кацярына ўбачыла месца на лаўцы, якраз насупраць гарманіста. Яна лёгка прысела, ліхтарык схавала ў кішэню жакета. Прыемна было бачыць дзяцей сваіх аднавяскоўцаў, ў думках парадавалася, што на наступным тыдні прыедзе дачка, удзвюх будзе весялей схадзіць на танцы. Пачынаўся кракавяк. Тут нічога нельга было прагледзець! Во, у першую пару стаў нейкі незнаёмы хлопец з Рыгораваў Галяй. Цікава, ці ахвотна ён будзе зменьваць танцорак? Запальны рытм танца на колькі хвілін перабіў яе разважанні, і Кацярына ажно прыўзнялася, прыстукваючы абцасамі разам з дзяўчатамі. Калі танец скончыўся, частка моладзі выйшла

на вуліцу, каб трошкі надыхацца свежым паветрам. У хаце зрабілася прасторна і не гэтак шумна. Кацярына з цікавасцю разглядвала дзяўчат, якія кучкаваліся на супрацьлеглым баку памяшкання, круцілася на лаўцы ў розныя бакі, каб добра разгледзець усіх. У якісьці момант пачуўся смех, дзяўчаты падштурхоўвалі адна адну, паглядваючы ў бок цёткі Каці. Тое ж самае здаралася і з тымі, хто вяртаўся з вуліцы, – рот расплываўся ад усмешкі, калі ў поле зроку трапляла Кацярына. І недарэмна, бо пасярод ейных каленяў, асвятляючы яе жакет, нешта вельмі ярка свяцілася. Калі Кацярына паворочвалася, светлячок таксама зменьваў кірунак, што выклікала ў прысутных не проста ўсмешкі, людзі ўжо рагаталі. А тым часам сама Кацярына разгублена ўсміхнулася, трывожна аглядаючы залу і запытаўшыся у суседкі: «А-а-а, у чым тута справа? З чаго такі... смех?» Тая сур'ёзна глянула на яе і толькі пацiснула плячыма, бо сама нічога не разумела. Становішча выратаваў сусед Міша. Як толькі пачуліся чарговыя гукі гармоніка, ён подбегам накіраваўся да Кацярыны і запрасіў яе на танец. Жанчына са здзіўленнем згадзілася. Калі ўстала з лаўкі, Міша запытаў: «Што там у цябе пад адзеннем падсвечваецца?» Колькі хвілінаў усе напружана наглядалі, як расхваляваная Кацярына, абмацаўшы сябе з усіх бакоў, дастала з кішэні... запалены ліхтарык. Прычына святла ля спадніцы і агульнага смеху народнага была паспяхова ліквідавана. Але агульная весялосць нікуды не дзелася, і ўсе весела працягвалі танчыць, а недарэчны ліхтарык на захаванне быў перададзены суседцы па лаве. Пераступаючы ў рытме мелодыі, Кацярына з задавальненнем думала аб тым, што зараз яе «галька» з новымі карункамі будзе прыкмечана і ацэнена ўсімі...

З танцаў народ вяртаўся па-рознаму: адны – пасля першай полькі, хтосьці – пасля трэцяга ці апошняга

вальса, а хто – намнога пазней, пасля таго, як змоўклі за лесам прыгожыя акорды Валодзевага гармоніка, якімі ён у чарговы раз распавядаў аб тым, пра што ніяк не адважваўся сказаць Галі словамі.

Сонца пакуль яшчэ не ўзышло. Чыстая цішыня світання паступова стала парушацца серабрыстымі гукамі бруяў па вёдрах – гаспадыні даілі кароў. Паветра напаўнялася жыццесцвярджальным пахам сырадою. Дай жа, Божа, каб так было заўсёды…

# Раздзел II

# *Мроі*

*Вершы*

## Женщине

Ворчать судьбе пока что не спеши:
«Другие и сегодня в самой гуще...»
Я не боюсь традиции нарушить,
Сказав: мудрее жить в тиши.

Когда глаза в глаза в окне души,
Сомненья и надежды, свечи, вечер,
Красивая, ты жить всё ж не спеши,
Весенняя моя, жди новой встречи.



## Зухаватая паненка

Свята мяне не мінула –
Быў на танцах учора я.
Сэрца вельмі закранула
Полька вечаровая.

Я да дзеўчыны іду,
Стаўлю рукі ў бокі я.
А яна мне: «Не пайду –
Абцасы высокія».

Вальс так хораша гучыць –
Падаю ёй руку я.
А яна мне: «Не хачу –
Крокі тут шырокія».

Да яе ледзь не бягу –
Кадрыля ж беларуская!
А яна мне: «Не магу,
Бо спадніца вузкая».

На яе зноў кінуў зрок –
«Мо клічу не ўзнёсла я?»
Зразумець ніяк не мог,
Што справа тут простая.

Крок, абцасы ці сукенка
Зусім не вінаватыя.
Проста гэтая паненка
Вельмі ж зухаватая.

## К «осеннему» юбилею

Желаю Вам светить и свет дарить для всех:
Для мира целого, своих родных, коллег.
Бокал любви Вам допивать всегда до дна.
Идти дорогой вновь – прямая лишь одна.

Пусть осень подошла легко, так незаметно,
Сменив весну-гулену и стремительное лето.
Всё настоящее – для сердца лишь отрада,
Вот верные друзья, душа общенью рада.
А сердце – прежнее,  хоть за окном туманы.
Пора собрать плоды, чтоб написать романы.

Что ж, если год прибавился еще к годам?
И в вешний май уже не отыскать билета –
Вы молоды всегда, пока у жизни к Вам
Вопросов больше, чем полученных ответов.

## Калыханка

Сонейка стамілася,
Хмаркаю накрылася.
Зорачкі ўжо свецяць –
Засынайце, дзеці.

Люлі-люлі-люлі –
Вельмі вас люблю я.
Песеньку спяваю –
Баю, баю, баю.

Ночка падплывае,
У вокны заглядае.
Каб спалося добра,
Мякка сцеле коўдру.

Люлі-люлі-люлі –
Вельмі вас люблю я.
Песеньку спяваю –
Баю, баю, баю.

Засынай, дачушка,
Носік на падушку.
Спі, сынок, таксама –
Побач з вамі мама.

Люлі-люлі-люлі –
Вельмі вас люблю я.
Песеньку спяваю –
Баю, баю, баю.

Зноў для новай справы
Прыйдзе дзень ласкавы.
Ціха засынайце
І адпачывайце.

Люлі-люлі-люлі –
Вельмі вас люблю я.
Песеньку спяваю –
Баю, баю, баю.

## Мроі

Я хачу апынуцца ў малінавым краі,
Дзе зязюля бясконца гадочкі куе,
І рамонкаў нарваць на тым лузе за гаем,
І каб пальцы твае запляталі мае.

А яшчэ я хачу, каб смяяліся дзеці,
Каб яны на світанні тапталі расу,
І каб шчасце было б усім людзям на свеце,
Каб ніхто не ўзнімаў дзікай злосці касу.



## Снежная мелодия

Снег кружится-кружится
Над седою землей.
Мягко, нежно ложится
Белой легкой каймой.
Я вступаю тихонько
В это царство снегов.
И мне хочется только
Быть частицей его.
Я б тогда закружила
И тебя обняла,
Белым пухом накрыла,
Нежно так замела...
Я средь белых снежинок
Тихо песней плыву.
Я зову, ты не слышишь?
Всё зову и зову...

## На развітанне

Ну, дзе ж падзелася тваё каханне?
Згубілася ў кутах блудлівай ночы?
Ёсць толькі дым – цыгарнае згаранне,
Ён нават сонца прапусціць не хоча.

Не можа здоўжыць веліч ад падману.
Твая рука маю ўжо не трымае,
Як лес зімой – аголеныя раны.
Вясёлка ў вочы больш не заглядае.

То не каханне, бо пад яго прасам
Так стогне воля і так плачуць вочы…
Ад той хвілінкі, ад таго вось часу
Душа у цемры быць ужо не хоча.

## Пах кахання

Не сумуй, што вясна ўжо далёка за гаем.
І гармонік даўно зусім іншым ён грае.
Я пачуцці свае пакладу табе ў жменю,
Каб успомніла ты пах язменю, язменю.

Вось і лета прайшло, не лічы, што прапала.
Калі срэбра ў душы – багацейшай ты стала.
Зараз будзем мы жыць у шчаслівай надзеі.
Я кахаю цябе і дарую лілеі.

Ну, а восень звініць залатою парою.
Я жыву для цябе, я з табою, з табою.
Наша шчасце – у нас, і нідзе не загіне.
Я бягу да цябе і дарую вяргіні.

А зіма на акне нам малюе ж узоры.
Сонца мала, але ў небе ясныя зоры.
Богу «Дзякуй» кажу і чакаю спаткання.
Падарую табе пах сасновы кахання.



## Письмо маме

Ну, мама, здравствуй, вот, наконец, и я!
Пока я слабый очень, защити меня.
Твои глаза, тепло твоё и руки
Меня согреют – я боюсь разлуки.
К твоей груди прильну я, рот открою широко,
Ведь всё, что нужно мне сейчас, – грудное молоко.

А в нём белки, жиры и углеводы –
Всё это общее у нас – одной природы.
И есть еще в нем роста фактор –
С энергией такой, что ни один реактор
Не сможет силы большей дать, твоей природы –
Об этом знают все давно народы.

А соску не давай мне, мамочка, родная!
Ни финская, ни польская, ни золотая –
Она мне не нужна, мне грудь твоя милей.
Ты улыбнись, возьми к себе, согрей,
И кушать предложи мне молочко грудное.
Твой запах, взгляд, твой голос – всё родное.

Я вырасту большим, я Человеком буду.
Твою любовь и ласку не забуду.
Так сделаю, чтоб ты жила в покое…
Всё потому, что ем я молоко грудное.

*Твой новорождённый ребёнок.*

## Спешите обретать детей

Спешите обрести детей
Родных, любимых и желанных.
Средь слов в содружестве людей
Спасают два:
Любовь и Мама.

## Каханай

У іншым рэчышчы зусім
Тваё жыццё, твае падзеі.
Ды ў сэрцы раненым маім,
Каханая, жыве надзея.

Ішлі наверх, ідзем з гары –
У кожнага свае крыніцы.
Дазволь жа мне ў тваім двары
Вады з калодзежа напіцца.

Мае пачуцці без мяжы.
На твары бачу тваім стому –
Цябе пачую, раскажы.
З гітарай стану ля балкону.

Ужо сівыя валасы,
Чуб заліхвацкі мой радзее...
Мо будуць іншыя часы?
Каханая, пакінь надзею.

# Раздзел III

# *Роздумы*

*Публіцыстыка*

## Всего три шага

Очень люблю свою профессию за представленную ею возможность встречи с настоящими мамами и папами, сильными и умными, с безграничной любовью к детям и огромной родительской ответственностью. На мой взгляд, без этих встреч состояться в профессии педиатра просто невозможно. Ведь мы «приходим» в семью (а каждая семья имеет свой собственный устав и уклад) к детям, то есть к тем, кто, в конечном итоге, определяет будущее (впрочем, и настоящее тоже) как каждого из нас – мы же все члены своей семьи, так и государства в целом. А к «определяющим» фигурам отношение у всех индивидуальное. Но дело-то у нас общее, и хочется двигаться вместе, во взаимопонимании. И если хорошо подумать – это всё возможно. Ведь что у нас в жизни главное? Главное – чтобы дети были здоровы и счастливы. А порой мы в упор не видим, что счастье-то рядом, всего в трех шагах. Мне это помогли увидеть реально существующие счастливые семьи. Может, они помогут и другим – так хочется, чтобы счастливых и здоровых людей становилось всё больше.

Шаг первый. Суть его основана на том, что каждый ребенок изначально прекрасное «произведение» двоих. И очень ошибаются те родители, которые думают, что сумеют ребенку дать всё для счастья и в неполной семье, поэтому смело и бодро вступают на путь «одиночек», рожают ребенка «для себя», либо разрывают семейные узы, устраивая потом свою личную жизнь многократным методом «проб и ошибок». Увы, даже «звездным» семьям это часто не под силу. Ребенок по-настоящему счастлив лишь в полной семье (спросите об этом подростков, если не верите). А счастливые дети, как известно, здоровы и бодры. Очень важно это

помнить при устроении своей личной родительской жизни.

Шаг второй. Любить детей важно всегда: здоровых и больных, в послушании и в конфликте, успешных и не очень, с хорошим настроением и в хандре. Отношения родителей и окружающего мира к себе дети ощущают каждой клеточкой своего организма (и мышечной, и нервной). Играть в чувства с ними просто невозможно. Как матрицу, они копируют наше поведение, потом его считывают и реализовывают всю последующую жизнь. Зачем жить так, чтобы любимые наши дети считывали размолвки и конфликты, нашу раздражительность, неумение строить гармоничные отношения и ставить грань между добром и злом, наш, далекий от здорового, образ жизни. Давайте дадим возможность своим детям списать нормальную информацию – и будем всю жизнь любоваться гармоничностью своего чада, здорового и счастливого.

Шаг третий. Возможности и резервы каждого человека неисчерпаемы, каждый сам «кузнец своего счастья», вернее, наше счастье живет внутри у нас. Просто гениально поступают те родители, которые никогда при детях не обвиняют в отсутствии здоровья врачей, в наличии плохих оценок – учителей, за низкую зарплату – начальника, а детей – за несоответствие ожиданиям. Никто не может нас обидеть без нашего на то внутреннего согласия. И так важно дать детям возможность понимать, что мир населен отличающимися друг от друга людьми, но свою жизнь и отношение к ней человек строит сам, хотя иногда и в очень сложных условиях. Те родители, которые смогли это успешно сделать, никогда не услышат в свой адрес упреков о несчастном детстве и сломанной судьбе своих чад. Их дети смогут успешно найти свое место в жизни и стать счастливыми.

Вот и всё. Всего три шага, без предоплаты и без капитальных вложений, всего лишь – работа над собой. Результат этой работы стоит того, чтобы попробовать. Ведь мы же хотим здоровых и счастливых детей, которые станут здоровыми и счастливыми взрослыми и... смогут помочь стать такими и нам.



## Семейная психология

В силу своей профессии мне часто приходится отвечать многим молодым людям и родителям, да, и чего греха таить, себе самой, на вопросы: «А что значит быть хорошей мамой или хорошим папой, хорошими родителями; что это – настоящая семья? Как стать тем родителем, который всегда будет рядом в нужный момент, не мешая при этом проживать детям свою собственную жизнь со своими собственными достижениями и ошибками? Где она, эта «золотая середина», к достижению которой мы всегда стремимся, пытаясь выстраивать близкие взаимоотношения со своим ребенком?» Опыт и время всё больше и больше убеждают в том, что развитие отношений между детьми и родителями – это не какое-то определенное сиюминутное эмоциональное и загадочное событие (хотя и оно иногда надолго омрачает или, наоборот, приводит в состояние эйфории). Это самостоятельный и очень длительный процесс, состоящий из множества поступков, (а не множества слов), который продолжается всю жизнь, и на него оказывают влияние множество психологических и физических факторов, реальных событий.

Но всё имеет начало... Физическая, если так можно сказать, готовность стать родителями дана природой, как самый главный дар, нам во благо, но мы, к сожалению, часто направляем свое сексуальное поведение не на создание семьи. А когда задумываемся о ней, то уже весь запас эмоций растрачен, интерес ко многому потерян, репродуктивное здоровье ослаблено, все деньги не заработаны, а детей вдруг сильно захотелось (у друзей уже детишки к школе готовятся, с работы родителей ждут – не дождутся, утром в обе щеки расцеловывают). Дети появились... Какой же это ужас! Такой маленький

ребенок – а сколько ему всего надо. И что с ним делать? Он живет по своему распорядку, и что – мне под него подстраиваться? А быть в заточении – ни ты к друзьям, ни они к тебе? «Телек» и то некогда посмотреть. И еще это постоянное перенапряжение от ответственности, от каких-то «моральных призывов» участкового врача. К тому же, не похоже ни на кого это дитя, ой, когда из него человек будет?

Я умышленно «сгустила краски», чтобы проще было нам в этом образе родителя увидеть и себя. А если ребенок еще и от случайной беременности, не ко времени? Давайте же на минутку, нет, хотя бы на несколько секунд, представим себя на его месте… Не позавидуешь. А уже никуда не денешься, человечек уже есть, потребность быть личностью, быть любимым и желанным существует с первых минут зачатия. Просто мы ее еще не можем физически ощутимо зафиксировать. Вот и получается психологический конфликт, а он, как известно, резко ослабляет иммунитет, не дает возможности реализации заложенных способностей, мешает полноценно развиваться и вливаться в социальный коллектив. А «помогает», к сожалению, проявлению всех наследственных и приобретенных минусов. О выросших в таких условиях людях говорят: «Он и себя-то раз в год любит…» А любить, это – как? Они и не знают. Им тяжело жить самим, а еще тяжелее тем, кто с ними рядом.

А могло быть всё по-другому. Радостные ощущения от новости, что вы – причина зарождения новой жизни, вашей кровинушки, настолько сильные и неудержимые, что хочется летать, петь, говорить всем добрые слова, в том числе и Ему, еще очень маленькому, но очень красивому. Осознание того, что появится человечек, которому можно отдавать любовь и уважение, тепло и внимание, учить его всему, что умеем сами и

еще большему, заставляет просыпаться ночью от занывшей под сердцем теплой, трепетной тревоги, от зарождающейся родительской ответственности, от благодарности Богу за доверие, за ни с чем не сравнимое счастье... Ребенок родился и стал предметом семейной общей заботы, общей радости, общим смыслом жизни. А теперь давайте опять на секунды представим себя на месте уже этого ребенка – и... так хочется хоть на мгновение задержаться в этом счастливом детстве с ощущениями любви и защиты, радости общения, красоты бытия.

Мне почему-то кажется, что в такой семье никогда не будут нуждаться в коррекционной помощи психолога и психоаналитика, что все подсказки для правильного выстраивания отношений с ребенком придут изнутри интуитивно. Здесь важно, чтобы это «нутро» было и успешно жило в самих нас, родителях, и что в понятие «ответственное родительство» во всем мире, независимо от времени, вероисповедания и государственного устройства вкладывается именно то, о чем мы с вами сейчас размышляли.

## Раз-игрушка, два-игрушка

Если попросить молодых мам ответить, чего они желают своим маленьким детям, то, не задумываясь, подавляющее большинство ответит – здоровья и счастья. Такие простые и такие по-разному реализуемые понятия: от придирчиво-скрупулезного поиска ранних симптомов заболеваний на основе знаний, полученных через Интернет, у одних, до спокойного безучастия к профилактическим мерам у других (это всё касательно здоровья). Ну, а счастье – тут уж и обобщать нечего, ведь каждый родитель желает своей кровинушке того самого-самого «наисчастливейшего» счастья, ассоциируя его со своими собственными ощущениями, ожиданиями, со сбывшимися или неосуществленными детскими мечтами. Что ни говори, а жизнь наших нынешних детей стала более обеспеченной. Мы можем дать им достаток: в одежде, развлечениях, увлечениях и т.д. Правда, иногда он перерастает в излишество, от которого устают как родители, так и сами дети. Давайте более пристально рассмотрим это явление. И начнем, как ни странно это прозвучит, с игрушек.

Обилие игрушек в детских комнатах наших квартир нарастает катастрофически, у нас ведь появилась возможность купить и возможность выбрать, так что кому, а любимому чадушке в новой игрушке не откажем. И самих себя потешим – у наших родителей таких возможностей не было. Часто так увлекаемся, что не замечаем, сколько проблем и забот создаем и себе, и детям. И не только из-за того, что для игрушек уже места не хватает, но и более серьезных, тех самых, которые из понятия «здоровье».

Попробуем мысленно представить, что с нами происходит, когда необходимо срочно решить вопросы,



связанные с выбором: из предложенных нескольких должностей, покупок, школы для ребенка, модели автомобиля, места летнего отдыха и т.д. Спокойным это состояние не назовешь: беспокойство, раздражительность, переходящие в отсутствие аппетита и потерю сна (в зависимости от важности принимаемого решения). Налицо симтомы невроза.

Примерно в такую же ситуацию мы регулярно отправляем своих маленьких, горячо любимых детей. Каждый раз у них просто разбегаются глаза от изобилия выбора кукол, машин, мишек и т.д. Ребенку сложно сосредоточиться на чем-то одном, это умение приходит позже. Становится беспокойно. При этом, на мой взгляд, множество «сюжетных» игрушек еще и не помогают (если не мешают) развитию воображения, умения создавать в игре «свой детский художественный образ» происходящих событий. Вспомните, единственная кукла в вашем детстве была то школьницей, то младенцем. Для ее превращения в новый образ необходимо было подыскивать подходящие наряды. А чтобы трактор превратился в экскаватор, приходилось подумать, как это сделать, а значит сосредоточиться, поразмыслить, сообразить и вообразить. При этом мы тут же становились то учителями, то родителями, то водителями. А спалось потом лучше потому, что придуманные сюжеты отыгрывались полностью, ничто больше не беспокоило. Для наведения порядка в комнате перед сном хватало нескольких минут, и мама была довольна, не раздражалась.

Есть повод к размышлению, тем более, что статистика указывает на рост распространенности серьезных отклонений в поведенческих реакциях детей, психосоматических заболеваний. Пусковым механизмом в их развитии часто являются невротизирующие ситуации.

Вот и получается, что всё новые и новые игрушки: механические, мягкие и электронные – никак не помогают в полной мере проявить нашу настоящую родительскую любовь, подчеркнуть ее особый статус. Скорее, наоборот: в таком случае они являются попыткой «откупиться» от наших детей за хроническую нехватку времени на общение с ними, разговоры, прогулки, чтение любимых книг, совместное выполнение домашней и их «детской» работы. Ведь на кону стоит благодарность милых и любимых глазенок за теплое общение и обращение с ними. Важность зтих моментов для полноценного развития ребенка стоит того, чтобы над этим вопросом задуматься.

## Змест

Жыццёвыя імгненні на берагах памяці.
*Уступны артыкул Вячаслава Корбута* ... 3

***Раздзел І. Вясковыя замалёўкі.***
*Апавяданні* ... 5

Дзень Перамогі і кабыла ... 6
Дочкі-матулі ... 18
Імгненне ... 23
Мужчынская салідарнасць ... 27
Колік ... 34
Мясцовыя асаблівасці ... 44
Пасхальная песня соловья ... 53
Першыя канікулы ... 57
Дымящаяся пустота ... 62
Подых дзяцінства ... 67
Простая гісторыя ... 74
Пяшчота ... 90
Рака жыцця ... 93
Складаны дыягназ ... 94
Смешнае і сумнае побач ... 104
Спецыяльны аглядальнік ... 107
Струны рвуцца ... 113
Танцы. Танцы?.. Танцы! ... 120

***Раздзел ІІ. Мроі.***
*Вершы* ... 131

Женщине ... 132
Зухаватая паненка ... 134
К «осеннему» юбилею ... 135

Калыханка ... 136
Мроі ... 138
Снежная мелодия ... 140
На развітанне ... 141
Пах кахання ... 142
Письмо маме ... 144
Спешите обретать детей ... 145
Каханай ... 146

***Раздзел III. Роздумы.***
*Публіцыстыка* ... 147

Всего три шага ... 148
Семейная психология ... 151
Раз-игрушка, два-игрушка ... 154

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**ЛАЗУТА Людміла Паўлаўна**

**ІМГНЕННІ...**

Проза

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Рэдактары: *Вячаслаў Корбут, Інга Вінарская*
Карэктар *Хрысціна Лісічкіна*
Камп'ютарная вёрстка *Інга Вінарская*
Камп'ютарны дызайн: *Дзмітрый Тразкоў, Алесь Перагуд*

Падпісана ў друк 18.12.2014 г. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 13,44.
Ул.-выд. арк. 10,25. Наклад 200 асобн. Замова .

Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства
«Галіяфы».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы і распаўсюджвальніка друкарскіх выданняў
№ 1/48 ад 03.10.2013.
Вул. Брылеўская, 11-44, 220039, г. Мінск.

ООО «Поликрафт».
ЛП № 22330/466 от 21.04.2014.
Вул. Кнорына, 50, 220103, г. Мінск.

*ЛАЗУТА*
*ЛЮДМІЛА*
*ПАЎЛАЎНА*



*нарадзілася ў вёсцы Едначы Гродзенскай вобласці. Сярэднюю школу скончыла ў Слоніме. Пасля заканчэння Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута працавала ўрачом-педыятрам у Воранаве, Слоніме, Гродне, пазней, на працягу дваццаці гадоў – галоўным урачом дзіцячай паліклінікі ў Мінску. Перыядычна размяшчала апавяданні ў часопісах «Здоровье и успех», «Домашний очаг», у газетах «Воскресение», «Вестник БДМУ». Зараз займаецца педагагічнай дзейнасцю, працуе ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце.*

*«У кожнага чалавека здараюцца хвіліны, у якія ён робіць выбар. І здараюцца імгненні, якія самастойна выбіраюць час, каб паўплываць на годнасць гэтага выбару. Наша жыццё – мноства такіх імгненняў…»*

ISBN 978-985-7021-49-9

*Людміла Лазута*

**ІМГНЕННІ...**